View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk

brought to you by CORE

**Таццяна Шамякіна**

# Кітайскі каляндар і славянскі міфалагічны бестыярыум

*паралелі*

KAMUNIKAT.org

МІНСК
РІВШ
2007

УДК 7.046.1
ББК 82.3(0)
Ш 19

Рэкамендавана да друку кафедрай беларускай літаратуры і культуры
Беларускага дзяржаўнага універсітэта (пратакол № 2 ад 10 кастрычніка 2006 года)

Р э ц э н з е н т ы:
*Максімовіч В.А.*, доктар філалагічных навук, в.а. дырэктара Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАН Рэспублікі Беларусь.

*Шаўлякова-Барзенка І.Л.*, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, заг.кафедры журналістыкі УА "Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва".

Шамякіна Т.І. / Шамякіна Т.І. Кітайскі каляндар і славянскі міфалагічны бестыярыум. Паралелі. – Мн.: РСВШ, 2006. - с.

Кніга арыгінальная і па змесце, і па форме. Яна складаецца з 12 нарысаў, аб'яднаных тэмай усходняга, так званага "жывёльнага", календара. Але цікавіць аўтара не столькі кітайскі менталітэт, колькі сувязь культур, стаўленне славян да адпаведных жывёл-сімвалаў, праз ацэнку якіх лепш пазнаюцца еўрапейскія этнасы. Кожны артыкул кнігі ўяўляе сабою культуралагічнае эсэ, насычанае выключна багатай і малавядомай шырокай публіцы інфармацыяй. Пры тым, што ўсе артыкулы чытаюцца надзвычай лёгка, стылёва яны выглядаюць па-рознаму: у адных больш навуковасці, у другіх – філасафічнасці, трэція прасякнуты лёгкім гумарам. Каштоўнасць працы – у выказаных аўтарам шматлікіх гіпотэзах, цікавых дапушчэннях, што тычацца міфалагічнай спадчыны еўрапейскіх і азіяцкіх народаў, у праведзеным тыпалагічным аналізе, у шырокім прыцягненні фактаў з гісторыі літаратуры і мастацтва.

Кніга разлічана на школьнікаў, студэнтаў, выкладчыкаў, на ўсіх, хто цікавіцца міфалогіяй, старажытнай і сучаснай культурай народаў свету.

# ПРАДМОВА

Свет жывёл спрадвек узаемалучыцца са светам людзей і таму на працягу ўсёй гісторыі з’яўляецца аб’ектам нашай пільнай увагі і асэнсавання. Жывёлы нязменна ўваходзілі ў кола чалавечых інтарэсаў, задавальняючы самыя важныя патрэбы чалавека: дапамагалі ў працы, ужываліся ў якасці харчу, выкарыстоўваліся для вырабу адзення, зброі, побытавых рэчаў. Чужыя, далёкія і ў той жа час – блізкія, нярэдка – сябры. Людзі і жывёлы – адзіныя адушаўлёныя істоты (на сёння вядомыя) на Зямлі. Чалавек заўсёды адчуваў сваю глыбінную блізкасць да жывёльнага свету, да ўсіх жывых істот, уключаючы не толькі натуральныя, функцыянальныя сувязі з імі, але і сувязі ўласнай душы, розуму, духу. Недзе ў вытоках жыцця ўсе Божыя стварэнні, у тым ліку, homo sapiens, вельмі блізкія паміж сабою. Наша сувязь – менавіта па вытоку жыцця, па адушаўлёнасці, па агульнасці лёсу на Зямлі.

Чалавек у кантактах з жывёламі, у імкненні зразумець жывых істот урэшце пачынаў лепш разумець і самога сябе. Праз апісанне жывёл (у эпоху Сярэднявечча такое апісанне называлася “*бестыярыум*”) ён псіхалагічна “авалодваў” імі і светам у цэлым.

На працягу апошніх стагоддзяў сувязі чалавека з прыродай, асабліва са звярыным царствам, у значнай ступені паслабелі. Вяртанне да міфалагічнай спадчыны (а ў міфалогіі такога кшталту сувязі адчуваюцца асабліва выразна), магчыма, дапаможа нам, людзям, паглыбіцца ў нетры жыцця, ва ўласную прыроду, знайсці сэнс існавання, убачыць сябе часткаю сусветнага цэлага. Тым больш, што ў XX–XXI стст. былі не толькі страты ў нашых стасунках з жывёльным светам, але і значныя набыткі. Мы пачалі ўсведамляць, што звяры жывуць не толькі інстынктамі. Заслуга рускага фізіёлага Івана Паўлава ў вывучэнні жывёл велізарная, але неабходна мець на ўвазе, што ён рабіў вопыты над істотамі, ад нараджэння вырванымі з натуральнага асяроддзя, якія не назапасілі вопыт выжывання ў прыродзе. І ў такім разе доследы акадэміка не маглі аб’ектыўна распавесці пра іх сапраўдны розум. А розум жывёл часта проста ўражвае – асабліва тых, хто жыве побач з чалавекам. Сёння мы разумеем, што і звяры валодаюць своеасаблівым інтэлектам, а тым больш пачуццямі. Іх пачуцці часам нават больш узвышаныя, чым чалавечыя. І хоць пра жывёльны свет напісаны тысячы кніг, мы яго мала ведаем. Відаць, таму, што глядзім на жывёл з пункту гледжання сваёй чалавечай вялікасці, не спрабуем зразумець іх і забываем

простую рэч: ніколі б чалавек не прыручыў ні адну жывёліну, калі б яна не захацела гэтага сама.

Бяда і ў тым, што дрэнна памятаем уласную чалавечую культуру, бо продкі свае ўяўленні пра жывёл – справядлівыя ці не зусім – адлюстравалі ўсё ж надзвычай шырока, у вялікай колькасці форм: у міфах, мастацтве, заканадаўстве, філасофіі ды навуцы. Змяненне пэўнай (не ўсёй) часткі грамадства свайго стаўлення да жывёл – з практычнага на больш сардэчнае – адбылося якраз у многім дзякуючы мастацтву; асабліва велізарная тут роля мастацкай літаратуры, створанай на працягу апошніх двух стагоддзяў.

Часта жывёлы паўставалі ў якасці алегорый і сімвалаў. Выдатны рускі журналіст і пісьменнік, які ўсё жыццё піша пра жывёл, Васіль Пяскоў нагадвае пра некаторыя з такіх сімвалаў: "Леў – на гярбу Англіі, арол – ЗША, Польшчы, двухгаловы – Расіі. На гярбу Аўстраліі – страус эму, у Новай Зеландыі – бяскрылая птушка ківі, у Танзаніі – жырафа, ва Угандзе – журавель... Бярлін і Яраслаўль – герб мядзведзя, Ніжні Ноўгарад і Растоў – алені. Знакі прыроды на грашах: аўстралійскі долар – эму, у Нарвегіі – лось, дрозд і вавёрка, беларускія "зайцы"... Вобраз прыроды – часта рэкламная знаходка. Напрыклад, марская ракушка – "Шэл", зубр – МАЗ, марожанае – пінгвін, салоны для маладажонаў "курыруе" бусел..." [83, 8.]. Яшчэ больш глыбокім сімвалічным сэнсам валодае так званы "жывёльны" ўсходні каляндар.

Каляндар быў створаны першапачаткова ў Кітаі задоўга да нашай эры, а затым распаўсюдзіўся практычна па ўсёй Усходняй Азіі. У Кітаі, як і ў іншых цывілізацыях старажытнага свету, станаўленне календара было звязана галоўным чынам з земляробчымі патрэбамі. Нават іерогліф "цы", што азначаў "час", графічна выяўляў ідэю вырастання пад сонцам закладзенага ў глебу зерня. Кітайцы здаўна адкрылі экліптыку сонца і дваннацаць задыякальных сузор'яў, якія ўсе насілі назвы жывёл. Імем пэўнай жывёліны называлася не толькі сузор'е, але і год, месяц, пэўны перыяд у сутках. Але самая важная адзінка часу – усё ж год. Цыклы па дванаццаць год кожны – характэрная асаблівасць менавіта ўсходняй культуры. Цыкл пачынаўся з года мышы, канчаўся – свіннёю. Суткі, дарэчы, таксама будаваліся адпаведна і канчаліся знакам свінні. Палова жывёльных знакаў асацыіравалася са светлым, або мужчынскім, пачаткам "ян", другая палова – з цёмным, або жаночым, пачаткам "інь".

Наяўнасць у наш час жывёльнага касмічнага цыклу, усходняга "казачнага" календара, на першы погляд здаецца архаічным і наіўным. На самай справе кітайскі каляндар перадае нейкія важныя рытмы ды вібрацыі Космасу і ўтварае адзіную касмаганічную сістэму,

якая інтэгруе ў сабе ўласна паняцці лінейнага і цыклічнага часоў. У аснове такога кшталту сістэмы – вера ў цыклічнае “разгортванне” ды “згортванне” Сусвету, пра што сведчыць таксама і сучасная фізіка (так званая *сінгулярнасць*). Магчыма, у гэтым – прычына папулярнасці кітайскага календара таксама і на Захадзе, у тым ліку, у апошнія дзесяцігоддзі – на Беларусі.

Наша гаворка пра тую ці іншую жывёлу, што сімвалізуе пэўны год згодна ўсходняга календара, распачата не столькі з-за асаблівай прыхільнасці да Усходу, колькі з-за жадання вярнуцца да вытокаў чалавечай культуры, да першапрычын гісторыі і передумоў свядомасці. Псіхалагічны свет чалавека народжаны з міфа: гэта тая духоўная формула, якая вобразы падсвядомасці пераводзіць на мову практычнага быцця. Каб зразумець душу чалавека, неабходна ведаць міфалогію, тым больш, што міфалагічная свядомасць пануе і сёння (праўда, гэта ўжо іншая міфалогія, але прынцып яе дзейнасці – той самы, што і ў глыбокай старажытнасці). З другога боку, вяртанне да архаічнага жывёльнага календара дазваляе наблізіцца да рэлігійна-сацыяльнай гісторыі чалавецтва. У гісторыі культуры адбілася душа чалавека, племені, нацыі, таму наша задача – сінтэзуючая: злучыць аб’ектыўнае і суб’ектыўнае, праз адну з’яву паспрабаваць паяднаць краіны ды народы.

Распавядаючы пра жывёл – знакі-сімвалы ўсходняга календара, мы не маем на ўвазе кіравацца астралагічнай навукай, тым больш займацца прадказаннямі. Мэта ў нас іншая: сцвердзіць нацыянальны, менавіта *беларускі, погляд на ўсходні каляндар,* знайсці першаасновы – *архетыпы* чалавечай культуры – і адсюль – моманты падабенства ў, здавалася б, далёкіх паміж сабою славянскай і кітайскай цывілізацыях. Усё гэта, можна спадзявацца, будзе працаваць на умацаванне сяброўства паміж нашымі народамі.

Звяртанне да ўсходняга жывёльнага календара – падстава і для таго, каб высветліць вытокі *сімвалізму* некаторых папулярных анімалістычных вобразаў у сусветнай культуры. Сімвал – знак не нашай, прагматычнай, будзённа-шэрай, прыземленай рэальнасці, а іншай – той, што захоўвае былое адзінства ведаў пра Бога, Прыроду і сацыяльнае жыццё людзей.

Цыкл нарысаў пра каляндарны бестыярыум мае на мэце расшыфроўку сэнсаў, што стаяць за пэўнымі вобразамі, і дашукванне прычын шырокага ўжывання тых ці іншых жывёльных персанажаў не толькі ў календары мудрых кітайцаў, але і ў фальклоры, прыгожым пісьменстве, мастацтве іншых народаў. Некаторыя беларускія даследчыкі (А. Бельскі, Л. Бараноўская) сцвердзілі ў айчыннай навуцы

паняцце "мастацкая анімалістыка", якое разглядаецца як пэўная сістэма вобразаў, што мае сваімі вытокамі міфапаэтычнае мысленне. Мастацкая анімалістыка, як і мастацкая дэндралогія, ў значнай ступені пашырае кола сімвалаў культуры і дае магчымасць лепш разумець мастацкую творчасць і законы дзейнасці чалавечай фантазіі. Акрамя таго, вобразы жывёл могуць у значнай ступені ўзбагаціць выкладанне літаратуры ў базавай школе і ВНУ – пашыраюць далягляды мастацтва, вучаць бачыць у жыцці цудоўнае.

Для таго, каб арыентавацца ў кітайскім календары, нагадаем, што найбольш блізкія па часе гады ў канцы ХХ і пачатку ХХІ стагоддзяў мелі ці будуць мець наступныя значэнні:

1995, 2007 – гады свінні
1996, 2008 – гады мышы
1997, 2009 – гады быка
1998, 2010 – гады тыгра
1999, 2011 – гады зайца
2000, 2012 – гады дракона
2001, 2013 – гады змяі
2002, 2014 – гады каня
2003, 2015 – гады авечкі
2004, 2016 – гады малпы
2005, 2017 – гады пеўня
2006, 2018 – гады сабакі

## МЫШ

Згодна традыцыі, цыкл усходняга жывёльнага календара пачынаецца з года мышы. Гэта даволі дзіўна, бо названая жывёлінка – самая маленькая ды нязначная з усіх істот, якія былі ўключаны архаічнымі кітайцамі ў зорны задыяк. Аднак жыхары старажытнага Кітая не раз выяўлялі сваю глыбокую мудрасць у розных сферах жыцця, тым больш у такой важнай, як каляндар, а нам неабходна зразумець, чым яны кіраваліся, пачынаючы касмічны цыкл менавіта з мышы.

Мыш, паводле міфалагічных уяўленняў, – сімвал багацця і дабрабыту, у Кітаі словы "мыш" і "шчасце" абазначаюцца адным і тым іерогліфам "фу". Мыш лічылі настолькі магутнай, што яе імкнуліся ўсяляк задобрыць. Існавала павер'е пра вяселле мышэй. У пэўны перыяд года кітайцы рана клаліся спаць і не запальвалі святло, каб не перашкаджаць мышам гуляць і не ўзбуджаць іх гнеў. У мангольскай юрце, раздзеленай на дванаццаць сектараў адпаведна кітайскага

календарнага цыкла, у сектары мышы знаходзіцца ўсё багацце сям'і, хатні скарб, каштоўная маёмасць. Гэты ж "куток" найбольш і ўпрыгожаны. Вось чаму год мышы – год збірання багацця, у прынцыпе год шчаслівы для чалавецтва, краіны, народа, кожнай сям'і. Стол пад год мышы павінен быць асабліва багаты. Але нагадаем, што ўсходні каляндар – месяцавы, рухомы і зусім не супадае з грыгарыянскім, таму і Новы год прыходзіцца ў кожным цыкле на розныя даты.

Навагодні антураж – рэч цікавая. Але задача даследчыка-міфолага – зазірнуць у першавыток з'явы. І тут – адносна мышы – мы сутыкаемся з даволі вялікімі цяжкасцямі.

На нашу думку, старажытныя людзі заўважылі значэнне мышы ў распаўсюджванні злакаў. Палявая мыш робіць пад зямлёю шматлікія ходы і як бы кладоўкі-каморы, дзе захоўвае прыпасы зерня. Многія з гэтых зярнятак вясною прараслі. Акрамя таго, мышы, як ніхто з млекакормячых, надзвычай хутка размнажаюцца. Так, мыш палявая (жытнік) дае за лета пяць прыплодаў па пяць-шэсць мышанят [127, III, 420].

У старажытнасці людзей было мала, і пладнасць – пладнасць як такая, сімвалам якой стала мыш, – надзычай цанілася. Кітайцы паднялі мыш у Космас, увялі ў каляндар для таго, каб пасадзейнічала і ў багацці, і ў прыбыцці насельніцтва, дала дзяцей. Вось дзе, як нам здаецца, першавыток ушанавання мышы ва ўсходніх народаў. Што ж тычыцца міфалогіі, то тут тлумачэнне значэння мышы наступнае: аднойчы Будда паклікаў да сябе ўсіх жывёл, першы прыбег бык, але на яго загрыўку прымасцілася мыш. Прарок ацаніў яе знаходлівасць, узвысіўшы ў календары.

Персідскія магі менавіта мыш з усіх жывёл у найбольшай ступені аднеслі да рэлігіі. Магчыма, таму, што яшчэ ў самых ранніх міфалагічных сістэмах мыш лічылі народжанай самой зямлёю, таму яе і ўшаноўвалі, як і змяю. У кітайцаў вядомы надзвычай старажытны міф пра птушку і мыш. Абедзве істоты выкапалі ў гары нару, у якой жылі ў поўнай згодзе: птушка на паверхні шукала ежу, а мыш пад зямлёю займалася хатняй гаспадаркай. Яны жылі як добрыя муж ды жонка, у іх нават нарадзілася дачка [64, 77–78].

Міф – заўсёды абагульненне. Прыведзены кітайскі архаічны міф, хутчэй за ўсё, сімвалізуе саюз зямлі і неба. Паколькі мыш народжана зямлёю, яна здольная як бы кандэнсаваць у сабе зямную сілу. Магчыма, таму ў рускай казцы пра рэпку мыш дапамагае зрабіць тое, на што не здатны цэлы калектыў, – выцягнуць агромністую рэпку. А фантастычнай велічыні рэпка – таксама, відаць,

сімвал багацця. Акрамя таго, казка сцвярджае важную філасофскую думку: нават маленькае і нікчэмнае можа прывесці да значных вынікаў.

Цікавасць выклікае і казка пра залатое яечка. Самая, на першы погляд, дзіцячая, прымітыўная казачка аказваецца для разгадвання самай складанай, бо ў аснове яе, хутчэй за ўсё, – касмагонія. Яечка, як мяркуюць многія даследчыкі, уяўляе сабою сонца. Мыш, якая разбівае яечка, у дадзеным выпадку – параджэнне падзем'я, Тартару, апраметнай, інакш кажучы, сілы, сонцу супрацiўнай. Відаць, казка пра залатое яечка была абрадавая і расказвалася напярэдадні калядаў, калі сонца на небе знікала, і людзі баяліся яго канчатковай смерці. Магчыма і іншае тлумачэнне: у шматлікіх міфалогіях разбіванне яечка сімвалізуе працэс стварэнне свету, у якім удзельнічаюць, як і ў кітайскім міфе, птушка (курыца) ды мыш. Але акт першатварэння якраз і адбываўся кожны новы год, падчас калядаў, бо час нашы продкі разумелі як выключна цыклічны.

Дарэчы, першы дзень новага года ва ўсходніх народаў таксама з'яўляецца днём мышы (як і першая гадзіна ў сутках). Сяляне-карэйцы ў гэты святочны дзень паляць на пожнях старую, мінулагоднюю траву, салому, лісце. Лічыцца, што абрад спальвання, які суправаджаецца гульнямі, песнямі, танцамі, знішчае мышэй або праганяе іх [46, 96]. Значыць, і на Усходзе даволі рана адчулі, што мыш не столькі распаўсюджвае, колькі знішчае зерне, таму і занатавалі адпаведны абрад. Уласна, для развітых земляробчых народаў, якія самі займаліся севам, узгадаваннем раслін, першапачатковая мышыная функцыя назапашваць збожжа з'яўлялася ўжо неістотнай, больш за тое, мыш у гэтым плане стала канкурэнтам чалавеку. Але магутная сіла міфалагічна-каляндарнай традыцыі захоўваецца да нашага часу, таму і застаецца мыш на Усходзе сімвалам багацця.

Народы Еўропы бяднейшыя на плошчы пад пасеў, чым народы Азіі, яны ж і вастрэй адчувалі шкоднасць мышы – знішчальніцы ўраджаю. Вось чаму аўтары энцыклапедычнага даведніка "Славянская міфалогія" адназначна ацэньваюць мыш негатыўна, ва ўсялякім разе, факты прыводзяць выключна адмоўнага сэнсу. Але ў такім аўтарытэтным навуковым выданні яўна ігнаруецца казачная традыцыя. Казкі ж, відаць, адлюстроўвалі ранейшыя міфалагічныя ўяўленні, паколькі мыш у іх часта паўстае, на наш сучасны погляд, станоўчым персанажам. Так, у рускай казцы "Ведзьма ды сонцава сястра" мышонак папярэджвае Івана-царэвіча пра небяспеку і выратоўвае ад ведзьмаркі [75, I, 110]. Тое ж у беларускай казцы

“Дзедава дачка ды бабіна дачка ў хатцы на курынай ножцы”, дзе ў жмуркі з мядзведзем замест гераіні гуляе мышка [112, II, 237–243]. У рускай казцы “Баба-яга” мышкі навучылі падчарку, як перыхітрыць пачвару [75, I, 124]. У беларускай казцы “Ох і залатая табакерка” мышка разам з катом ды рыбкаю дапамагае Янку [112, I, 265–269]. Названыя казкі, як нам здаецца, выявілі яшчэ даземляробчую міфалагічную свядомасць, калі мыш шкоднаю не здавалася, наадварот, маленькая і рухавая, выглядала сімпатычна. Эфект тут, відаць, заключаўся ў кантрасце істот вялікіх ды магутных (ведзьма, мядзведзь) і жывёлінкі маленькай, нязначнай, якая, тым не менш, іх абдурвае. Яе перамога давала і чалавеку надзею на перамогу над прыроднымі стыхіямі, над сіламі хаосу. Акрамя таго, такога кшталту старадаўнія казкі маглі быць яшчэ звязанымі і з культам продкаў: мышы – душы памерлых.

У так званы арыйскі перыяд нашай гісторыі пераасэнсоўваюцца шмат якія ранейшыя міфалагічныя персанажы. Мыш застаецца папулярнай дзеючай асобай казак, загадак, замоў, але стаўленне да яе земляробаў-арыйцаў усё больш негатыўнае: на першы план у ацэнцы мышы выходзіць знішчэнне ёю ўраджаю, а таксама сувязь з падзем’ем – іншасветам нячысцікаў і грэшных душ. У беларускай казцы “Верабей і мыш” істоты зноў жывуць разам, як і ў кітайскім паданні, але жывуць ужо не ў згодзе: хітрая мыш абдурвае працяка-вераб’я. Між імі ўзнікае вайна. Урэшце сокал (у міфалогіі ён заўсёды сімвалізуе сонца), пакліканы на дапамогу верабём, перамагае мышынае войска. Як бачым, казка яўна перагукваецца з кітайскім міфам пра сяброўства птушкі і мышы. Але нашы продкі распавядаюць пра, так бы мовіць, вынік суіснавання – вайну паміж птацтвам і звярём, інакш кажучы, вайну Неба і Зямлі, якія звычайна заўсёды знаходзяцца ў гармоніі. Заўважым, што эпізод пра двубой двух біясферных царстваў з’яўляецца не толькі асобным казачным сюжэтам, але і як бы пралогам да некаторых беларускіх казак, тэма якіх з гэтай бітвай абсалютна не звязана. Значыць, пакідаючы ў казачным эпасе такога кшталту матыў, продкі лічылі яго надзвычай важным. Можна думаць, што тут у сімвалічнай форме згадваецца пра касмічную катастрофу.

Нам здаецца, што мыш у нейкі момант развіцця свядомасці індаеўрапейскага субстрату замяніла сабою цмока-змея, персанажа ва ўсіх міфалогіях свету надзвычай распаўсюджанага. Як і чаму адбылася такая трансфармацыя, такое здрабненне вобраза магутнага дракона, сказаць пакуль цяжка. Але, магчыма, менавіта таму ў эпоху

Сярэднявечча мыш – асабліва кажан – стала лічыцца інкарнацыяй д'ябла, а значыць, увасабляць усё ліхое.

Да нашага часу асталася ў шмат якіх народаў прыкмета: масавые перасяленні мышэй і пацукоў – да вайны. Рацыянальна вытлумачыць з'яву не так складана: звычайна міграцыі дробных жывёл адбываюцца ў перыяд сонечнай актыўнасці (раз у адзінаццаць гадоў), якая, верагодна, і ў людзях абуджае агрэсіўнасць. Ва ўсялякім разе, вядомы савецкі геліябіолаг Аляксандр Чыжэўскі, вучань Канстанціна Цыялкоўскага, звязваў з актыўнасцю Сонца шмат якія войны ды рэвалюцыі. Ужо не першы раз навука пацвярджае народную мудрасць.

Назіральнасць нашых продкаў выявілася і ў іншай прыкмеце: калі мышэй багата бывае зімою, дык на лета можна чакаць добры ўраджай. Мышы і пацукі выдатна прадчуваюць кліматычную перспектыву, змены ў надвор'і, і адпаведна гэтаму размнажаюцца. Іх выключная жывучасць і, сапраўды, дзіўная магчымасць прадчування (пацукі пакідаюць карабель, які павінен затануць, мышы астаўляюць дом перад пажарам) таксама садзейнічалі міфалагізацыі. Адсюль незлічоная колькасць прыкмет, забабонаў, парад. Так, нявеста павінна была ехаць на вянчанне не еўшы, каб мышы нічога не пагрызлі ў яе доме [101, 270]. Каго мыш пакусае, таго чакае няшчасце [92, 271]. Калі ў доме заводзіцца шмат мышэй, значыць, яны некага выжываюць – чакаецца смерць ці ад'езд аднаго з членаў сям'і [13, 179].

У прынцыпе такога кшталту прыкметы таксама можна растлумачыць: мышы пераносяць розныя бактэрыі, ад іх сапраўды існавала і існуе рэальная небяспека хвароб. Жудасныя эпідэміі чумы ў сярэднявечнай Еўропе звязваюць якраз з пацукамі: ад іх пачаўся мор, што выкасіў трэцюю частку насельніцтва амаль усіх еўрапейскіх краін. Дарэчы, нямала пасадзейнічала і інквізіцыя, што вешала і паліла кошак, лічачы, што ў іх ператвараюцца ведзьмы. Між тым, у Старажытным Егіпце за тысячагоддзі да эпохі Сярэднявечча кошкі – хутчэй за ўсё дзякуючы іх выдатным якасцям паляўнічых на мышэй – лічыліся свяшчэннымі жывёламі (адсюль пытанні: хто быў разумнейшы – егіпцяне ці інквізітары, ды што такое прагрэс?). Магчыма, менавіта пасля моравай язвы мышэй і пацукоў пачалі суадносіць з д'яблам. У "Фаусце" Ёгана Гётэ пацук выгрызае асаблівую пентаграму на дзвярах, каб адкрыць дарогу Мефістофелю [22, 179].

У духе народных традыцый створана цудоўная калядная казка для дзяцей "Шчаўкунок ды мышыны кароль" нямецкага пісьменніка Эрнста Тэадора Амадэя Гофмана. Адзін з самых выдатных

рамантыкаў свету, Гофман з велізарнай сілай фантазіі выдумляе ўласную міфалогію – з не менш яркімі вобразамі, чым героі антычнай ці народнай славянскай міфалогіі. У празванай казцы, добра вядомай яшчэ і дзякуючы створанаму паводле яе геніяльнаму балету Пятра Чайкоўскага, сілы ліха ды разбурэння ўвасабляе мышыны кароль і яго маці каралева Мышыльда. Казачныя персанажы надзяляюцца тут яркімі, хоць і адмоўнымі, псіхалагічнымі рысамі.

Яшчэ больш выразныя характары ў казцы таксама сусветна вядомага дацкага казачніка Ганса Хрысціяна Андэрсена “Суп з каўбаснай палачкі”. Дзіўны сінтэз гумару ды паэзіі, сатыры ды ідыліі надае выключна своеасаблівы каларыт цікаваму і для дзяцей, і для дарослых твору. У аповедзе кожнай з чатырох мышэй, што адправіліся на пошук рацэпта супа з каўбаснай палачкі, у гранічна скандэнсаваным выглядзе выявіліся розныя погляды на жыццё, розная філасофія, мараль, каштоўнасныя прыярытэты. Без сумнай дыдактыкі, лёгка, іранічна, не пазбягаючы, аднак, квяцістых, маляўнічых апісанняў, знакаміты казачнік дае магчымасць параўнасць паэтычны свет эльфаў з мяшчанскай дурасцю ды абмежаванасцю мышынага царства. З такога ж абывацельскага, сытнага, але пошлага мышына-кратовага кутка вырываецца да святла, сонца і кветак адна з самых абаяльных гераінь Андэрсена – Дзюймовачка.

Такім чынам, лепшыя еўрапейскія пісьменнікі XIX ст., застаючыся ў межах міфалагічнай свядомасці (мыш – насельнік падзем’я, злая, звязана з прыпасамі, багаццем), значна ўзбагацілі фальклорныя традыцыі, надалі здаўна вядомаму персанажу яркія характэрныя рысы, нацыянальную адметнасць, каларыт эпохі. Сапраўды, мышынае царства – яркі сімвал бездухоўнага буржуазнага грамадства, ва ўсялякім разе – абывацельскага існавання. Варта не забываць урокаў народнай творчасці і класічнай літаратуры.

У індустрыяльную эпоху мыш застаецца важным вобразам у розных відах мастацтва, у цэлым культуры. Так, у цэнтральнай Расіі ёсць маленькі горад Мышкін, жыхары якога нядаўна адкрылі музей мышы – адзіны такога кшталту ў свеце, які ўвайшоў у дзесятку самых незвычайных музеяў. Дастаткова назваць і культавага для ЗША анімацыйнага Мікі Маўса. У савецкай дзіцячай літаратуры папулярнымі былі “Казка пра дурнога мышонка” Самуіла Маршака ці кранальная казачка пра мышонка Піка – якраз жытніка – пісьменніка-натураліста Віталя Біянкі. Засталася і гульня “кошкі-мышкі”. Пры “мышку”-маніпулятара пастаянна памятаюць карыстальнікі кампутараў. Звычайна назву прыстасавання, якое

дапамагае хутка бегаць па экрану манітора, тлумачаць асаблівай спрытнасцю нашай гераіні. Але ў абсягу ўсіх міфалагічных уяўленняў, што замацаваліся за мышшу, у бяскрыўднай, здавалася б, назве можна бачыць і асаблівы сімвалічны сэнс...

## БЫК

Бык – адзін з самых складаных вобразаў міфалогіі як з гістарычнага, так і з псіхалагічнага боку. У эзатэрычнай традыцыі бык – татэмная жывёла *гіпербарэйцаў*. Нагадаем, што татэм – гэта жывёльны (радзей раслінны) продак таго ці іншага клана, племені, народа, пазней – як бы сімвалічнае ўвасабленне дадзенага этнаса. Напрыклад, старажытныя рымляне называлі сябе “дзецьмі ваўчыцы”; Беларусь асацыіруецца з зубрам, Расія – з мядзведзем, Аўстралія – з кенгуру. Татэмізм – з’ява ўсясветная, глыбока старажытная і ў той жа час сучасная, характэрная для шмат якіх народаў Афрыкі, Амерыкі, Аўстраліі ды Акеаніі, у аскепках захаваная і ў заходняй культуры (параўнанні чалавека і жывёлы ў фальклоры літаральна ўсіх народаў, некаторыя жанры літаратуры, абрады, дэкаратыўная пластыка і інш.).

Гіпербарэя – таямнічая краіна, вядомая яшчэ з Антычнасці: паводле тагачасных аўтараў, Гіпербарэя – арктычны рэгіён, адкуль прылятае паўночны вецер **Барэй**; таксама і радзіма багіні **Лета** (**Латоны**) – маці **Апалона** ды **Артэміды**; шчаслівы, багаты край, дзе жыхары заўсёды здаровыя і вясёлыя. У апошні час нават навуковая думка – услед за шматлікімі мыслярамі Антычнасці – схіляецца да прызнання вялікай квітнеючай краіны на тэрыторыі сённяшняга Паўночнага Ледавітага акеана – Арктыды. Калі ў XI тысячагоддзі да н. э. адбылася касмічная катастрофа – сутыкненне Зямлі з асцяроідам або перасоўванне кары па яе пластычнаму падсцілу – вось Зямлі змясцілася (планета як бы нахілілася набок), памяняліся магнітныя ды геаграфічныя палюсы, і райская Гіпербарэя пакрылася льдом. Народ, што жыў там, рушыў на поўдзень – як мяркуюць, уздоўж Уральскага хрыбта. Раскапаны нядаўна на паўднёвым Урале надзвычай старажытны горад Аркаім, які ў 2005 г. нават наведваў прэзідэнт РФ Уладзімір Пуцін (з’ява беспрэцэндэнтная ў адносінах да археалагічнага аб’екта), магчыма, быў адной з дванаццаці рэлігійных сталіцаў гіпербарэйцаў пасля зыходу іх з прарадзімы. Прыкладна ў VII–V тыс. да н. э. частка гіпербарэйскага народа пайшла на Алтай, аказаўшы, відаць, уплыў на фарміраванне таксама і кітайскай цывілізацыі; частка ж рушыла ў Індыю; а трэцяя частка, павольна

прасоўваючыся, у IV–III тыс. да н. э. дайшла да тэрыторыі сучаснай Украіны. Рух апошніх, вядомых у навуцы як *ямнікі*, зафіксаваны археолагамі. Перасоўваліся ямнікі на быках, а конь прыручаны пазней – ужо ў стэпах Прычэрнамор'я. Менавіта тут качэўнікі-ямнікі змяшаліся з мясцовым, надзвычай культурным, земляробчым насельніцтвам – *трыпольцамі*, і далі пачатак народу (пазней – сям'і народаў), вядомай пад назвай *індаеўрапейцаў* – нашых продкаў, а таксама продкаў шмат якіх нацый Еўропы ды Азіі.

Прыведзеная гістарычная схема, безумоўна, не прэтэндуе на ісціну ў апошняй інстанцыі і на паўнату (ёсць версія, што частка гіпербарэйцаў адразу пасля катастрофы рушыла на поўнач Заходняй Еўропы), але, паўтараем, да яе схіляецца ўсё больш даследчыкаў. Ва ўсялякім разе, ніхто не аспрэчвае той несумненны факт, што буйная рагатая жывёла была прыручана раней за каня і што першыя качэўнікі, тыя ж ямнікі, рухаліся менавіта на быках. Яшчэ раней старажытныя паляўнічыя Еўропы ды Амерыкі палявалі на зуброў, бізонаў і велізарных быкоў – тураў. Шэдэўры першабытнага жывапісу, якому 40–20 тысяч гадоў, адлюстроўваюць у большасці якраз гэтых жывёл, прычым з вялікім майстэрствам і абсалютным веданнем іх фізіялагічных асаблівасцей і паводзін.

Ужо ў палеаліце, а пазней і ў мезаліце бык, мяркуючы па некаторых наскальных малюнках, увасабляў мужчынскую апладняючую сілу, увогуле творчую сілу космасу. Паколькі ў міфалагічнай свядомасці мужчынскі пачатак – заўсёды неба, а жаночы – зямля, невыпадкова, што бык пачаў сімвалізаваць апладняючае Неба. Вось чаму вобраз быка ў сувязі з вобразам жанчыны – як увасабленні Зямлі – праходзіць літаральна праз тысячагоддзі (!). Гэтая лінія, што працягнулася з неаліту, знайшла адлюстраванне ў антычных міфах пра каханне **Зеўса-быка** да **Еўропы;** пра сувязь **Пасіфаі**, дачкі **Сонца-Геліяса**, з богам **Пасейдонам-быком**, ад якога нарадзіўся **Мінатаўр**. У менш антрапаморфных, чым антычная, культурах, напрыклад, у Індыі, дзе асабліва паважліва ставіліся да жывёл, прапродкамі свету лічыліся бык ды карова. У філасофіі індусаў і сёння названыя жывёлы – актыўны і пасіўны пачаткі існага. Старажытныя шумеры, што стварылі першую цывілізацыю ў Месапатаміі, настолькі шанавалі быка, што пра сваіх багоў гаварылі: "дзікі бык", "гарачы бык", "мужны бык" [9, 310]. У вясельнай паэзіі рускіх жаніха і нявесту называлі быком і кароваю [110, 332].

Увогуле арэал ушанавання быка-Неба ўражвае сваімі абсягамі: уся Азія ды Еўропа. У адным з самых старажытных гарадоў свету,

раскапаным археолагамі ў Малой Азіі, – Чатал-Гуюку (VIII тыс. да н. э.), знойдзены капішчы з выявамі галавы быка.

Рэлігійныя пачуцці выклікаюцца і пастаянна стымулююцца самім існаваннем неба, якое заўсёды над галавою, – далёкае і неабсяжнае. Неба – Абсалют. Аднак свядомасць простага чалавека ва ўсе часы патрабавала больш канкрэтных увасабленняў залішне складанай абстракцыі – Абсалюту, Божаскай Існасці, Сусветнага Розуму. Таму здаўна сімвал і неба, і сонца – звыклы, важны ў гаспадарцы, магутны і прыгожы бык. Яго значэнне асабліва ўзрасло, калі ў выніку астранамічнай з'явы – *прэцэсіі* – кропка веснавога раўнадзенства ў IV тыс. да н. э. увайшла ў задыякальнае сузор'е Цялка і знаходзілася там на працягу 2160 гадоў. Якраз на гэты перыяд прыходзіцца росквіт старажытных цывілізацый Усходу, а ў іх – культ буйной рагатай жывёлы.

У Старажытным Егіпце, дзе побач з надзвычай вытанчаным містыцызмам жрацоў захоўваліся і народныя вераванні, бык **Апіс** увасабляў бога Сонца. Яго культ існаваў ажно да пачатку хрысціянскай эпохі. Пасля смерці чарговага быка жрацы шукалі новага Апіса, прычым ён павінен быў задавальняць пэўнай характарыстыцы: на ілбе – белы трохкутнік, на шыі – пляма ў выглядзе арла, на баку – месяца. Апіс жыў у храме, дзе нават рабіў прароцтвы [73, 46]. Спачатку кожны бык меў сваю асобную пахавальню, але знакаміты фараон Рамсес II у XIII ст. да н. э. загадаў хаваць свяшчэнных істот у агульным некропалі – так званым Серапеуме. У 1851 г. Серапеум знайшлі французскія археолагі. Там муміі быкоў, упрыгожаныя і акуратна забальзамаваныя, ляжалі ў агромністых саркафагах з ружовага граніта. Вышынёй тыя саркафагі былі да 4 м, а важылі 70 тон [118, 11–12].

У Індыі аднаго з найбольш шануемых багоў – **Шыву** – заўсёды суправаджае бык **Нандзі.** Хрысціянская царква бачыць ў Шыве бога-разбуральніка, па сутнасці д'ябла. Аднак насамрэч Шыва знішчае ўсё старое, аджыўшае, у той жа ступені ён – і стваральнік. Амбівалентнасць вобраза індуізм тлумачыць у тым сэнсе, што на самай справе нішто не знішчаецца поўнасцю, а толькі трансфармуецца, пераходзіць з адной форму ў іншую. Бык Нандзі якраз падкрэслівае стваральную сілу Шывы і сам увасабляе мужчынскі апладняючы пачатак. У Індыі часта можна бачыць велізарныя скульптуры быка каля храмаў Шывы [6, 64].

Культы Апіса і Нандзі – вышэйшае, найбольш шыкоўнае ўшанаванне канкрэтнай жывёліны, якая азначала божаскую існасць. Культ быка выявіўся і ў дэкаратыўных рэчах, і ў архітэктурных

элементах, бо архітэктура на старажытным Усходзе лічылася галоўным з відаў мастацтва. Так, на свяшчэннай браме багіні **Іштар** у Вавілоне (а гэтая брама – шэдэўр сусветнага мастацтва) захаваліся шматлікія выявы быкоў. Уваход у рэлігійную сталіцу Персідскай імперыі горад Персепаль, разбураны Александрам Македонскім, сцераглі каласальныя чалавека-быкі і крылатыя быкі [68, 67]. На Каўказе тысячагоддзямі выкарыстоўвалі амулеты з выявамі бычыных галоў. У Старажытнай Грэцыі на сцянах дамоў вывешвалі чарапы быкоў, якія ўрэшце, высечаныя з каменя, ператварыліся ў архітэктурна-дэкаратыўную дэталь – букранію (капітэль калоны ў выглядзе двух бычыных галоў) [24, 52]. Ва ўсіх народаў Азіі і Міжземнамор'я галовы быкоў упрыгожвалі посуд, мэблю, зброю, калоны. Бадай, ні адзін жывёльны вобраз не сустракаецца ў мастацтве так часта.

Вялікая група даследчыкаў з розных краін, напрыклад, А. Крап, А. Галан, звязваюць культ быка не з сонцам, а з месяцам – на той падставе, што яго рогі падобныя да серпіка месяца. У сувязі з семантыкай самога быка рогі пачалі азначаць мужнасць. У Пярэдняй Азіі не толькі багі, а і некаторыя цары адлюстраваны з рагамі. Геніяльны скульптар эпохі Адраджэння Мікельанджала зрабіў скульптуру прарока Маісея менавіта з рагамі. Рагатымі былі шлемы ў ваяроў некаторых народаў, напрыклад, у германцаў. Нават жаночыя галаўныя ўборы яшчэ ў XIX ст. у Іране, Расіі, Беларусі мелі рожкі. Праўда, мы звязваем падобныя ўпрыгожанні хутчэй з магіяй (а на самай справе – з фізікай), чым непасрэдна з міфалагічнымі ўяўленнямі, бо такога кшталту форма галаўнога ўбору – добры рассейваючы контур, які "здымае" дрэнныя энергіі, нізкія частоты выпраменьванняў, шкодныя для чалавека. Безумоўна, гіпотэза патрабуе пэўных навуковых доказаў.

На нашу думку, бык – усё ж сонцавы сімвал, ва ўсялякім разе, у індаеўрапейцаў. Іспанскі даследчык сімвалізму Х.Э. Керлат прапануе альтэрнатыўны варыянт: бык адпавядае пераходнай зоне паміж стыхіямі Агню і Вады, ён, магчыма, сімвалізуе сувязь паміж Небам і Зямлёю [53, 103]. Кампрамісная тэорыя Керлата яднае сімвалізм міфаў і рацыянальнае стаўленне продкаў да практычнага выкарыстання быкоў ды кароў. Быкі шырока выкарыстоўваліся ў земляробстве па ўсёй Еўропе і Азіі, акрамя таго, нашы продкі заўсёды спажывалі ялавічыну, у якой шмат жалеза, а таксама пілі малако. Натуральна, што дзякуючы такой ежы індаеўрапейцы, якіх сёння ўсё часцей называюць *арыйцамі*, былі магутнымі, дужымі, высокімі людзьмі. Вось чаму менавіта яны заваявалі агромністую тэрыторыю –

фактычна паўсвета, ва ўсіх рэгіёнах раствараючы ў сабе мясцовы этнічны элемент, – як правіла, намнога драбнейшы целам.

Арыйцы-беларусы дзікага быка называлі “турам”. Навукоўцы-біёлагі адзначаюць: “Першабытны бык тур – вымерлая млекакормячая жывёла... Продак еўрапейскай свойскай буйнай рагатай жывёлы... Да пачатку XVII ст. трапляўся ў Белавежскай пушчы, у лясах Панямоння і Прыбужжа. У прыродных умовах апошні першабытны бык быў забіты ў 1627 годзе...” [127, IV, 176–177]. “Тур”, безумоўна, надзвычай старажытнае індаеўрапейскае слова, якое шырока выкарыстоўваецца ў анамастыцы. У старажытных германцаў вярхоўны бог Тор якраз і азначаў “бык” і меў выгляд волата з рагамі. У беларусаў адзін з найбольш старажытных гарадоў – Тураў, у італьянцаў – Турын; у Францыі ёсць вобласць Турэнь, у Аўстрыі – Цюрынгія. Нельга не згадаць назву цэлай краіны – Турцыі, этнасу – цюркаў. Акрамя таго, у беларусаў – Туравейскае возера, рэчка Тураўлянка, вёска Турасы. Можна прывесці літаральна сотні геаграфічных назваў, а таксама этнонімаў у Еўразіі, звязаных з турам.

Другая назва тура – “бык” – мела і форму “бук”. У цюркаў таксама ёсць “бука” (бык), што гаворыць пра вялікую старажытнасць слова, паколькі сустракаецца і ў індаеўрапейскіх, і ў цюркскіх мовах. Магутнае дрэва “бук” расце ў шмат якіх краінах, і ў Беларусі ёсць рэчка Буг, але такі ж гідронім сустракаецца ў іншых месцах Еўропы.

Ва Украіне быка называюць “вол”. Гэты корань уваходзіць і у слова “буйвал” (у беларусаў – “бавол” [76, 11]). Першая частка слова “буйвал” таксама мае пэўны сэнс: у грэчаскай мове “bu” – “велізарны”, “падобны да быка”, у старажытнаславянскай мове “буй” – “мужны”, у беларускай мове “буйны” – “вялікі”, “бугай” – “бык”. Акрамя таго, у беларусаў **Буган** – дух-апекун свойскай жывёлы (Пінскі, Слуцкі раёны). У “Слове пра паход Ігаравы” адзін з герояў твора, брат Ігара, – Усевалад – характарызуецца як “буй-тур”. Магчыма, адсюль паходзіць імя Баян, беларускае “баяць” (“буй-бай”) і, можа быць, нават “бацька”. Наяўнасць вялікай колькасці сінонімаў для абазначэння быка (а яшчэ ж – “зубр”) гаворыць пра бясспрэчную старажытнасць культу быка ў беларусаў, увогуле, у арыйцаў.

З глыбокай старажытнасці паходзіць і іншы корань у мове – “go” – “гавяда”: пад такой назвай славяне разумелі быкоў і кароў. Але ў санкскрыце слова “go” азначала таксама і “неба”, і “сонечныя промні”, і “вочы”, і “зямлю”. Для арыйцаў свойская жывёла – галоўнае багацце. Карова і сёння ў Індыі – свяшчэнная істота. Але галоўнае не гэта, а тое, што адно слова сапраўды злучае зямное і нябеснае, азначае як практычна-матэрыяльнае, так і узвышана-паэтычнае. У

старажытным помніку арыяў Ведах гаворыцца: “Ранішняя зорка выганяе на світанку сваіх белых кароў” [5, 157], пад якімі разумеліся воблакі. Такія параўнанні маглі ўзнікнуць толькі ў асяродку пастушацкіх плямёнаў – арыяў, якія, прасоўваючыся ў розных напрамках па Еўразіі, гналі перад сабою тысячныя статкі быкоў ды кароў. З *касты* пастухоў у арыйцаў пазней, калі яны аселі ў Індыі ды Іране, сфарміраваліся кулінары (забой, прыгатаванне ежы), рамеснікі (вырабы са скуры, косці), з цягам часу – купцы, нарэшце – тэхнічная інтэлігенцыя. Гэтая вышэйшая каста (саслоўе) *вайшаў*, якая дала столькі прафесій, існуе ў Індыі і сёння. Больш за тое, пастухі – яны ж і магі. Уласна слова “пас-тух” знакаміты рускі паэт Сяргей Ясенін паэтычна тлумачыў як “пас дух”. “У старажытнасці, – пісаў ён, – ніхто не распараджаўся часам так свабодна, як пастухі. Яны былі першыя філосафы ды паэты, пра што гаворыць Біблія і апокрыфы іншых рэлігій. Уся язычніцкая вера ў перасяленне душ, музыка, песня... – усё вынікае з празрыстых пастушацкіх думак...” [39, 169].

Вярхоўныя жрацы, магі персаў, халдзеяў, этрускаў, славянскія вешчуны варажылі па костках свойскай жывёлы. Прадказанні рабіліся на аснове назіранняў за небам, на падставе снабачанняў, таксама ў значнай ступені і па паводзінах жывёл ды птушак. Нараджэнне знакамітага персідскага прарока Зараастра яшчэ за тры стагоддзі да падзеі прадказаў свяшчэнны бык, які раптам загаварыў чалавечым голасам. Выпадак, безумоўна, унікальны, выключны, але гаворка ж ішла пра будучага заснавальніка першай (менавіта так!) з сусветных рэлігій – *зараастрызму*.

Натуральна, што ўсе народы, якія разводзілі свойскую жывёлу, ушаноўвалі яе не толькі ў міфалогіі, магіі, касмагоніі, але і ў абрадах. На Далёкім Усходзе, дзе, уласна, і захаваўся да сёння жывёльны каляндар, здаўна самы ганаровы прыз пераможцам у спартыўных спаборніцтвах – бык. На Новы год у Карэі рабіліся драўляныя скульптуркі быкоў, якія выстаўляліся каля дарог. Такія бычкі – пажаданне будучага ўраджайнага года [47, 157]. Маленні пра ўраджай вясною суправаджаліся тэатралізаванымі прадстаўленнямі, дзе ўдзельнікі выступалі у масках быкоў ды кароў [47, 124]. Урачыстыя шэсці з быком практыкавалі і ў Кітаі [47, 103].

Выключным багаццем рытуалаў вызначаўся культ быка на востраве Крыт у II тыс. да н. э., калі там квітнела высокаразвітая і ў многім надзвычай таямнічая цывілізацыя, – як гавораць сёння, – цывілізацыя нашчадкаў атлантаў. Тут на кожным кроку выявы быка ці яго рогі, – як бы напамін пра вялікі цыкл міфаў, звязаны з **Зеўсам-быком**, **Еўропай**, іх сынам – царом Крыта **Мінасам**, чалавека-быком

**Мінатаўрам**, што жыў у Лабірынце... Магчыма, перамога **Тэсея** над Мінатаўрам сімвалізуе пераход кропкі веснавога раўнадзенства з сузор'я Цялка ў сузор'е Авена. Тым не менш, і пасля гэтай, выключна важнай касмічнай падзеі, культ быка ў Міжземнамор'і, у арыйцаў, у Егіпце і ў Азіі аставаўся. І невыпадкова: бык найлепш увасабляў зямную стваральную энергію. Нездарма на Крыце, які лічыўся "пупом Зямлі", нарадзіўся менавіта Зеўс і яго быкападобныя нашчадкі. Зеўс як вярхоўны бог у найбольшай ступені ўвасабляе цэнтр Сусвету, той пункт, у якім сыходзяцца ўсе супярэчнасці, ён – дух, заручаны з матэрыяй. Тое ж і Мінітаўр. Ён сімвалізуе надзвычай архаічную культуру, у якой духоўнае аб'ядноўвалася з жывёльным і набывала сакральны характар. Сёння міфолагі ды псіхааналітыкі тлумачаць Лабірынт як месца, дзе юнакі і дзяўчаты праходзілі ініцыяцыю (у міфе іх прыносілі Мінатаўру ў ахвяру). Паводле неаплатонікаў, лабірынт – грэхападзенне. Адпаведна выхад з яго, які ўдаўся Тэсею з дапамогай закаханай у яго **Арыядны**, – вяртанне да духоўных каштоўнасцей. Сапраўды, падарунак Арыядны – клубок нітак – сімвал магутнай сілы кахання [6, 157].

На фрэсках раскапанага старажытнага Лабірынта – Кноскага палаца на Крыце – мноства малюнкаў, дзе адлюстраваны нейкія надзвычай небяспечныя гульні, акрабатычныя практыкаванні маладых людзей з быком. Відаць, гэта ўваходзіла ў абрад ініцыяцыі. Хоць аднachасова не выключала і ахвярапрынашэння. Вядомая сучасная англійская пісьменніца Мэры Рэнс у рамане "Тэсей" піша: "Здаралася, што бык стамляўся раней, чым забіваў каго-небудзь... Тады казалі, што бог задаволены і на гэты раз не хоча ахвяры. У выніку самыя спрытныя і лоўкія юнакі жылі даўжэй і вучылі свайму майстэрству астатніх... Проста ўхіліцца ад рагоў – ужо было нецікава, неабходна было зрабіць з гэтага грацыёзны танец і ніколі не паказаць свайго страху, а гуляць з быком так, быццам ты яго любіш... Моладзь Крыта ішла на арэну з-за любові да мастацтва, а таксама каб ушанаваць бога і заваяваць сабе славу" [89, 164]. *Карыда* ў Іспаніі і ў Лацінскай Амерыцы, відаць, амаль не змяніла прыёмы і рухі з таго далёкага часу.

Няхай і не ў такім распрацаваным (але адначасова і небяспечным) выглядзе, падобныя гульні, ідовішчы з быком, з каровамі існавалі ў шмат якіх краінах Еўропы. На Карпатах распаўсюджаны гульні пад назвай "туры". У чэхаў 1 мая – свята кароў. У Швейцарыі падрыхтоўка да пад'ёму на альпаж суправаджаецца дэманстрацыяй кароў і іх паядынкам за права быць

“каралевай” статку. Карову-пераможцу ўпрыгожваюць, і яна ўрачыста вядзе статак у горы [33, 72].

Але і ў беларусаў было падобнае (хоць і без боек кароў), надзвычай важнае свята – “запасванне гаўяда”, першы выган свойскай жывёлы вясною на пашу. Яно суправаджалася шмат якімі рытуаламі. Напрыклад, пераганялі жывёлу праз агонь, каб асвяціць і захаваць ад “нячыстай сілы”; аблівалі вадою; перакідвалі цераз статак камяні; паганялі асвечанай вербнай галінкай; шапталі замовы. Звычайна “запасванне” жывёлы прымяркоўвалася да свята Юр’я – святога апекуна жывёл [38, 182–187]. На Юр’я ж наладжвалі і гульню пастухоў, якая на самай справе была не чым іншым, як абрадавай магіяй [66, 99].

Летам на Ільін дзень (2 жніўня) па ўсім усходнееўрапейскім рэгіёне прыносілі ў ахвяру быка, якога да таго кармілі ўсёй грамадою і так жа калектыўна з’ядалі. Нашы продкі лічылі, што ахвярны бык, абавязкова “чырвонага колеру”, забяспечвае (праз прарока Ілью) яснае надвор’е ў час сенакосу і ўборкі ўраджаю [100, I, 273]. Прарок Ілья прыняў на сябе, як вядома, функцыі ранейшага бога Неба, бога-грымотніка.

“Хатняя ферма, колькасць жывёлы на сялянскім панадворку здаўна былі своеасаблівай мерай багацця. І кожны, наколькі мог, імкнуўся, каб пашырыць сваю жывёлагадоўчую гаспадарку. Гэта і зразумела: жывёла і птушка былі апорай сялянскай сям’і. У свой час гэтыя маленькія фермы не толькі кармілі краіну, але нямала давалі і для экспарту. Нават у савецкі час, калі з’явіліся буйныя калектыўныя гаспадаркі, дамашняя жывёлагадоўля працягвала актыўна папаўняць харчовы фонд. Але, на жаль, гэта жыццёва важная крыніца пачала прыкметна вычэрпвацца” [128, 366]. І ўсё роўна ў менталіцеце беларусаў трывала замацавана: карова – апірышча сялянскай гаспадаркі, ад яе і малако, і гной, і прыплод, і мяса. Акадэмік Іван Паўлаў назваў малако цудоўным харчам, прыгатаваным самою прыродай. Можна сказаць, што на гэтай бялюткай вадкасці ўзгадавана ўся белая раса. У Ведах – важнейшым рэлігійным помніку арыйцаў – Млечны шлях не што іншае, як малако, што разлілі **Нябесныя Каровы**. А ў нашых казках вырай заўсёды ўяўляўся з малочнымі рэкамі.

З каровамі звязаны шмат якія рытуалы ды павер’і. Так, лічылася, што ведзьмаркі па начах выдойваюць кароў у суседзяў. Існавалі рытуалы, звязаныя з адгонам персаніфікаванай “каровінай смерці”, з ацёлам. Слова “карова” блізкае да слова “каравай”, а

каравайны абрад – адзін з важнейшых у беларускім вяселлі. Ён зноў-такі звязаны з уяўленнямі пра багацце, дабрабыт і пладнасць.

Міфапаэтычны воблік каровы набліжаецца да вобразаў першапродкаў, якія клапоцяцца пра жывых. Тут найбольш яркі прыклад – беларускія, рускія, украінскія казкі пра карову, якая дапамагала сіротцы выконваць розныя хатнія работы, загаданыя мачахай. Па сутнасці памерлая маці астаўляе замест сябе карову. У беларускай казцы "Пра быка і яго сяброў" цяжка разглядзіць міфалагічную аснову, але яна ёсць. Бык пужаецца туману і бяжыць на край свету, дзе будуе сабе дом [8, 40–45]. У яго ўцёках можна бачыць знікненне сонца ў зімовы перыяд – сюжэт, аналагічны казцы "Фініст – ясны сокал". Не менш характэрная казка "З рога ўсяго многа". Сапраўды, дзякуючы рогу можна атрымаць літаральна ўсё.

Такім чынам, казкі вярнулі нас да таго, з чаго мы пачалі: бык (карова) быў у арыйцаў татэмнай жывёлай. Культ яго з'яўляецца той першаасновай, на якой ўзраслі найбагацейшыя культуры белай і жоўтай расы.

## ТЫГР

1998 год і ў будучым 2010 год знаходзяцца пад знакам самай усходняй з усіх жывёл усходняга календара – тыгра.

Тыгр – жывёла, безумоўна, не нашага рэгіёну і нават не блізкіх да нас суседзяў. І тым не менш няма, бадай, беларуса, які б не бачыў тыгра ці, ва ўсялякім выпадку, не ўяўляў яго. І пачуцці ён выклікае складаныя, бо, сапраўды, жывёла – выключна цікавая і ў многім супярэчлівая.

Паглядзім спачатку, што гавораць біёлагі, знаўцы тыгрынай прыроды. Паляўнічыя называюць яго джальтменам. Тыгр высакародны тым, што перад атакай рыкам папярэджвае будучую ахвяру. Леапард жа і рысь кідаюцца моўчкі і звычайна ззаду ці зверху. Тыгр рэдка спажывае падлу (пантэра ў гэтым сэнсе не такая разборлівая). Тыгр акуратны: і ў логаве ў яго чыста, суха, і вантробы са здабычы звычайна не есць, выцягне іх і адняе ў бок. Аставіўшы дзічыну да наступнага дня, амаль заўсёды прыкрые яе веццем ад мух, вос, шакалаў. Часам хавае яе ў ваду. Ваду любіць, як ўсе кошкі: многа п'е, добра і ахвотна плавае. Вялікія рэкі, напрыклад, Ганг тыгры пераплываюць без цяжкасці [1, 207].

Аднак павага, пашана да тыгра яму не дапамаглі. Ён знішчаны амаль паўсюдна. Рэдкі ў Індыі, Кітаі, Іране, Бірме. На Каўказе апошняга тыгра забілі ў 1932 г. У Сярэдняй Азіі іх ацалела няшмат. У

Прыморскім ды Хабараўскім краі жыве, як мяркуюць вучоныя, каля 200 тыграў, хоць вылічыць цяжка. Усурыйскі тыгр, што водзіцца ў названых рэгіёнах, і самы вялікі з усіх.

Быў час, калі тыгры сустракаліся нават на поўначы Сібіры – да Якуцка даходзілі. А дзесяткі тысяч гадоў таму жылі на Навасібірскіх астравах (архіпелаг паміж морам Лапцевых і Усходне-Сібірскім): там знайшлі косткі старажытных тыграў, якія мала адрозніваліся ад сучасных. Нічога дзіўнага: шмат ужо назапашана звестак пра тое, што да ўсепланетнай катастрофы за Паўночным кругам быў зусім іншы клімат і жылі людзі – нашы продкі-праарыйцы, што стварылі цудоўную краіну – Гіпербарэю.

Бадзяецца тыгр днём і ноччу: абсяг яго уладаранняў вялікі – сотні квадратных кіламетраў. Ён ідзе па джунглях ці па Усурыйскім лесе, і, заўважыўшы яго, птушкі, алені, малпы крычаць трывожна, са страхам. У яго вялікім целе, павольным і паважным, 300 кг. [1, 209]. У ім дзікая сіла і напружаная палкасць. Нездарма нават чалавек, яшчэ не ўбачыўшы тыгра, не чакаючы яго з'яўлення, адчувае асаблівую, дзіўную трывогу. Магчыма, эмоцыі звера па нейкім невядомым пакуль фізічным полі перадаюцца і чалавеку.

Страх і павага – асноўныя пачуцці, якія выклікае тыгр. Пачуўшы яго рык, і звяры, і людзі літаральна трымцяць. Здаецца, тыгра цяжка любіць. Але прафесійныя дрэсіроўшчыкі гавораць інакш: “Тыгры не праяўляюць так бурна сваю радасць, як сабакі. Іх пачуцці стрыманыя. Але яны здольныя доўга памятаць, паважаць і любіць чалавека” [104, 64]. Таму, хоць з імі і надзвычай цяжка, але ўсё ж цікава працаваць у цырку. У савецкі час на ўсю краіну праславіўся тыгр Пурш, якога выхавала Маргарыта Назарава. Гэта быў выключна разумны і паслухмяны звер, поўнасцю адданы дрэсіроўшчыцы. Менавіта ён іграў галоўныя ролі ў любімых і сёння гледачамі кінастужках “Утаймавальніца тыграў” і “Паласаты рэйс”.

Тыгр – жывёла, безумоўна, царская, і справядліва заняў сваё месца на небе ў зорным задыяку. На Усходзе яго і называюць царом звяроў і бясспрэчным гаспадарам лесу. У Індыі тыгра лічаць амаль такім жа разумным, як і слон, а слана ставяць па інтэлекту вышэй за чалавека (!) У Кітаі ён – не толькі цар звяроў, але і пагроза для нячысцікаў. Знакамітыя вешчуны, што выступаюць супраць злых духаў, як правіла, едуць верхам на тыгры. Вось чаму ў Кітаі, Японіі, Карэі тыгр – важнейшы з вобразаў жывапісу і дэкаратыўнага мастацтва. На ўсім Далёкім Усходзе, на Амуры яго літаральна абагаўляюць. Успомнім: мясцовы паляўнічы Дэрсу Узала з вядомай кнігі, названай яго імем, рускага пісьменніка-натураліста Уладзіміра

Арсеньева бязмежна, фанатычна, так, што гэта нам цяжка і ўявіць, паважаў тыгра, лічачы яго ва ўсім вышэйшай істотай. Праўда, у іншым папулярным творы – казцы “Маўглі” англійскага класіка Рэд’ярда Кіплінга – тыгр Шэр-Хан – адмоўны персанаж. Але тут мы маем справу з поглядам на жывёлу заходняга чалавека (а пісьменнік Р. Кіплінг – заходнік ва ўсім, хоць і любіў Усход), да таго ж прадстаўніка той нацыі, якая найперш і адказная за знішчэнне тыграў у Індыі. Галоўная забава англійскіх каланіяльных чыноўнікаў ды афіцэраў – паляванне на тыграў. У выніку жывёлы амаль поўнасцю зніклі. Сённяшні ўрад Індыі ажыццяўляе маштабны дзяржаўны праект “Тыгр”, у выніку якога колькасць тыграў у Індыі ўжо павялічылася да 3000 (у пачатку XX ст. – да амаль поўнага вынішчэння – было 50000).

Абагаўленне тыгра зрабіла яго не толькі персанажам Задыяку, але і аб’ектам ушанавання ў абрадах, героем шмат якіх паданняў, міфаў ды казак. Асаблівыя абрады звязваліся з уяўленнямі пра агромністую жыццёвую сілу тыгра. Вось чаму жанчыны ў Сярэдняй Азіі, што прагнулі мець дзяцей, елі мяса тыгра, скакалі праз яго шкуру, ушаноўвалі яго сляды [71, II, 511–512].

Легенды пра пярэваратняў – значная частка фальклору ўсіх народаў свету. Прычым у Еўропе ў асноўным складалі былічкі пра ваўка, у Азіі – амаль выключна пра тыгра. Ад шлюбу тыгра і жанчыны паходзяць тут, згодна паданням, шмат якія плямёны. Гэта, безумоўна, татэмная жывёла.

Вобраз тыгра на Усходзе іграе тую ж ролю, што і леў у афрыканскай ды еўрапейскай культурах. Заўважым, што многія багі і міфалагічныя героі былі апрануты ў шкуры льва, тыгра ці леапарда. Такая шкура – атрыбут бога **Дыяніса**, волатаў **Геракла**, **Самсона**, героя **Тарыэла** з класічнай грузінскай паэмы “Віцязь у тыгравай шкуры”. Праўда, сам Тарыэл тлумачыў сваю вопратку тым, што яго каханая прыгажосцю была падобная да тыгрыцы: у яе гонар ён і пашыў плашч са шкуры тыгра. На самай справе, адзенне-шкура тут – важны сімвалічны знак нейкіх вышэйшых магчымасцей: адбываецца перанос са звера на чалавека якасцей звера. У міфалагічных персанажаў такімі якасцямі лічыліся магічныя здольнасці і неверагодная фізічная сіла. У літаратурнага героя, якім з’яўляецца Тарыэл, усё ж больш важны фактар – эстэтычны: шкуру ён носіць і як напамін пра каханую, і для ўласнай прыгажосці [93]. Хоць, магчыма, дзейнічае тут і спрадвечны архетып, выяўлены ў героя падсвядома: паколькі такая шкура – сведчанне вышэйшых магчымасцей чалавека, значыць, можна чакаць поспеху ў каханні, у пошуку любімай

дзяўчыны. Нездарма ўсё ж назва твора, культавага для грузінаў, акцэнтуе ўвагу на гэтай прыкмеце.

Ва ўсходніх казках тыгр паўстае па псіхалагічных характарыстыках розным, як, урэшце, і ў славянаў воўк. У беларускіх казках воўк часта дурны, хоць у рэальным жыцці чалавек, хоць і баяўся, але бязмерна паважаў звера. Тыгра таксама баяліся, але ў фальклоры азіятаў страх не асабліва і адчуваецца. У казках народаў Інданэзіі і Малайзіі існуе цыкл пра прыгоды маленькага мышынага аленьчыка канчыля. Яго можна параўнаць з нашым зайцам. Дык вось, гэты маленькі, слабенькі канчыль – дзякуючы свайму розуму ды хітрасці – пастаянна абдурвае тыгра. Напрыклад, аднойчы, выратоўваючыся ад тыгра, ён сеў на кольцы ўдава, які спаў пасля абеду, а тыгру сказаў, што ён сцеражэ пояс прарока Сулеймана. Тыгру вельмі захацелася абкруціцца "поясам Сулеймана". Калі ён гэта зрабіў, удаў прачнуўся і пачаў душыць тыгра – той ледзь вызваліўся. А канчыль, натуральна, збег. Другі раз тыгр пажадаў паіграць на дудачцы, якою яго зноў-такі спакушаў канчыль. У выніку бамбук прышчаміў тыгру язык – і зноў канчыль выратаваўся [18, 19–24]. Тут тыгр выклікае ўсмешку – трошкі пагардлівую, але і паблажлівую. Яго нават шкада, як і нашага ваўка ў мультыплікацыйным серыяле "Ну, пачакай!" Акрамя таго, міжволі паважаеш дапытлівасць тыгра, яго імкненне самому ўсё спазнаць і паспрабаваць.

У кітайскай казцы "Пра дурнога тыгра" апошняга ўжо абдурвае чалавек, што маладому зверу напачатку здаўся слабенькай, кволенькай істотай, з якой справіцца вельмі лёгка (хоць разумны стары бацька і папярэджваў сына, каб не меў справу з чалавекам) [55, 46–49]. Уласна, тут выкрываецца не столькі глупства, колькі агрэсіўнасць, эгаізм, правы моцнага над слабым. Тое ж, што і ў нашых казках пра ваўка.

Беларускі даследчык І. Крук піша, што "дамінуючай функцыяй казак пра жывёл, відаць, была дыдактычна-пазнавальная" [62, 21]. Казкі распавядаліся падчас абраду ініцыяцыі і павінны былі ўнушаць падлеткам, што не толькі сілу неабходна развіваць, але і розум, – выключна на сілу спадзявацца нельга. Былі, аднак, і казкі для дарослых, і праводзілі яны больш шырокія і больш па-філасофску заглыбленыя аналогіі. Для прыкладу возьмем выдатнейшы твор сусветнай літаратуры "Панчатантру" – зборнік прыпавесцяў і казак, напісаных на санскрыце ў пачатку нашай эры ў Індыі. Кніга ўжо ў раннім Сярэднявеччы выключна шырока распаўсюдзілася на Усходзе і Захадзе. Менавіта яе можна разглядаць як аснову сюжэтаў каласальнай колькасці еўрапейскіх баек ды навел. "Панчатантра"

таксама мела дыдактычны характар. Асноўная мэта яе – навучыць разумным і маральным паводзінам. У адной з прыпавесцяў бедны брахман (маецца на ўвазе прыналежнасць да вышэйшай касты брахманаў) у лесе на дне засохлаха калодзежу знайшоў упаўшых туды тыгра, малпу, змяю і чалавека. Жывёлы папрасілі брахмана выцягнуць іх, матывуючы просьбу высакародным маральным пастулатам: выратаваць жывую істоту – значная заслуга. Калі брахман выцягнуў жывёл, яны абяцалі яму ва ўсім дапамагаць, але адначасова выказалі просьбу не вызваляць чалавека: яму нельга давяраць. Брахман усё ж выцягнуў нябогу, які аказаўся ювелірам. У далейшым жывёлы, сапраўды, часта дапамагалі брахману, а ювелір здрадзіў яму, асудзіўшы на смерць [82, 91–95]. У прыведзеным творы тыгр выступае надзвычай разумнай істотай і верным, добрым сябрам, які сваімі развагамі сцвярджае ідэю, што шкадаванне ды самаахвярнасць надаюць сэнс жыццю, а няўдзячнасць з'яўляецца самым страшным з грахоў.

Аналагам тыгра ў славянскіх казках з'яўляецца леў. Леў нязменна ва ўсіх творах называецца "над усімі звярамі царом". Але менавіта ў беларускіх казках леў з-за непрыстасаванасці да жыцця ў нязвыклых умовах, з-за няведання навакольнага асяроддзя вымушаны быў пакінуць нашу краіну. Факт цікавы. Ён сведчыць пра тое, што продкі беларусаў – арыйцы – раней жылі ў іншых прыродных умовах, але клімат на іх радзіме кардынальна змяніўся. Усё ж яны захавалі памяць пра жывёльнага цара іх родных мясцін.

Увогуле ў арыйцаў заўсёды была прыхільнасць да вялікіх кошак. Больш за тое, магчыма, нават імя "русы", якое ўвайшло ў этнонім "беларусы", раней гучала як "рысі", "рысічы", бо народ выводзіў сваё паходжанне ад рысі. Рысічы ў II тыс. да н. э. прыйшлі ў Індыю, дзе ўжо не рысь, а тыгра зрабілі сваёй нацыянальнай жывёлай. Ускосным доказам нашай тэорыі з'яўляецца тое, што ў старажытных этрускаў (таксама корань "рус") важнейшай міфалагічнай, а значыць, ранейшай татэмнай жывёлай быў леапард. Нагадаем, што этрускі разам з лацінамі – асноўны субстрат італійскага (рымскага) этнаса. Гэта, безумоўна, арыйскі народ, які прыйшоў у Італію або з Малой Азіі, дзе ў II тыс. да н. э. квітнела магутная індаеўрапейская Хецкая дзяржава, або з Прыдняпроўя, як сцвярджаюць сучасныя ўкраінскія даследчыкі. Этрускі пакінулі выключна багатую мастацкую спадчыну, і на шмат якіх рэчах іх побыту ды культу паўстае леапард [77, 176–177].

Дарэчы, іншы найбольш папулярны вобраз этрускага мастацтва – дэльфін. У сувязі з гэтым нагадаем, што 1998 год – згодна

ужо календару зараастрыйцаў, календару "Авесты" (самай галоўнай арыйскай свяшчэннай кнігі), – быў годам дэльфіна. Дэльфін – сімвал пазнання таямніц, дапамогі, выратавання, падарожжаў, добрых думак. Год звязаны з панаваннем розуму, устанаўленнем міру, са звяртаннем да вышэйшых каштоўнасцей, з выратаваннем душы. Тыгр жа – усё ж сіла, жорсткасць, уладарнасць, значыць, можна было чакаць паўстанняў, тэрарызму, войнаў, катаклізмаў. Час паказаў, што перамог усё ж тыгр, а не дэльфін.

Такая пастаноўка праблемы – гэта, безумоўна, жарт. У 1998 г. было ўсё – свет выключна ўскладніўся. Але супярэчнасці свету мала тычацца жывёл, якія прайшлі праз усю чалавечую культуру, якіх мы і сёння любім. Яны не вінаватыя ў тым, шо людзі неразумныя ды няўдзячныя, як ў той глыбокай прыпавесці з "Панчатантры". Тыгр назаўсёды астанецца для нас царом звяроў, увасабленнем высакародства, велічы, прыгажосці, дзіўным злучэннем моцы, сілы і – вытанчанасці, гнуткасці. Наша звяртанне да жывёл Задыяку мае на мэце яшчэ і яшчэ раз паказаць бясконцую разнастайнасць і прыгажосць зямной прыроды, дзіўныя суадносіны прыроды і культуры, своеасаблівае пераасэнсаванне прыродных з'яў у фантазіі розных народаў, розных пакаленняў людзей. Жывёлы Задыяку – добрая падстава, каб нагадаць чалавеку пра яго найбагацейшую культурную спадчыну.

## ЗАЯЦ І КОТ

Велізарнае кола жыцця – Задыяк – такое ж старажытнае паняцце, як уласна чалавечая культура. У відавочна-літаральнай і патаемнай сімволіцы задыякальнага кола адлюстравана ўся старажытная касмагонія з яе ўяўленнямі пра пачатак і канец Сусвету, пра Залаты век, змену эпох і шмат што іншае. Дыяментавы зорны пояс – той выток містычнага пачуцця, які суправаджаў чалавецтва на працягу тысячагоддзяў.

1999 і ў будучым 2011 год – год зайца згодна кітайскага календара і год ката паводле індакітайскага.

Выбар зайца для задыякальнага сузор'я і адпаведна – года – можа выклікаць здзіўленне сваёй як бы (на першы погляд) міфалагічнай нецікавасцю, ледзь не прымітыўнасцю. Аднак у гэтым, відаць, і заключана разгадка з'яўлення такой жывёлінкі ў календары. У егіпецкіх іерогліфах стылізаваная выява зайца азначала проста паняцце "істота". Відаць, сакралізаванасць звязана з яго шырокай распаўсюджанасцю. Сапраўды, як сцвярджаюць біёлагі, зайцы

сустракаюцца на ўсіх кантынентах Зямлі, акрамя Антарктыды [34, VII, 165–180].

Індзейцы Паўночнай Амерыкі лічылі Вялікага Зайца жывёлінай-дэміургам, інакш кажучы, стваральнікам свету. У казках жыхароў еўразійскай і амерыканскай тундры заяц – адзін з цэнтральных персанажаў. У амерыканскім жывёльным эпасе пра братка-труса ён паўстае хітруганам, жартаўніком, вясёлым, дасціпным разумнікам, здольным прадбачыць будучае. А ў чукоцкай казцы “Хто сонца знойдзе?” за сонцам, выкрадзеным пачварамі, гурт звяроў пасылае менавіта зайца як самага хуткага на нагу і адважнага. І заяц выканаў ускладзеную на яго задачу: выкраў з падзем’я сонца, паслаў яго на неба, ды яшчэ з кавалка яго ўтварыў месяц [88, 71–76]. Казка, бясспрэчна, захавала старажытны касмаганічны міф, шырока распаўсюджаны ў Азіі і Амерыцы.

Кітайцы і амерыканскія абарыгены прама звязвалі зайца з Месяцам. Сярэднявечная эзатэрычная еўрапейская традыцыя таксама лічыла зайца атрыбутам усіх божышчаў Месяца і пасрэднікам паміж людзьмі і багамі Поўні. З біялагічнымі асаблівасцямі жывёліны гэта, хутчэй за ўсё, мала звязана, хіба што маецца на ўвазе белы колер беляка. Сапраўды, заяц усюды сімвалізуе святло (адсюль і сонечны водбліск ад люстэрка назвалі “сонечным зайчыкам”). У германцаў багіні Поўні заўсёды з’яўляліся ў суправаджэнні зайцоў, якія неслі ў лапках светачы. Факт з’яўлення зайца на Месяцы тлумачыць буддысцкая міфалогія. Аднойчы, калі Будда быў галодны, заяц прапанаваў сябе ў якасці ежы і сам скокнуў у агонь. За такое самаахвяраванне Будда і адправіў яго на Месяц. Адпаведна ў Кітаі з зайцам звязана ўсё тое, што і з Поўняй: жаночая сіла “інь”, жонка імператара, доўгажыццё і шмат што іншае. Сюжэтам многіх твораў жывапісу і рэльефнай скульптуры ў краінах кітайскага ўплыву з’яўляецца заяц з таўкачыкам і ступкаю, дзе ён таўчэ эліксір несмяротнасці [63, 96].

У сувязі з тэмай несмяротнасці, матывам жыцця-смерці адразу ўзнікае асацыяцыя са смерцю **Кашчэя** ва ўсходнеславянскіх казках. Месцазнаходжанне яго смерці (менавіта так!) суаднесена з важнейшай мадэллю Сусвету – Касмічным Яечкам. Ахоўваюць яго прадстаўнікі ўсіх прыродных стыхіяў: вада (акіян), зямля (востраў), расліна (дуб), жывёла (заяц), птушка (качка). Такім чынам, як і ў егіпецкай міфалогіі, заяц тут увасабляе фактычна ўсіх жывёл – “істоту” як такую.

Знакаміты спецыяліст па славянскаму язычніцтву, рускі акадэмік Б. Рыбакоў піша: “У славянскім фальклоры заяц займае

асаблівае месца. Заяц табуяваны; яго нельга ўжываць у якасці ежы; калі заяц перабяжыць дарогу, неабходна вярнуцца. Зайца нельга згадваць, плывучы па вадзе, бо вадзянік усчыніць буру і г.д. У Іпацьеўскім летапісе ёсць паведамленне пра літоўскага заячага бога Дыверыкзе... Заяц разумеўся славянамі ды літоўцамі як прадстаўнік нядобрага пачатку, што і тлумачыць яго ролю ў казках – заяц ахоўвае Кашчэя, яго смерць” [94, 334].

Такога кшталту стаўленне да зайцоў мы тлумачым уплывам на славянскую міфалогію семіцкай міфалогіі, у якой заяц, як і свіння, – нячыстая жывёла. Вядома, што радзімічы – продкі пэўнай часткі беларусаў – у IX–X ст. выплочвалі даніну Хазарскаму каганату, дзе дзяржаўнай рэлігіяй быў іудаізм і адкуль магла прыйсці на нашу зямлю ідэя негатыўнасці зайца.

У сваю чаргу, яўрэі адмовілі зайцу ў станоўчай сутнасці, магчыма, у процівагу сакральным каштоўнасцям пераважнай большасці насельніцтва Хазарскага каганата – цюркаў, паколькі вядома, што ў цюркскіх народаў заяц – такое ж увасабленне жывёльнага царства зямлі, як лягушка – падзем’я, а сава – неба, інакш кажучы, гэта глыбокі этнічны сімвал.

З другога боку, у нашых славянскіх казках, уласна кажучы, нідзе не акцэнтуецца ўвага на адмоўных якасцях зайца. Больш за тое, заяц у некаторых варыянтах чарадзейных казак пра Кашчэеву смерць нават дапамагае герою: напачатку мядзведзь як самы магутны у жывёльным свеце нашых лясоў выварочвае дуб; з куфэрка, размешчанага на дубе, выскоквае заключаны там заяц, але яго даганяе некалі выратаваны Іванам іншы заяц (хутчэй за ўсё, яго татэмны продак) і разрывае кашчэевага зайца. З таго вылятае качка, а яе ўжо, у сваю чаргу, даганяе арол. З разарванай качкі яечка падае ў мора, а дастае яго шчупак. Тут ўсё ясна, акрамя аднаго: у апазіцыі розныя стыхіі прадстаўляюць розныя істоты, і толькі зайца даганяе заяц жа, даючы падставу гаварыць пра амбівалентнасць нашага героя. Ці можа быць, не было ва ўяўленнях старажытных славян жывёлы больш хуткай на нагу, чым заяц? Сапраўды, у сярэднявечнай Еўропе заяц робіцца алегорыяй хуткасці і вернай службы. “На многіх гатычных пахавальнях ён паўстае менавіта ў такім кантэксце” [53, 205]. Хоць можа быць і іншае тлумачэнне. Уявім, што ўвесь казачны эпізод з кашчэевай смерцю сімвалізуе нейкія касмічныя працэсы (магчыма, катастрафічныя) і аб’екты. Заяц з глыбокай старажытнасці ўвасабляе Месяц. Два зайцы – два месяцы на небе, але адзін раздзяляецца на часткі (узрываецца – ?) і гіне.

Чаму ж усё-такі ў народзе грэбліва ставяцца да зайца (як і да рыбы сама) і ў некаторых рэгіёнах не ядуць яго? На гэты конт нідзе ў навуковай літаратуры тлумачэнняў няма, ды і ўвогуле пра зайца гаворыцца надзвычай мала. Адну з магчымых версій мы прывялі: уплыў яўрэйскага народа, з якім беларусы доўга жывуць побач. Другая версія – таксама наша ўласнае тлумачэнне: казкі пра жывёл склаліся намнога раней, чым чарадзейныя казкі, і вось тады заяц, як і многія іншыя звяры, быў татэмам. Магчыма, шматлікія казкі пра мядзведзя, ваўка, лісу, зайца перадаюць не сапраўдныя якасці гэтых жывёл як біялагічных істот (воўк, напрыклад, зусім не дурны, як у шмат якіх казках, а надзвычай разумны звер), а характарыстыкі тых плямён, родаў, сем'яў, якіх яны татэмістычна персаніфікуюць. Возьмем вядомую ўсходнеславянскую казку "Заяц, певень і ліса". Тут у зайца была лубяная хацінка, а ў лісы ледзяная. Вясною хацінка лісы растаяла, і яна заняла зайцаву, яго ж самога выгнала, і ніхто з магутных звяроў не змог яму дапамагчы – толькі певень [75, I, 26–27]. Тут, як нам здаецца, гаворка ідзе пра барацьбу розных плямёнаў, прычым ліса ўвасабляе фіна-угорскі этнас, заяц – той неалітычны народ, які жыў на еўрапейскай тэрыторыі да прыходу індаеўрапейцаў, певень жа – тыповы арыец. Сказанае здаецца жартам і, сапраўды, напалову жарт, але, з другога боку, інакш не растлумачыш казачную спецыфіку, псіхалогію міфалагічных персанажаў. І ў беларускіх казках, насуперак тэзісу Б. Рыбакова, заяц выклікае шкадаванне, а зусім не адмоўную рэакцыю. Гэта таму, што ён увасабляе этнас, паглынуты іншым, больш пасіянарным, этнасам. Але табу на харчаванне татэмнай жывёлай засталося.

А вось у Польшчы захавалася, відаць, надзвычай старажытнае паданне пра Мацёрых Зайцоў у сакольскіх лясах, якія не паддаваліся нікому і самі палохалі паляўнічых, валодаючы магіяй, уменнем ператварацца ў розныя іншыя істоты [85, 298–300]. Падобнага кшталту легенда магла скласціся менавіта ў час актыўнага заваявання індаеўрапейцамі Еўропы, дзе яны сустрэлі моцнае супрацьдзеянне з боку мясцовых плямёнаў.

У Заходняй Еўропе стаўленне да зайца таксама надзвычай своеасаблівае. У сярэднявечным бестыярыуме (алегарычным звярынцы) зайцу адведзена не самае ганаровае, але вельмі прыкметнае месца. Калі мядзведзь падобны да чалавека фізіялагічна, дык заяц хутчэй псіхалагічна.

У сярэднявечным мастацтве ўвасоблены негатыўныя, грахоўныя рысы зайца – палахлівасць, залішняя сексуальнасць (таму трус – сімвал часопіса "Плейбой"). А вось у сялянскім фальклоры

плоднасць зайца ўспрымалася выключна станоўча і ў вясельным абрадзе ўвасабляла будучы дабрабыт і шчасце новай сям'і. Шырока выкарыстоўваліся выявы зайца як сімвала адраджэння і ў велікоднай абраднасці. Стравы з зайца любяць французы.

Падобна матыльку і птушцы вобраз зайца ў Еўропе часта разумеўся як сімвал чалавечай душы. Ён замяшчае чалавека, яго мітуслівую душу, якая як бы пастаянна некуды імкнецца – бяжыць. На нашу думку, тут трохі іншае: парадаксальна злучаючы грахі і станоўчыя якасці, заяц у традыцыі робіцца сімвалам не столькі душы, колькі чалавека як такога, разам з яго грахоўным целам, – слабога, беспрытульнага.

Менавіта ў такім ракурсе можна разглядаць вобраз зайца ў заходняй літаратуры Новага часу: у "Алісе ў краіне цудаў" Луіса Кэрала заяц вечна спяшаецца і вечна спазняецца, а амерыканскі пісьменнік XX ст. Джон Апдайк прама называе свайго героя, звычайнага абывацеля, трусом (раман "Трус, бяжы!"), які паэтапна пазнае жыццёвую мудрасць.

Адно з лепшых увасабленняў зайца ў жывапісе – геніяльная гравюра знакамітага нямецкага мастака эпохі Адраджэння Альбрэхта Дзюрэра "Заяц". Дзюрэр дасягае тут надзвычай глыбокага пранікнення ў прыроду свайго аб'екту, надаючы яму рысы сімвалічна-містычныя – якраз тыя, пра якія мы згадвалі.

Зноў вяртаючыся да мастацкай літаратуры, у прыватнасці дзіцячай, успомнім паэму "Дзядуля Мазай і зайцы" Мікалая Някрасава, "Скаргі зайца" Канстанціна Ушынскага, "Алёнушкіны казкі" Дзмітрыя Маміна-Сібірака, п'есу-казку Сяргея Міхалкова "Зайка-хвалько", апавяданні-казкі Віталя Біянкі. У вершы "Блытаніна" Карнея Чукоўскага толькі адзін заяц – на фоне агульнага бязладдзя – астаўся самім сабою, захаваў сваю сутнасць, не прэтэндуючы іграць іншыя ролі. У беларускай літаратуры Змітрок Бядуля выбірае менавіта Зайца ў якасці апавядальніка сваёй вядомай казкі "Сярэбраная табакерка".

Як бачым, міфалагічнае напаўненне вобраза аказалася настолькі глыбокім, што і ў сучаснай літаратуры заяц сустракаецца ў асноўным у літаратурных казках і ў творах міфалагічнага напрамку.

У нашым сучасным жыцці "зайцы" – не толькі безбілетныя пасажыры ў транспарце. Невыпадкова карыстаецца народнай любоўю выключна таленавіты мультыплікацыйны серыял савецкага часу "Ну, пачакай!" Архетыпова заяц – як бы кожны з нас, і яго дасціпны выхад з любой складанай сітуацыі, паказанай у кінастужцы, безумоўна, усяляе аптымізм.

Яшчэ больш амбівалентны персанаж – кот, але яго наўрад ці можна атаясамліваць з чалавекам – залішне гэта складаная індывідуальнасць (хоць вучоныя сцвярджаюць, што генетычна чалавек больш блізкі да ката, чым да малпы). І калі заяц ва ўяўленнях амерыканцаў – звычайны абывацель, хоць і са сваёй спецыфічнай мудрасцю, дык кот, бясспрэчна, арыстакрат жывёльнага свету.

Вучоныя-біёлагі амаль адзінадушныя ў думцы, што кот – апошні з прыручаных свойскіх жывёл. У старажытных арыйскіх Ведах нічога не гаворацца пра ката, значыць, у II тыс. да н. э., калі арыйцы (ірана-славяна-балцка-кельцка-германскі субстрат) выйшлі на міжнародную арэну, кот яшчэ хатнім не быў. Больш за тое, нават антычныя аўтары не згадваюць пра яго – і гэта ў той час, калі ў суседнім Егіпце літаральна панаваў культ кошкі!

У Егіпце ёй былі прысвечаны шыкоўныя храмы, ёй служылі свае жрацы і вялікае кола вернікаў. Памерлых кошак бальзамавалі і хавалі на спецыяльных могілках. У XIX ст. археолагі знайшлі тут (каля горада Бені-Хасам) некропаль, на якім было пахавана 180000 кошак, прычым кожная ў асобным саркафагу. У выглядзе кошкі егіпцяне ўшаноўвалі багіню радасці, вяселля, Поўні і плоднасці **Баст**. Кошка-Баст была роднай сястрою самога бога Сонца **Ра**. У “Кнізе памерлых” нават вярхоўны Ра названы Вялікім Катом. У такім разе, робіцца зразумелым, што аб’ядноўвае зайца і ката як міфалагічных істот: абодва дэміургі – творцы свету (Ра менавіта дэміург), абодва звязаныя з Поўняй і надзвычай плодныя.

Культ кошкі ў Егіпце, сапраўды, уражвае. Яна лічылася добрым духам дома, яе любоўна бераглі. Падчас пажару найперш выратоўвалі кошку, а потым ўжо маёмасць. Смерць кошкі ў доме лічылася вялікім няшчасцем. А забойства кошкі, нават не наўмыснае, каралася смерцю.

Ішлі стагоддзі. Ужо тады, калі знікла старажытнаегіпецкая цывілізацыя і на змену ёй прыйшла арабская, кошка захоўвала сваё прывілігіраванае становішча. Ды нават сам прарок Магамет любіў кошак. А адзін з султанаў Егіпта – знакаміты Бейбарс (XIII ст.), якога параўнoвалі з Цэзарам па смеласці і з Неронам па жорсткасці, так любіў кошак, што завяшчаў для іх у ваколіцах Каіра велізарны сад і значныя сродкі на ўтрыманне [31, 41–45]. У Егіпце кошак шануюць да нашага часу, лічыцца, што ў іх усяляецца добры дух, які прыносіць шчасце.

Са Старажытнага Егіпта кошак нельга было вывозіць пад страхам смерці. Таму ў іншых краінах яны з’явіліся даволі позна. Але, мы лічым, не толькі Егіпет быў цэнтрам адамашвання кошкі.

Магчыма, тое ж адбылося на паўднёвым усходзе Азіі, таму і год быў адзначаны знакам кошкі.

У Еўропу кошка трапіла ў I ст. н. э. – упершыню пра яе згадаў грэчаскі гісторык Плутарх [31, 46–47]. Ужо ў V ст. катоў можна бачыць у роспісах посуду і рэльефах на манетах. Магчыма, распаўсюджанню кошкі ў яе асноўнай функцыі паляўнічай на мышэй перашкаджалі супернікі – вужы і ласкі, якія прыручаліся і жылі ў дамах антычнага Рыма. На Палессі вужы і сёння пасяляюцца пад падлогамі дамоў. А на знакамітай карціне Леанарда да Вінчы "Пані з гарнастаем", якою так ганарацца ў Польшчы (яна знаходзіцца ў Кракаве), паказана менавіта ласка, а не дзікі гарнастай. Але ўсё ж кошка як свойская жывёла ўпарта выцясняла іншых істот.

У шмат якіх краінах Еўропы таксама, як і ў Егіпце, кошак лічылі свяшчэннымі жывёламі. У нас нездарма ў новы дом спачатку ўпускаюць кошку – яна павінна забяспечыць дабрабыт і захаваць ад смерці членаў сям'і: як бы бярэ небяспеку на сябе. Па паводзінах кошкі ў вёсках гадалі: мыецца – да прыходу гасцей, царапае падлогу – да мяцеліцы ці дажджу, хавае пад сябе галаву – да марозу і г. д. У германцаў кошка была прысвечана багіні кахання **Фрэйі**, і дзяўчаты перад замуствам падкормлівалі кошак рознымі ласункамі. Ва ўсёй Еўропе кошкам прыпісвалі магічныя лячэбныя ўласцівасці, пра што сёння сведчыць і навука. Я памятаю час, калі ў вёсках літаральна ў кожным доме жыла кошка. А ў гарадах іх гадуюць сёння ўжо часта і для паказу, для ўдзелу ў выстаўках. У 2006 г. першае месца ў свеце па прыгажосці заваяваў менавіта беларускі кот.

Але наколькі кот шанаваўся ў народзе, настолькі ён выклікаў гнеў рэлігійных фанатыкаў. "Паляванне на ведзьмаў" у Еўропе (а распачата яно было не Царквою, а, як не дзіўна, універсітэтамі) суправаджалася і праследваннем усяго, што было звязана з язычніцтвам (паколькі яно ўпарта не здавалася), асабліва чорных катоў, у обліках якіх пачалі бачыць самога чорта. Акрамя таго, кошка абагаўлялася на Усходзе, а ўсё, што ішло адтуль, лічылася нячыстым, ерэтычным і шкодным. А кот не без падстаў выклікаў сумненні: меў чорную поўсць і бліскучыя вочы, блукаў па начах, хадзіў нячутна... Кошак пачалі спальваць, закопваць жывымі ў зямлю, тапіць. Толькі ў Брытаніі да іх ставіліся прыхільна.

У народнай культуры беларусаў таксама захаваліся негатыўныя прыкметы, звязаныя з чорнымі кошкамі: яны як быццам жылі разам з вядзьмаркамі і маглі ў апошніх ператварацца (як у "Віі" Мікалая Гогаля), а калі перабягалі дарогу – гэта лічылася да няўдачы. Але ў нас

кошак не знішчалі. І ўвогуле стаўленне да іх было больш прыязнае, любоўнае, хоць у прыказках адзначана дастаткова негатыўных рыс.

Казкі ж згадваюць пра ката-баюна, які ходзіць па слупу, абкручанаму залатым ланцугом, распавядае казкі, палохае і нават знішчае народ [5, I, 156]. Аляксандр Пушкін памяшчае “ката вучонага” на дубе, які, бясспрэчна, як і залаты слуп, сімвалізуе Прадрэва – Вось Свету. А значыць, і ў рускага паэта кот-баюн – дэміург. Але кот-казачнік – істота больш таямнічая, чым здаецца. Кот – блізкі родзіч рысі, а рысь, на нашу думку, татэмны продак некаторых славянскіх плямёнаў. Больш за тое, як ужо адзначалася, этнонім-назва “русы”, магчыма, паходзіць ад “рысы”.

Узнікаюць і іншыя думкі, звязаныя з незвычайным вобразам **ката-баюна**, які здаецца намнога больш старажытным, чым з’явіліся рэальныя кошкі на нашай тэрыторыі (прыкладна ў VIII ст.). Баюн так расказвае-спявае свае казкі, што як бы наркатызуе слухачоў, уводзіць іх у сон. Гэтым ён падобны да магутнага шамана: з дапамогай нейкіх своеасаблівых гукавых комплексаў гіпнатызуе народ. Часам людзі нават гінуць – калі інфармацыя ідзе на нізкіх частотах, як вядома, шкодных для чалавека. Гэткі ж эфект у **Салаўя-разбойніка**, які выкарыстоўвае свіст. Цікавым выглядае і падабенства слоў: Буян (райскі востраў у фальклоры) – Баян (знакаміты пясняр) – Баюн (чароўны кот, што замбіруе людзей).

У народных казках чалавек здольны ператварыцца ў ката. Такім героем з’яўляецца Іван Папялоў з беларускай казкі. Некаторыя казкі гавораць пра Івана-Кошкіна сына або Ката Катовіча, брата Івана Царэвіча. Прычым Іван Папялоў – пераможца пачвараў, значыць, тыповы змеяборца. Адсюль вынікае, што кот мае дачыненне да асноўнага індаеўрапейскага міфа касмаганічнага цыклу – пра змеяборства: барацьбы сонца з цемрай, лета з зімою, дабра з ліхам і пад. У іншых традыцыях, напрыклад, літоўскай, чорны кот – сам супрацiўнік бога-грымотніка **Пяркунаса** [27, 382]. Гэта яшчэ раз гаворыць пра дваістую сутнасць персанажа і бясспрэчную важнасць яго ў міфалогіі.

У казках кот палохае ўсю грамаду лясных звяроў, а таксама выратоўвае слабых істот ад драпежнікаў, напрыклад, пеўня ад лісы. Надзвычай папулярную ўсходнеславянскую казку “Кот, певень і ліса” можна разглядаць і ў гістарычным плане (як барацьбу плямёнаў), і ў касмаганічным, дзе Певень – сімвал сонца, Ліса – агню (ці каметы, ці навальнічнай хмары), Кот – Месяца. Але астралагічна растлумачыць іх адносіны мы пакуль не адважваемся.

У міфалогіі важнае значэнне меў колер персанажаў. І калі чорны кот увасабляў чорта, і яго, сапраўды, баяліся, то залацістарудны быў звязаны з сонцам (заяц таксама сімвалізаваў святло, хоць і не прамое, а адлюстраванае ад сонца). У адной з найбольш характэрных беларускіх казак – “Каток – залаты лабок” – кот жыве на дубе (сімвал Сусветнага Дрэва) і мае як залатыя, так і сярэбраныя атрыбуты, што ўказвае на яго сувязь і з Сонцам, і з Месяцам (успомнім Баст у Егіпце: яна сімвалізуе Поўню, але прама звязана і з Сонцам як яго сястра). Кот Максім у беларускай казцы і кот у ботах з “Казак братоў Грым” сваім розумам і хітрасцю ўсяго дасягаюць для сваіх лянівых і дурнаватых гаспадароў, робячы з іх багатых і шчаслівых людзей.

Кот, бясспрэчна, архетыпова звязаны з дабрабытам, з утульнасцю дома. Часам яго мяшчанска-эгаістычная прырода нават перабольшваецца, як у рамане “Жыццёвыя погляды ката Мура” Эрнста Тэадора Амадэя Гофмана, знакамітага нямецкага рамантыка. У іншых выпадках ён увасабляе мудрасць, як Чэшырскі кот у Луіса Кэрала.

Каб зразумець характар ката, вернемся да яго біялагічнай сутнасці. Кот, у адрозненне ад ваўка-сабакі, не жыў у статку, не меў важака, гэты звер – індывідуаліст. Натуральна, што ў моцна іерархічным грамадстве (напрыклад, кітайскім) кот успрымаўся негатыўна. І ўсё ж кот-эгаіст прыйшоў да чалавека, пачаў жыць з ім, служыць яму. Як і чаму гэта адбылося, мы не ведаем, хоць і ёсць на гэты конт філасофская казка Рэд’ярда Кіплінга “Кошка, якая гуляла сама па сабе”. Кошка – ганарлівы, незалежны, своеасаблівы звер, але яна, безумоўна, прывязваецца да гаспадароў, да месца. Вядомыя выпадкі, калі кошкі праходзілі сотні кіламетраў і вярталіся дадому. Гэта жывёла разумная, адважная і надзвычай арганізаваная. Яна, як не дзіўна, лёгка прыручаецца, дрэсіруецца – успомнім кошкін цырк Юрыя Куклачова. Зафіксавана нямала выпадкаў, калі каты абаранялі дзяцей ад ядавітых змеяў. Дзеці, як правіла, вельмі любяць кошак. Таму жывёлінка часта сустракаецца і ў дзіцячай літаратуры. Напрыклад, усе палюбілі ката Матроскіна з кнігі Эдуарда Успенскага. Або ката Леапольда з мультыплыкацыйнай стужкі. Карыстаецца папулярнасцю і амерыканскі анімацыйны фільм “Том і Джэры”.

Усё ж галоўны подзвіг кошкі – абарона чалавечых паселішчаў ад мышэй і пацукоў. Магчыма, гэта і было асноўнай прычынай шырокага распаўсюджання іх па Еўропе. Праўда, у апошні час каты губляюць паляўнічы інстынкт, але ўжо адна толькі іх прысутнасць у доме палохае грызуноў. Прафесары і студэнты Парыжскай Сарбоны

за барацьбу з мышамі паставілі перад універсітэтам помнік кату. А ў Японіі ёсць храм кошак. І ўсё ж сапраўднае значэнне гэтых жывёл пакуль не ацэнена чалавецтвам.

## ДРАКОН

Дракон – адзіны не рэальны, а міфалагічны персанаж ва ўсходнім задыяку. Праўда, істота сустракаецца ў міфах такой вялікай колькасці народаў, што вучоныя не без падстаў лічаць, што драконы некалі жылі на зямлі. Некаторыя бачаць іх прататыпамі дыназаўраў, хоць апошнія вымерлі як быццам задоўга да з'яўлення чалавека (65 мільёнаў год таму). Але не ўсё так проста ў гэтым пытанні.

Паколькі асноўваемся мы на кітайскім календары, то і пачынаем з Кітая. Тут ні адзін Новы год не абыходзіцца без упрыгожаных каляровымі лямпачкамі макетаў, скульптур, жывапісных малюнкаў, што ўвасабляюць велічных і, на думку мясцовых жыхароў, надзвычай прыгожых драконаў. Гэты персанаж – цэнтральны ў кітайскай культуры. Старажытная "Кніга гор і мора" – асноўная крыніца звестак пра міфалогію Кітая – згадвае пра каласальнага дракона з тварам чалавека, што раскінуўся на ўвесь свет. Уласна ён і ёсць першапачатковы Свет. Калі дракон заплюшчвае вочы, апускаецца ноч, калі адкрывае – надыходзіць дзень. Калі ён дзьмухае, то наганяюцца воблакі і ідзе снег, дыхне – сонца пачынае паліць і вяртаецца лета [64, 31]. Гэты фантастычны дракон **Чжулунь** мае многія рысы першатворцы свету. І ўсё ж Зямлю і Неба стварылі іншыя – зноў-такі змеепадобныя істоты – брат і сястра **Фусі** і **Нюйва**. Фусі ўмеў падымацца па дрэву, якое расло ў цэнтры свету, на Неба, а Нюйва са жвіру выляпіла першых людзей. У цэлым дракон як істота гібрыдная выступае ў Кітаі стваральнікам і асновай літаральна ўсіх важнейшых прыродных працэсаў і з'яў. Буйнейшы кітайскі даследчык-міфолаг ХХ ст. Юань Кэ не тлумачыць прычыны гэтага, не разглядае генезіс вобраза. А нас сёння ўжо не можа задаволіць простае апісанне фактаў міфалогіі, няхай і надзвычай займальных.

Пакуль што звернемся да тых самых фактаў. Дракон як першатворца з касмаганічнай істоты ў далейшым трансфармаваўся ў духа продка. Продкі ў выглядзе драконаў "у Кітаі лічацца не монстрамі, а добрымі божышчамі, якія ўпраўляюць дажджом і рusламі рэчак" [116, 46]. І хоць магутныя рэкі Хуанхэ, Янцзы, Сіцзян, на берагах якіх сфарміравалася кітайская цывілізацыя, адрозніваюцца зменлівым, непрадказальным норавам, тым не менш дракон – іх ўвасабленне ў Кітаі – выключна станоўчая (у адрозненне

ад Еўропы) істота, абаронца краіны і ахоўнік кожнага рода як першапродак яго. У сувязі з гэтым адзначым, што на нашым Палессі ажно да XX ст. дамавік (вобраз якога сінтэтычны: ён адначасова і першапродак, і дух ачага) выступаў у выглядзе вужа [101, 169], інакш кажучы, змеепадобнай істоты, якою з'яўляецца і дракон. Што ж тычыцца воднай стыхіі, то нагадаем, што "на тэрыторыі Палесся... адна з рэчак, прыток Прыпяці, называецца Вужа" [78, 37]. А другі прыток Прыпяці – Гарынь, – раку, што вызначаецца асабліва "інтэнсіўным разводдзем" [127, I, 570] у параўнанні з іншымі рэчкамі Беларусі, – можна суаднесці з імем папулярнага казачнага міфічнага персанажа – **Змеем Гарынавічам**.

У Кітаі вобраз дракона перацярпеў найбольш трансфармацый. І ўсё ж асноўнае значэнне вобраза, якое выступае ў выглядзе ланцужка сэнсаў (маланка – дождж – вясёлка – рака – урадлівасць), захавалася практычна ва ўсіх абрадах і ў выяўленчым мастацтве.

Кітайскі міфалагічны дракон складаецца з прыкмет дзевяці рэальных жывёл: вярблюда, аленя, зайца, быка, ігуаны, лягушкі, карпа, тыгра і арла. Уласна, якую б культуру мы ні ўзялі, дракон – гэта абавязкова хімерычнае, гібрыднае стварэнне, складзенае з розных частак, якія сімвалізуюць розныя, часам супрацьлеглыя, стыхіі і з'явы, прычым абавязковая прыкмета – змеепадобнасць. Але першапачатковае грэчаскае значэнне слова "дракон" зусім іншае – "відушчы" [80, 68]. Можа быць, таму і змеяў лічылі мудрымі, пра што згадвае нават Хрыстос у Бібліі.

Такім чынам, першая характэрная рыса вобраза – хімерызм. На нашу думку, гэта можа азначаць адзінства духу і матэрыі, а таксама вечнае пераўтварэнне ўсіх прыродных форм, перацяканне адной у другую. У таемнай кнізе яўрэйскай мудрасці Каббале на гэты конт гаворыцца: "Камень робіцца раслінай, расліна – жывёлай, жывёла – чалавекам, чалавек – духам, і дух – Богам" [12, 108]. Тут, відаць, маецца на ўвазе, што жыццё на планеце Зямля – гэта, перш за ўсё, пад'ём свядомасці ад ніжэйшых формаў матэрыі да вышэйшых, бо, сапраўды, жыццё ёсць нават у каменях, дзе ідзе працэс узнікнення мінеральных відаў, нечым падобны да метамарфозы жывых істот. Матэрыя адзіная, і ўсе яе часткі ўзаемадзейнічаюць. Сатканая ў адно, адным спосабам, які, аднак, ад сцяжка да сцяжка ніколі не паўтараецца, тканіна Універсума ўтварае цэлае. Вобразнае архаічнае мысленне і ўвасобіла Універсум у выглядзе дракона.

Змеепадобнасць яго – другая характэрная прыкмета. Уласна, нашы рэчкі і носяць такія назвы, як Вужа, Гарынь, што вельмі звілістыя – змеепадобныя. Але Змей таму важнейшы персанаж усіх

міфалогій, што ўвасабляе не толькі раку, але і ўвогуле ваду, хвалю. Хвалепадобныя рухі цела азначаюць сілу, энергію, стваральныя рытмы прыродных элементаў. Магчымасць змяі скручвацца асацыіруецца з кругам, які заўсёды лічыўся самай дасканалай з усіх геаметрычных фігур. Дракон, які кусае сябе за хвост, – гнастычны **Ураборас** – сімвал усіх цыклічных працэсаў, і ў прыватнасці часу.

Дракон атаясамліваецца, з аднаго боку, з вадою, з другога боку, з вяршынямі гор. У цэлым ён выступае зямным уладаром, з якім прыходзіцца змагацца герою-стваральніку, каб вызваліць ваду ці зямлю. Тры галавы дракона, якія звычайна мае Змей Гарынавіч ці Цмок у нашых казках, азначаюць тры прынцыпы: актыўнасць, пасіўнасць і нейтральнасць.

Сімволіка дракона ўвогуле фенаменальна багатая і складаная. Безумоўна, асновай яе маглі быць некаторыя прыродныя з’явы, напрыклад, кругавыя марскія цячэнні, паветраныя віхуры, смерчы, тайфуны, лава, вывяржаная з вулкана, вясёлка, палёт метэора, камета і шмат што іншае. Нельга выключаць і існаванне так званых марскіх змеяў, невядомых пакуль навуцы рэліктавых істот, якія, верагодна, захаваліся ў глыбінях Сусветнага Акіяна, яшчэ фактычна не вывучанага. У навуцы зафіксавана больш як 600 сустрэч з імі на працягу гісторыі мараходства. З гэтага ж раду – легендарная **Нэсі** (рэліктавы яшчар) у шатландскім возеры Лох-Нес. Менавіта яна – сусветна вядомая, але нейкія таямнічыя істоты велізарных памераў сустракаліся і ў іншых вадаёмах на Зямлі: у Якуціі, Казахстане, Кітаі, Афрыцы. Іх бачылі нашы сучаснікі.

Ёсць і гістарычныя звесткі. Акадэмік Б. Рыбакоў на падставе вывучэння старажытных летапісаў сцвярджае, што некалі ў балотах Палесся вадзіліся каласальнай велічыні яшчаркі, падобныя да варанаў ці кракадзілаў. Памяць пра іх засталася ў дзіцячай гульні “Яшчар”, зафіксаванай у гэтым рэгіёне. Варта паставіцца да народных легендаў сур’ёзна, улічыўшы, што і гіганцкіх варанаў Інданезіі, так званых “драконаў вострава Камода”, адкрылі толькі ў ХХ ст. Старыя паданні распавядаюць, што некалі ў Еўропе вадзіліся страшэнныя пачвары – Цмокі, падобныя да драконаў. З імі змагаліся казачныя волаты, а пазней – сярэднявечныя рыцары, вызваляючы ад страшыдла не толькі дзяўчат-прыгажунь, але часам нават цэлы горад, краіну. Як сведчыць Б. Рыбакоў, у 30-м томе Поўнага збору рускіх летапісаў пад 1582 годам ёсць дзіўны запіс: “В лето изыдоша коркодилы лютии из реки и путь завориша, людей многих поядаше...”. Справа адбывалася пад Вялікім Ноўгарадам. Загадкавыя істоты зафіксаваны і ва ўспамінах аўстрыйскага пасла ў Маскові

Сігізмунда Герберштэйна, які праязджаў праз Беларусь і са здзіўленнем адзначаў, што быццам бы язычнікі-літвіны кормяць велізарных яшчараў. Тут жа ў 1589 г. агент англійскай гандлёвай кампаніі Джэром Гарсей бачыў на беразе ракі мёртвага кракадзіла [95, 284–382]. Загадкавую істоту (ці тое кракадзіла, ці тое дагістарычнага дыназаўра) знайшлі ў рускім горадзе Арзамасе ў пачатку XVIII ст. Улады заспіртавалі пачвару ў бочцы і адправілі ў Пецербург для вывучэння. Праўда, па дарозе знаходка знікла [114, 14]. Як бачым, розныя сведчанні – пра адно і тое ж. Прытым гэта ўжо нават не народныя легенды, а гістарычныя факты, зафіксаваныя ў пісьмовых помніках. Увогуле крыптазаалогія ў апошні час адкрыла шмат незвычайнага.

Улічваючы сучасныя навуковыя адкрыцці, можна інакш паглядзець на некаторыя міфалагічныя персанажы. Змяінае паходжанне яўна праглядае ў вобразе **Кашчэя**, **Салаўя-разбойніка**, ды і Усяслава Чарадзея, пра якога хадзілі чуткі, што ён нарадзіўся ад **Вогненага Змея**. Дарэчы, смерць Кашчэя ўвасабляе сабою ланцужок вобразаў (заяц, у ім качка, у качцы яечка, упаўшае ў мора і знойдзенае шчупаком), які здаецца стракатым і бессэнсоўна доўгім, калі не ўбачыць у ім дынамічна разгорнутую мадэль сусвету – верхні, сярэдні, ніжні ярусы з адпаведнымі жывёламі ды яшчэ і з Сусветным Дрэвам (дуб). Гэта тое ж злучэнне розных частак, толькі больш упарадкаванае, што і ў вобразе дракона. Цяжэй выпадак з Салаўём. Салаўіныя спевы і ўвогуле вобраз маленькай бяскрыўднай птушачкі выклікае ў чалавека выключна станоўчую рэакцыю. Чаму ж у былінах і казках пра **Ілью Мурамца** пад вобразам Салаўя-разбойніка выступае пачвара? Адно з тлумачэнняў вынікае з адваротна прачытанага (без канчатка) слова: Салавей – валас (волас). **Волас-Вялес** – адзін з самых старажытных багоў не толькі ўсходніх славян, але шмат якіх народаў Паўночнай Еўропы. У славянскай традыцыі ён, як правіла, змеепадобны. Вучоныя адзначаюць: “Найбольш важным у рэканструкцыі ўяўленняў пра Воласа-Вялеса аказалася адкрыццё “змяінай” прыроды персанажа. Яна пацвярджаецца не толькі надзвычай пераканаўчымі дадзенымі знешняга параўнання (міфалагічнымі і моўнымі), але і больш моцнымі аргументамі” [106, 210], напрыклад, малюнкамі і каментарам да іх Радзівілаўскага летапісу.

У аснаванні знакамітага Збручскага ідала, які захоўваецца ў Польшчы, выразаны з каменя змеепадобны Вялес трымае на сабе Зямлю [4, 49]. Як і ў Кітаі дракон, Вялес тут – аснова, апірышча свету, уладар існага.

Вялес і Пярун – галоўныя персанажы так званага "асноўнага міфа" славян, а шырэй – усіх індаеўрапейцаў: міфа пра змеяборства. **Пярун** – бог-грымотнік, сімвалам якога быў арол, – змагаецца са змеепадобным Вялесам. "У старажытнаеўрапейскай міфалогіі гэта ідэя адлюстроўвала барацьбу нябеснага пачатку – птушкі і пачатку зямнога – змяі" [11, 83]. У індыйскіх Ведах вярхоўны бог **Індра**, імем якога названа краіна Індыя, перамагае кашмарнага дракона **Урытру**, што ўвабраў у сябе ўсю зямную ваду (магчыма, гэта была камета, што падняла, прыцягнула ваду з Зямлі).

У Вавілоне бог **Мардук** перамагае марскога дракона **Тыямат**, з цела якога, як і з кітайскага Чжулуня, пазней ўтвараюцца ўсе элементы сусвету. У старажытным Егіпце сонечны бог **Гор**, які часам выступае ў вобразе сокала, кожную ноч змагаецца з драконам **Сетам** – богам цемры, падзем'я, апраметнай. У грэчаскай міфалогіі амаль усе багі і героі – пераможцы змеепадобных пачвараў. Напрыклад, **Зеўс** перамагае змея **Ціфона**, **Апалон** – **Піфона**, **Геракл** – **Гідру** і **Ехідну**, **Персей** – **Медузу Гаргону**. І гэта далёка не поўны пералік.

У заходняй культурнай традыцыі рыцар выратоўвае ад дракона прыгажуню. Усе героі знакамітага кельцкага эпасу пра **Караля Артура** і рыцараў Круглага Стала змагаюцца з драконамі. Аснова сюжэта – глыбока міфалагічна-рытуальная: у старажытнасці многія плямёны цнатлівую дзяўчыну прыносілі ў ахвяру (тапілі ў моры, возеры, рацэ) Духу Вады, які і ўвасабляўся ў вобразе дракона. У нейкі гістарычны момант маладое пакаленне мужчын, відаць, паўстала супраць архаічнага страшнага звычая. У алегарычнай літаратуры Сярэднявечча выратаваць дзяўчыну з пасткі дракона – значыць вызваліць чыстыя, дабратворныя сілы, знічтожыўшы ліхія, у цэлым – перамагчы зло [63, 79–80].

У хрысціянскай рэлігіі дракон выступае як увасабленне пекла, а сатана названы "Вялікім Драконам". З ім змагаецца Хрыстос, Архангел Міхаіл і Георгій Пераможца. Два апошнія найчасцей прадстаўлены ў іканаграфіі.

Ва ўсіх пералічаных выпадках у двубоі героя з драконам выяўлена па сутнасці адвечная барацьба духоўнага і матэрыяльнага, нябеснага і зямнога пачаткаў, якая адбываецца і ў кожным чалавеку – барацьба яго духа і цела. Акрамя таго, паўстае супрацьстаянне дабра і ліха ў іх самых агульных праяўленнях.

Але неабходна мець на ўвазе, што "уяўленні пра абсалютнае зло робіцца прадметам рэлігійнай свядомасці толькі на даволі высокай ступені развіцця апошняй, калі яна аказваецца здольнай зрабіць маральныя катэгорыі сваім аб'ектам" [97, 16]. Будзем памятаць, што

старажытная міфалогія адлюстроўвае стасункі чалавека і прыроды, а на прыроду маральныя катэгорыі не распаўсюджваюцца. Вось чаму першапачаткова міфалагічныя персанажы, у тым ліку, дракон – заўсёды амбівалентныя. Пры тым, што істота – яўна страшная, хтанічная, яна ўсё ж звязана з першавытокам жыцця (бо персаніфікуе энергію або ваду) і ведамі, мудрасцю. У міфах драконы ахоўваюць нейкія выключныя каштоўнасці, напрыклад, залатыя яблыкі **Гесперыд**, Залатое Руно, або ў германа-скандынаўскай культуры – Дрэва Жыцця Ігдрасіль. Не варта разумець гэтыя вобразы літаральна. Яблыкі сімвалічна – выток маладосці, несмяротнасці (як і ў нашых казках – маладзільныя яблыкі), Залатое Руно – нешта выключна каштоўнае, хутчэй за ўсё таемныя веды, якія ў выглядзе рунаў (руно – руна) былі запісаны на кожным лісціку Сусветнага Дрэва [12, 55].

Неабходна адзначыць, што ўсе названыя аб'екты знаходзяцца ў цэнтры зямлі або ў выраі, а значыць, і дракон неяк звязаны з Цэнтрам і абавязкова з Касмічным Дрэвам. Яшчэ кітайскі **Фусі**, як мы памятаем, паднімаўся па гэтаму дрэву на Неба. Сусветнае Дрэва – вось свету, глабальная яго мадэль, канцэнтраванае выяўленне ўсіх універсальных катэгорый, увасабленне зямной мудрасці. Можа быць, драконы таму ў цэнтры свету або трымаюць на сабе свет, як наш **Вялес**, што ў далекай старажытнасці (прыкладна дванаццаць тысяч год таму) сузор'е Дракона было цэнтрам бачнага з Зямлі неба. Акрамя таго, старажытныя людзі лічылі два канцы экліптыкі трансцэндэнтнымі месцамі жылля чалавечых душ. Прычым канец, размешчаны на поўначы, якраз у сузор'і Дракона, асацыіраваўся з выраем, а другі канец, што на поўдні, быў звязаны з падземны царствам памерлых [60, 562].

Дрэва–Касмічная Вось дазваляе нам зразумець унутраныя сэнсавыя пласты, што заключаны ў вобразе дракона. Рэптылія ахоўвала вось экліптыкі – Паўночны полюс, адсюль – і на Зямлі яна ахоўвае вось зямную – Сусветнае Дрэва. З гэтага пункту гледжання зразумела з'яўленне дракона або змея (Сатаны) ў выраі на Дрэве пазнання дабра і зла, якое з'яўляецца варыянтам Прадрэва. Увогуле ж, значэнне вобраза, можа быць, больш касмічнае, чым зямное.

Але нават у хрысціянскай сярэднявечнай Еўропе дракон – не толькі персаніфікацыя ліха як такога, але і зноў-такі сімвал цэлага, які злучае элементы паветра, агню, вады і зямлі [107, 85]. У кансерватыўнай Англіі, якая надзвычай беражліва ставіцца да свайго мінулага, чырвоны дракон да нашага часу з'яўляецца нацыянальнай

эмблемай Уэльса, як і ў Кітаі. Дарэчы, назва Уэльс, безумоўна, паходзіць ад старажытнага еўрапейскага бога **Вялеса-Велса-Уэльса**.

Сучасная псіхалогія, ідучы ўслед за прыгожым пісьменствам, вызначае сімвал дракона як нешта кашмарнае, цяжкае, страшнае, што чалавеку абавязкова неабходна пераадолець. Інакш кажучы, толькі той, хто пераможа дракона, робіцца героем. Прычым дракон – не толькі нешта знешняе: самы жахлівы дракон – у самім чалавеку. На такім разуменні вобраза асноўваецца і сучаснае мастацтва. Успомнім хоць бы выдатную кінастужку знакамітага расійскага рэжысёра Марка Захарава “Забіць Дракона”, створаную па п’есе савецкага пісьменніка Яўгена Шварца “Дракон”. Канцэпцыя як літаратурнага твора, так і фільма, па вялікаму рахунку, – у межах міфалагічнага мыслення: ёсць небяспека, што той, хто заб’е дракона, сам робіцца драконам (вавілонскі бог Мардук, перамогшы дракона Тыямат, адначасова і разбуральніка, і стваральніка, сам робіцца драконам). Інакш кажучы, нават пераможанае зло нараджае іншае зло. Але, з другога боку, дракон сам сябе паглынае, як Ураборас. А гэта можна разумець і такім чынам: Прырода заваёўваецца толькі самой Прыродай... Дракон жа, безумоўна, найлепшае вобразнае ўвасабленне мудрай, разнастайнай, добрай і страшнай, непрадказальнай і цудоўнай Прыроды.

Праўда, магчыма, гэты вобраз – увогуле не нашага вымярэння, а іншага – паралельнага свету, і не матэрыяльная істота, а энергетычная, якой наша псіхіка надала больш-менш звыклыя формы.

Вобраз, як бачым, выключна складаны і цікавы. Нездарма эзатэрычная іудзейская традыцыя сцвярджае, што самае глыбокае значэнне таямніцы дракона не паддаецца разгадцы...

## ЗМЯЯ

Наконт каласальнай распаўсюджанасці вобраза змяі ў міфалогіі і культуры чалавецтва ў аўтара дадзенай работы ёсць некалькі версій. Адна з іх, так бы мовіць, фізіялагічная. Нагадаем, што канструкцыя мозга чалавека шматслойная. Яна ўключае ў сябе як мінімум тры эвалюцыйна разначасавыя пласты – мозг рэптыліі (!), мозг млекакормячага і ўласна чалавечы мозг (кара вялікіх паўшар'яў). І кожны пласт нясе адпаведную інфармацыю – пра саматычную і псіхічную канстытуцыю тых істот, што насялялі нашу планету ў пэўныя эпохі. Якім чынам здымаецца (счытваецца) гэтая інфармацыя – нам невядома. Але ў змененых станах свядомасці (напрыклад, у

снах) яна нейкім чынам усплывае на паверхню ў выглядзе архетыповых вобразаў. Прычым вобразы і нават сюжэты, з імі звязаныя, у прынцыпе аднолькавыя ва ўсіх людзей і ва ўсе часы. Няма, відаць, чалавека, якому хоць бы раз у жыцці не снілася змяя. Змяя ў такога кшталту снах, уласна кажучы, – сам чалавек, нейкія прыхаваныя нетры яго псіхікі. Паводле юнгіянцаў, «сны пра змеяў – папярэджанне пра зло ў розных яго выглядах і формах» [58, 136]. Але можна пайсці ў разважаннях яшчэ далей. Сама малекула ДНК – дваістая спіраль, падобная да кадуцэя бога **Гермеса** з дзвюма змейкамі. Сперматазоід – таксама змяісты. Акт зачацця мог быць увасоблены ў міфах, дзе дзейнічаў змей, – гэта ўжо версія галандскага вучонага Ф.Б. Кёйпера [52, 112–146].

Яшчэ адна версія – прыродная: у выглядзе змяі маглі быць увасоблены розныя прыродныя з'явы: навальнічная хмара, смерч, метэарыт, вывяржэнне лавы з вулкана, ледавік, рака і пад. Пра гэта пісаў буйнейшы міфолаг яшчэ XIX стагоддзя А. Афанасьеў.

Ёсць і трэцяя – найноўшая – гіпотэза, якую мы называем цывілізацыйнай. Але каб пачаць пра яе гаворку, неабходна нагадаць тэорыю ўзнікнення жыцця на Зямлі. Біясфера на планеце щзникае, можна меркаваць, тры мільярды год таму. 570 млн. год назад пачалася палеазойская эра, якая прыкладна ў 270-мільённалецці замянілася мезазоем, што цягнуўся 173 мільёны год. Тыя часы мы адлічваем сотнямі мільёнаў гадоў па той прычыне, што не ведаем пра іх нічога або ведаем надзвычай мала. У межах такіх агромністых перыядаў маглі ўзнікнуць, надзвычай павольна развівацца і знікаць розныя цывілізацыі – не абавязкова чалавечыя.

Вядома, як доўга пануючым класам сярод жывых істот на Зямлі былі паўзуны. Яны авалодалі воднай прасторай, сушай і нават нябёсамі. У юрскі перыяд яшчары – сапраўдныя гаспадары планеты. Яны ўражваюць сваёй магутнасцю, разнастайнасцю відаў і жыццёвай сілай. Нават калі развіццё гэтых халоднакроўных ішло надзвычай павольна, усё роўна за дзесяткі мільёнаў гадоў яно павінна было прывесці да заканамернага выніку – узнікненню розуму. Прыродныя катастрофы, што здараліся ў гісторыі планеты неаднойчы і знішчалі большую частку фаўны, якраз садзейнічалі выжыванню самых разумных істот.

Можна меркаваць, што яшчары перажылі ледавіковы перыяд, а таксама нейкі касмічны катаклізм XI тыс. да н. э., і некаторы час, пакуль людзей было мала, уладарылі на Зямлі. У старажытным егіпецкім папірусе пад назвай “Аповесць пра пацярпеўшага караблекрушэнне” (2000 г. да н. э.) распавядаецца аб сустрэчы героя з

прадстаўніком намнога больш развітай культуры змеяў. Змей скардзіцца занесенаму на востраў чалавеку, што ўсе яго родзічы загінулі ад упаўшай зоркі, і ён астаўся адзін. Яму самотна, цяжка, сумна. Валодаючы дарам прадбачання, агромністы змей даўжынёй 30 лакцей (прыкладна 15 м) прадказаў падарожніку яго будучае, якое спраўдзілася [19, 288]. Паданне надзвычай цікавае тым, што згадвае і пра катастрофу, якая адбылася, хутчэй за ўсё, па прычыне падзення на Зямлю асцяроіда, і пра разумных яшчараў.

У згаданым унікальным літаратурным творы адчуваецца аўтарская сімпатыя да прадстаўніка загінуўшай цывілізацыі. З другога боку, у міфалогіі Старажытнага Егіпта, для якой характэрны выключна развіты культ сонца, каласальны змей **Апоп** – якраз супраціўнік бога сонца **Ра**. Апоп уладарыў над неабсяжным падземным царствам, плаваў па падземным Ніле (а Ра – па нябесным) і ўсяляк імкнуўся перашкодзіць узыходжанню сонца раніцай, але нязменна цярпеў паразу.

Змеі ва ўсіх міфалогіях – жыхары падзем'я, марскіх глыбінь ці горных пячор. Літоўская назва такога змея **Дугнай** нават суадносіцца са словам "дно", а сербская – **Бадняк** – з "адам".

У Індыі, з аднаго боку, шануюць змея **Шэшу** з дзвюма рукамі, які стварыў свет і служыць ложкам для бога **Вішну**, а з другога боку, герой Ведаў **Індра** змагаецца і забівае змея **Урытру**, які "не чалавек і не бог", але надзвычай магутны і трымае ў сабе, "закрывае" усю зямную ваду. На нашу думку, такая супярэчнасць індыйскай міфалогіі абумоўлена розным стаўленнем да змеяў з боку розных расаў Індыі, што насялялі краіну: белыя арыйцы – стваральнікі Ведаў – успрымалі гадаў выключна адмоўна, а вось для чорнай, абарыгеннай у Індыі, расы – дравідаў – якраз быў характэрны культ змеяў [14, 283].

Паданні пра **Сусветнага Змея**, які трымае на сабе свет, на якім стаіць сама Зямля ці які абкружае яе, сустракаюцца ў многіх народаў і датуюцца прыкладна IX тыс. да н. э. Ва ўсялякім разе, запісаныя намнога пазней, яны згадваюць менавіта гэты час – праз тры тысячагоддзі пасля катастрофы. У далейшым людзі асвоіліся пасля катаклізму, размножыліся, набылі адчуванне сваёй моцы і перасталі баяцца змеяў, што раней гаспадарылі на планеце. Праўда, у міфах шматлікіх народаў змеі – настаўнікі чалавецтва. Так, у эвенкаў змей **Дзябдар** разам з мамантам удзельнічаў у стварэнні свету, а потым лячыў хворых. Вьетнамскі **Лак** вучыў людзей вырошчваць рыс, разводзіць шаўкавіцу, стварыў першую дзяржаву. На тэрыторыі Мексікі адкрылі надзвычай старажытны ацтэкскі рэльеф, на якім паказаны жрэц, што адпраўляе рытуал пад непасрэдным прыглядам

агромністага Змея. У вераваннях многіх амерыканскіх народаў змеі – менавіта творцы і настаўнікі людзей [45, 24]. Прычым яны не толькі дапамагалі людзям, але і кіравалі імі. Так, у Фінікіі ўладарылі цары-змеі. Адзін з іх – **Кадм** – пераплыў мора і заснаваў у Грэцыі горад Фівы. Ён жа даў грэкам алфавіт, якім яны карыстаюцца да сёння, ды і наш, кірылічны, на яго аснове створаны. Грэчаскі бог медыцыны **Асклепій (Эскулап)** спачатку быў змеем, пасля набыў антрапаморфны воблік, але захаваўся ў сімволіцы ўсіх аптэк на зямлі ў выглядзе змяі над кубкам з атрутай, якая ў малых дозах валодае лекавымі ўласцівасцямі. Некалькі змяіных пакаленняў уладарылі ў Афінах, ды і пазней апякунку горада багіню мудрасці **Афіну** заўсёды суправаджаў змей **Эрэхтэйон**. Яму нават прысвечаны маленькі, але незвычайны па архітэктурных асаблівасцях, храм на Акропалі, у якім будаўнікі ўпершыню ў свеце ў якасці калонаў скарысталі карыятыды – скульптуры, што ўвасаблялі маладых дзяўчат.

Старажытныя паданні армян сцвярджаюць, што каля свяшчэннай гары Арарат пасяліліся нашчадкі разумных змеяў – вішапаў, а на вяршыні гары жыве сам **Змей-цар**. У Індыі змеепадобныя **Нагі** лічыліся мудрацамі і жылі ў падземным царстве, дзе валодалі незлічонымі скарбамі. Увогуле ўсе змеі сцераглі нешта надзвычай каштоўнае: напрыклад, руны, якія былі запісаны на скандынаўскім Сусветным Дрэве Ігдрасілі, або Залатое Руно (тыя ж руны на пергаменце), што здабыў грэчаскі герой **Ясон** (з дапамогай закаханай у яго **Медеі**), або залатыя яблыкі **Гесперыд**, або скрыжалі, на якіх былі запісаны лёсы багоў і людзей (іх сцярог іранскі змей **Кінгу**). Падобна на тое, што скарбы, якімі валодалі змеі, мелі, хутчэй за ўсё, нематэрыяльную каштоўнасць, а былі таемнымі ведамі, пакінутымі ранейшай цывілізацыяй яшчараў. Міфы пры гэтыя скарбы скраліся, відаць, тады, калі людзям і змеям жыць побач ужо стала немагчыма. Людзей раздражняў веліч гадаў, ды і выгляд іх выклікаў агіду; змеі ж стаміліся ад чалавечай мітусні, якая не стасавалася з іх меланхалічным тэмпераментам. Яны перамясціліся ў пячоры, падзем'е, залеглі на рачном ці марском дне. Мы пісалі ў папярэднім нарысе, што шматлікія сустрэчы з марскім змеем зафіксаваны дакументальна, значыць, звесткі пра іх ужо пераходзяць з разраду міфаў у гістарычную рэальнасць.

Змеяў і драконаў у эпасе многіх народаў часта блытаюць, называючы адных імёнамі другіх. Можа быць, гэта родзічы, хоць і не блізкія. Хутчэй за ўсё, змеі – старэйшыя, бо ў касмаганічных міфах вельмі часта сустракаецца **Сусветны Змей**, што жыў ў пачатку часоў. Большасць герояў еўрапейскіх народных эпасаў і казак

змагаюцца ўсё ж з драконамі, хоць у славян традыцыйны персанаж па-ранейшаму – **Змей Гарынавіч**. Выращыць праблему тоеснасці ці адрозненння змеяў і драконаў пакуль немагчыма. Некаторай падказкай (хто быў раней) можа быць карэйскі міф пра змея **Імугі**. Ён шмат-шмат гадоў нерухома праляжаў на марскім дне, пасля трансфармаваўся (?), пературыўся ў дракона і ўзнёсся на неба [71, I, 512]. Але што на самай справе гэта азначае – невядома. Менавіта драконаў чамусьці асабліва шануюць на Усходзе. Белая ж раса, што засяліла прасторы Еўразіі, жыць побач з імі не пажадала. Думка некаторых навукоўцаў, што для арыйскіх народаў менавіта змяя сімвалізавала ўсходніх захопнікаў-качэўнікаў, нам здаецца наіўнаю. Залішне многа фактаў, якія сведчаць пра страх і прaкланенне перад сапраўдным, а не сімвалічным змяіным народам з боку аўтахтонаў Еўропы, Азіі, Амерыкі, Аўстраліі.

Страх страхам, а ўсё ж, паўтараем, арыйцы нязменна змагаюцца са змеямі і драконамі. **Зеўс** хітрасцю адолеў дракона **Ціфона**. Сонечны бог **Апалон** перамог змея **Піфона**, народжанага са жвіру, які астаўся пасля Сусветнага Патопу, і закапаў яго ў мястэчку Дэльфы (што азначае "Чэрава"). **Геракл** перамог **Лернейскую Гідру** і ўзяў шлюб са змеепадобнай **Ехіднай.** Змеепадобныя тытаны (такімі яны паўстаюць на знакамітым Пергамскім алтары), прыкаваныя да гор або скінутыя ў падзем'е, былі асуджаны на вечныя пакуты. Надзвычай актыўна змагаюцца са змеямі сонечныя героі скандынаўска-германскай міфалогіі: **Сігурд**, **Рагнар**, **Ладброк**, **Зігфрыд**. Не адставалі ад іх і славянскія змеяборцы: **Ілья Мурамец**, **Дабрыня**, **Дунай**, **Каваль**. Героі кельцкага эпаса пра караля **Артура** і рыцараў Круглага Стала толькі барацьбой з драконамі і займаліся, прычым не проста з абстрактнымі істотамі: кожны з іх меў імя. Племя змеяў знішчалася паўсюдна. Кожны рыцар лічыў сваім святым абавязкам забіць змея – з гэтага смяяўся выдатны амерыканскі пісьменнік-гумарыст Марк Твен у сваім парадыйным рамане "Янкі пры двары караля Артура". Але ў сярэднявечнай літаратуры, у якой не было месца жартам, цэнтральным аказаўся менавіта гэты сюжэт. Людзі, як вядома, перамаглі, хоць сёння літаральна апантаны цікавасцю да дыназаўраў.

Прыведзеная вышэй версія пра разумных дыназаўраў (змеяў і драконаў з легендаў), безумоўна, фантастычная, але зусім не горшая за любы сучасны міф, які прэтэндуе на навуковасць (напрыклад, пра НЛА). Больш за тое, на карысць гэтай версіі гавораць шматлікія факты. Так, фараоны Егіпта (як і раджы Індыі) насілі на галаўных уборах выяву свяшчэннага змея **Урэя**, які, на нашу думку, увасабляў

энергію, уласна магічную сілу фараона (яго "трэцяе вока"). У індзейцаў Амерыкі пернаты змей **Кецалькаатль** быў даравальнікам усіх даброт цывілізацыі (іншых падобных культурных герояў мы ўжо згадвалі). Сам Хрыстос заклікаў быць "мудрымі, як зміі". На беларускім Палессі да XX ст. аставалася ў звычцы трымаць вужоў у доме як хатніх абаронцаў-абярэгаў. Значыць, быў страх, была агіда і нянавісць з боку людзей да змеяў, але было і ўшанаванне як нечага, бясспрэчна, *вышэйшага.*

Аднак усё ж найбольш цікавае ў нашай тэме – сімвалічнае напаўненне вобраза, розныя семантычныя яго трансфармацыі. Тут праблем літаральна не злічыць. Напрыклад, такая. Адразу пасля перамогі над змеямі ўзнікае культ ваўка-сабакі. Відаць, воўк быў ужо канчаткова прыручаны і стаў хатнім сабакам. Але чаму так многа аказалася блізкага ў функцыях змеяў і ваўкоў? Нічым жа біялагічна не падобныя паміж сабою гэтыя істоты! Чаму яны нават змешваліся: дастаткова прыгадаць прапродка сербаў Змея Вогненага Вука або Усяслава Чарадзея – ваўкалакаў, народжаных, паводле народнага падання, ад **Вогненага Змея**? Чаму апошні, сам вогнены, знішчаецца агнём? У беларускіх і рускіх казках **Зміулана** (другое імя Вогненага Змея) праследуюць **Агонь** і царыца **Маланьіца** (маланка), а ён ад іх хаваецца ў старым дубе (на Сусветным Дрэве)? Сам жа Вогнены Змей мог быць маланкай... І чаму асноўная яго функцыя – сексуальныя адносіны з жанчынамі, да якіх ён залятаў у комін?

Дарэчы, многія змеі ў казках дыхаюць агнём. Само слова **Ціфон** (змей, пераможаны **Зеўсам**) азначае "той, хто дыміцца". Спачатку Ціфон ахапіў Зеўса кольцамі свайго хваста, падобнага да клубоў дыма, але затым Зеўс яго пабораў – менавіта маланкамі. Міфолагі-пазітывісты наіўна тлумачылі іх двубой як сімвал засухі, што замянілася дажджом. На самай справе, бой двух супрацьлеглых пачаткаў жыцця мае больш глыбокі касмаганічны сэнс. Скажам, спачатку Зямля была гарачая, а астывала дзякуючы вадзе з неба. Ці яшчэ шырэй: Зеўс – дабро, што нясе Неба, змей – унутраныя рэзервы, незалежныя ад даброт неба. Змей супрацьстаіць нябеснаму апякунству. Яго ўласная жыццёвая сіла ваюе з бязмежнай энергіяй Неба, што паклала пачатак гэтай сіле. Як бы сама Зямля адмаўляецца ад нябеснай падтрымкі, правяраючы сваю жыццяздольнасць. Аднак Змей пераможаны, бо Зямля як планета без энергіі Сонца існаваць не можа. Або, калі перавесці ў філасофскі план: абмежаваная матэрыя не можа супернічаць з духам. Але яна прад'яўляе свае правы з той самай сілай, якую ўклаў у яе дух. Відаць, падобнае супрацьстаянне

пазбаўляе свет ад застою і служыць развіццю. І увогуле дух і матэрыя не існуюць адно без другога.

Такім чынам, змей перш за ўсё асацыіруецца з зямлёю, самі словы гэтыя – роднасныя. Безумоўна, "змей" – эўфемізм. Як лічыць ізраільскі вучоны А. Галан, перашпачатковая назва жывёлы – "гад". У старажытных ханаанцаў, што жылі на зямлі Палесціны, быў бог **Ваал-Гад** (той жа самы **Вялес**). Ад "гада" паходзіць славянскае слова "гадаць", гэта значыць, быць відушчым, як Змей у егіпецкім папірусе пра падарожніка. Але ёсць яшчэ адна назва – "вуж" (рускае "уж", іранскае "az", армянскае "iz"). Галан суадносіць слова з рускім "ужас", што азначае "вялікі страх" [Галан, 78–79]. Але ці мог бяскрыўдны вуж выклікаць "вялікі страх"? Значыць, справа ў тым, што ён быў падобны да таго, хто такі страх сапраўды ўнушаў. У заходніх славян, дарэчы, казачны змей называўся **Яжа**, што блізка і да "вужа", і да міфалагічнага беларускага **Яшчара.** Яшчэ адна назва **Цмок (Смок)** (ад "смактаць") характэрна для беларускай, чэшскай, балгарскай моў [100, II, 334].

Бясспрэчная хтанічная прырода Змея вызначае суаднесенасць яго з падземным светам памерлых. Змеяпадобны бог Вялес і быў славянскім царом мёртвых. Сувязь з падзем'ем абумовіла антаганізм Змея і Сонца. У паўднёвых славян Змяя паглынала Сонца, кусала яго ў вочы. У іншых славянскіх народаў Сонца пакутуе ад магічнага страшнага позірка Змяі: у беларусаў і палякаў яно патухае і змяншаецца. Вось чаму забітую змяю нельга вешаць на сонцы, іначай сонца будзе барвавець, хварэць і плакаць [100, II, 334]. З другога боку, у егіпецкай "Кнізе памерлых", якая распавядае пра падарожжы Сонца і разам з ім чалавечай душы, Сонца, перш чым вырвацца раніцай з нетраў зямлі, абавязкова глытаецца Змеем **Апопам** і праходзіць праз яго гіганцкае цела. Вось адкуль, на нашу думку, важнейшы сюжэт у ініцыяльных абрадах, які сам У. Проп – выдатны даследчык казак –не мог зразумець, а толькі канстатаваў: неафіт глытаецца нейкай пачварай (менавіта змеепадобнай), з пасткі якой выходзіць ужо ў новай якасці. Інакш кажучы, шлях Сонца і душы чалавека пад зямлёю (у іншасвеце) ажыццяўляецца праз змяю як праз своеасаблівы праход, бо непасрэдна праз глебу не прабіцца. А значыць, хоць Сонца і Змей – антаганісты, тым не менш адзін без другога існаваць не могуць. Герой-Сонца заўсёды – пераможца, бо апладняе косную матэрыю, але, з другога боку, Сонца не адродзіцца, не прайшоўшы праз цела Змея, а гэта гаворыць пра нейкую агульную першапрычыну, якая антаганістаў спарадзіла.

Прырода міфалагічнага Змея – ва ўсім амбівалентная. Ён вогнены, але ён жа звязаны з вечна пераменлівай стыхіяй вады (змеі плаваюць і мяняюць скуру). Акадэмік Б. Рыбакоў лічыў хвалістую лінію на неалітычным посудзе сімвалам аднначасова і вады, і змяі [94, 213]. Вобраз Змяі (Змея) развівае тэму нараджэння і смерці, заключаную ў архетыпе воднага хаосу, што хавае ў сабе ідэю ўрадлівасці. Таму часта Змей звязваецца не толькі з падзем'ем, але і з сусветным Акіянам, увогуле воднай сферай. Між тым, неаформленая стыхія вады звязваецца і з разбурэннем, таму Змей, што яе ўвасабляе, усё ж заўсёды ўяўляецца жахлівай пачварай. Бог-грымотнік Зеўс ці сонечныя багі, пачаўшы бой з Сусветным Змеем і іншымі параджэннямі бязладнага Хаосу, каб стварыць свой аформлены свет, працягваюць барацьбу ўжо як апекуны ўтворанага гарманічнага Свету, пабуджаючы Змея пастаянна аддаваць прыналежныя яму прыхаваныя рэсурсы (тую ж ваду).

Такім чынам, у кантэксце касмагоніі Змяя – як бы Першапачатковы Акіян, з якога ўсё ўзнікае і ў які ўсё вяртаецца, першыбытны недыферэнцыяваны Хаос, што так і астаецца на перыферыі нашага арганізаванага свету [98, 138]. Змяя (Змей) можа быць апірышчам для Свету, падтрымліваць яго ці абкружаць, робячыся Ураборасам – сімвалам цыклічнасці. Розныя міфалагічныя змеі (**Урытра, Крак**) кантралююць сілу вады, абкружаюць яе сабою або паглынаюць, карацей, “закрываюць” ваду. Само слова “Урытра” азначае “затор”, “перашкода”. У паўднёва-славянскіх тапанімічных легендах са Змяёй звязана паходжанне звілістых рэчак. І ў Беларусі ёсць некалькі рэчак з ласкавай назвай Змейка, не кажучы ўжо пра шматлікія назвы, утвораныя ад слова “вуж”. У Польшчы вераць, што дождж на зямлю пасылае Змяя. Найбольш вядомы міф у Літве – пра **Эгле**, каралеву вужоў – дзяўчыну, што ўзяла шлюб з каралём вужоў. Сапраўды, ва ўсіх славянскіх і балцкіх народаў існуюць павер'і пра Змяінага цара ці царыцу, або Цара-Вужа. Максім Багдановіч некалькі разоў у сваёй творчасці згадваў названую істоту, указваючы на галоўную яе прымету – залатую карону ці рожкі. На Беларусі верылі, што **Змяіны цар** жыве пад белым каменем (аналаг Алатыра) або ў балоце. Валоданне яго каронай ці рожкамі дае чалавеку шчасце, задавальненне ўсіх жаданняў, уладу, абарону ад змеяў і хвароб, здольнасць бачыць скарбы, лячыць людзей, разумець мову жывёл. Такім чынам, у нашым фальклоры ўсё ж засталіся аскепкі старажытнага міфа пра сувязь змеяў з нечым выключна каштоўным.

Агонь, зямля і вада – стыхіі, з якімі найбольш звязаны Змей. Але ёсць яшчэ і **Паветраны змей** ці яго жаночая сутнасць. У славян

лічылася, што Паветраны Змей паходзіць ад жывёл, перажыўшых свой тэрмін: ад саракагадовага вужа ці яшчаркі, ад семігадовага пеўня. У іншых павер'ях такі Змей нараджаецца ў выніку полавых кантактаў міфалагічных істот, напрыклад, Змея і самавілы, ці ад жанчыны і Змея, або ад кантактаў мужа і жонкі, якія адбываліся ў рытуальна забароненыя дні. Змеем паветраным у балгар робіцца і так званы "посмъртнічета", гэта значыць, дзіця, народжанае пасля смерці свайго бацькі.

Паветраны Змей шэрагам сваіх характарыстык усё ж адрозніваецца ад Вогненага Змея. Цяжарнасць жанчыны, што выношвае такую пачвару, цягнецца ненармальна доўга – 15–20 месяцаў. Дзіця-"змей" нараджаецца з крыламі і амаль адразу пачынае хадзіць. У прынцыпе гэта пярэварацень, бо яго выгляд мяняецца ў залежнасці ад таго, на зямлі ён ці ў паветры. Галоўная функцыя – здольнасць уплываць на атмасферныя з'явы (у той час як у Вогненага Змея асноўная функцыя – эратычная). Можна меркаваць, што Паветраны Змей сімвалізаваў у адных выпадках вясёлку, у іншых – віхуру. І ў такім разе выступаў як пасрэднік паміж Небам і Зямлёй.

Цэнтральная вось, што злучае Неба, Зямлю і Падзем'е, як вядома, – Сусветнае Дрэва. У шмат якіх міфалогіях Змей непасрэдна звязаны з гэтым вобразам. Змяя, якая абкруцілася вакол дрэва ці іншага "восевага"сімвалу, азначае абуджэнне дынамічнай сілы, дух усяго, што расце. Заходнія міфолагі лічаць, што Касмічнае Дрэва сімвалізуе мужчынскі пачатак, а Змяя – жаночы [53, 215]. Але нам здаецца, што Дрэва Жыцця, абвітае Змяёю, якая сімвалізуе зло (так, ва ўсякім разе, у Бібліі), указвае на шчыльную сувязь паміж жыццём і смерцю, якая з'яўляецца вытокам усяго зла.

Сапраўды, біблейская традыцыя наклала прыкметны адбітак на сімволіку змяі ў шматлікіх народаў Еўразіі. Змей робіцца безумоўнай персаніфікацыяй зла, у барацьбе з якім Дабро і можа праявіцца ў свеце. Слова "зло", відаць, роднаснае са словам "сіла". Можа быць, нашы продкі, стваральнікі мовы, хацелі падкрэсліць непажадальнасць залішняга праяўлення энергіі, якую і ўвасабляла змяя? Д'ябал, які спакусіў у выглядзе Змея **Еву**, аддзяліў ад Бога сябе і чалавека, паклаў пачатак нябеснаму бою Дабра са злом і барацьбе чалавека за сваё існаванне: аддзеленыя ад Бога, выгнаныя з рая, **Адам** і **Ева** з таго часу выжываюць з дапамогай уласных рэсурсаў. Але рэсурсы гэтыя ўрэшце будуць вычарпаны (ужо канчаюцца), таму д'ябал прайграе вайну з Богам, а людзі – барацьбу за зямное жыццё. У той жа час можна меркаваць, што вобраз д'ябла адлюстроўвае

патрэбу чалавечага розуму мець перад сабою вобраз *ворага* дзеля дынамікі мыслення.

Змяя як універсальны сімвал цікавіла шмат якія філасофскія школы, напрыклад, гностыкаў ранняга Сярэднявечча і асабліва прыхільнікаў так званай секты наасенаў (ад naas – змяя), якія лічылі "змяю" існуючай ва ўсіх прадметах і істотах. Гэта набліжае іх да індыйскіх ёгаў з іх вераю у змяю **Кундаліні** – вобраз ўнутранай сілы. Сапраўды, Кундаліні, якая ляжыць у самых нізкіх аддзелах спінога мозгу, але паднімаецца ажно да галавы, раскрываючы 3-яе вока, можа разумецца як сіла, якая узыходзіць ад вобласці, што кантралюецца полавымі органамі, да ўзрозню думкі [48, 198]. Вось чаму фрэйдысты разглядаюць Кундаліні як сімвал сублімацыі. Але ўсё ж больш верагодная іншая версія: змяя – злая, грахоўная прырода чалавека, якую ён павінен пераадолець у сабе.

Увогуле ж К.Г. Юнг мае рацыю, калі лічыць змяю архетыпам – гэта значыць, універсальна-глабальным сімвалам, што выяўляецца ва ўсіх людзей на падсвядомым узроўні і дае жыццё іншым сімвалам. Сапраўды, гэта той бог ранніх касмагоній, які стаў адпраўным пунктам для розных духоўных і псіхалагічных інтэрпрэтацый. Змей – у вышэйшай ступені складаны, амбівалентны сімвал. Як істота забіваючая, яна азначае смерць, але паколькі перыядычна змяняе скуру, – жыццё. Гэта і сонечны пачатак, і цемра, дабро і зло, мудрасць і сляпы эратызм, лекі і атрута, захавальнік і разбуральнік. У цэлым змяя – праяўленне сілы, энергіі на любым узроўні, выток усяго патэнцыяльнага як у матэрыяльнай сферы, так і у духоўнай. Змяя можа быць культурным героем і міфічным продкам. Яна заўсёды звязана з Вялікай Багіняй – **Зямлёй-Маці** і таму нясе ўрадлівасць, а на ўзроўні псіхалагічным азначае каварства, хітрасць, грэх. Слушна піша вядомы міфолаг М. Эліадэ (праўда, на іншы конт): "Што раздзелена і антаганістычна ў касмічнай рэальнасці, тое злучана, абагулена ў божышчы" [123, 284] – у дадзеным выпадку ў такім выключна складаным вобразе, як Змей.

Што тычыцца непасрэдна года 2001, а таксама будучага 2013, то ясна, што характар самой істоты, якая сімвалізуе гады, падказвае і іх характарыстыку: яны будуць выключна супярэчлівыя, багатыя і на добрае, і на ліхое. Можна параіць кожнаму, асабліва людзям старэйшага веку, успомніць сябе (ды і нашу гісторыю) у іншыя гады Змяі : 1929, 1941, 1953, 1965, 1977, 1989. Чаго набіраецца больш?

# КОНЬ

Пяцьсот мільёнаў год таму Зямля выглядала зусім інакш, чым цяпер. Клімат быў цёплы, суша і акіяны мелі зусім іншыя абрысы, і ўсюды раслі трапічныя вільготныя лясы. Па тых балоцістых лясах бадзялася маленечкая істота, падобная да невялікага барсука, – *эогіпус.* Быў ён гарбаценькі (як казачны Канёк-гарбунок) і паласаты, на ножках меў па тры пальцы. Нічым гэтая жывёліна не нагадвала сучаснага каня.

Але змяняўся клімат, а з ім – і фаўна. Праз некалькі этапаў развіцця эогіпус ператварыўся ў вытанчанага *гіпарыёна,* які бегаў ужо на адным пальцы – так зручней, а падобны быў да осліка. Незлічоныя статкі гіпарыёнаў засялялі стэпы Еўразіі і Амерыкі – косткі іх знаходзяць ледзь не па ўсім свеце [31, 66–68].

І далей з продкамі каня адбываліся нейкія цікавыя працэсы. Так, археолагі знаходзяць астанкі коней літаральна багатырскіх – большых за самага вялікага сучаснага цяжкавоза, і адначасова трапляюцца іншыя – меншыя за самага маленькага поні. Бадай, можна гаварыць пра расы коней, як і пра чалавечыя расы. Незразумелыя прыродныя катаклізмы прывялі да таго, што ў Афрыцы ацалелі толькі зебры і аслы, а ў Амерыцы коні ўвогуле поўнасцю зніклі і зноў былі завезены ўжо іспанцамі ў XVI ст. Цікава, што ў міфах індзейцаў захаваліся нейкія цьмяныя ўспаміны пра коней, хоць вучоныя сцвярджаюць, што тыя вымерлі яшчэ да з'яўлення ў Амерыцы чалавека.

У выніку доўгіх і надзвычай складаных трансфармацый прырода ўрэшце выляпіла дзівоснае гарманічнае стварэнне – літаральна твор мастацтва – каня, і жыццё яго на тысячагоддзі знітавала з лёсам чалавецтва.

Палеалітычныя людзі каня малявалі. Цэлы статак старажытных коней адлюстраваны ў пячоры Ласка ў Іспаніі (20000 год таму). Ростам тыя коні былі невысокія, каратканогія, цёмна-гнядыя, з невялікай галавой і магутнай шыяй. Усе іх сучаснікі – маманты, пячорныя мядзведзі, шарсцістыя насарогі – даўно зніклі з твару Зямлі. А вось коні захаваліся. Калі параўналі знойдзеныя ў шахце астанкі старажытнага каня з сучаснай *якуцкай* пародай, аказалася, што яны нічым не адрозніваюцца адна ад другой. Тоўстая скура, доўгая поўсць, уменне капаць (капыціць снег) дазволілі сучасніку мамантаў дажыць да XXI стагоддзя [2, 10–11].

Асабліва звяртае на сябе ўвагу тое, што коні якуцкай пароды – лясныя, жывуць у тайзе, хоць звычайна лічыцца, што біялогія каня

найлепш прыстасаваная да стэпу. Якраз стэпавы дзікі конь *тарпан* сустракаўся яшчэ ў XIX ст. на тэрыторыі Украіны: гэта была жывёла папялова-шэрага колеру, з цёмнай паласой па хрыбту, а на нагах – з папярэчнымі палоскамі, як у зебры. Гэта навяло нас на думку, што ад нейкіх лясных коней (тыпу якуцкіх) і ад тарпанаў паходзіць тая старажытная беларуская парода, пра якую нагадаў шырокай публіцы незабыўны Уладзімір Караткевіч у сваёй знакамітай аповесці “Дзікае паляванне караля Стаха”: “Гэта былі сапраўдныя палескія дрыкганты, парода, ад якой зараз нічога не засталося. Усе ў палосах і плямах, як рысі або леапарды, з белымі ноздрамі і вачамі, якія адлівалі ў глыбіні чырвоным агнём. Я ведаў, што гэтая парода вызначаецца дзіўнай трывалай, мышыстай інаходдзю і падчас намёту імчыць вялізарнымі скачкамі, як алень” [49, 183]. Магчыма, менавіта на такіх конях заваявалі нашы продкі індаеўрапейцы каласальныя прасторы Еўразіі. Але захаваліся легендарныя коні толькі ў нас, у палескіх балотах, бо Палессе – увогуле як бы “кансервы” усяго прыроднага і культурнага еўрапейскага свету – ад раслінных формаў да абрадавага фальклору.

Прыручэнне дзікага каня было справай надзвычай цяжкай, на яе спатрэбіліся стагоддзі. Вучоныя мяркуюць, што спачатку прыручылі асла, затым вярблюда, а толькі потым – каня. Аднак калі і дзе гэта адбылося – цяжка сказаць. І ўсё ж важкі доказ – самыя старажытныя (IV тыс. да н. э.) рытуальныя магільнікі з канём на правым беразе Дняпра – указваюць на Украіну як на месца ўтаймавання тарпана. Сёння ўжо не аспрэчваецца той гістарычны факт, што тэрыторыя Малдовы і Украіны – адна з прарадзім індаеўрапейцаў, адкуль яны рассяліліся як на захад, так (у II тыс. да н. э.) і на паўднёвы ўсход – у Іран, Індыю, прычым ужо рухаліся на конях і гналі іх перад сабою: у статках, што належылі *арыйцам* (так называлі сябе плямёны будучых індаіранцаў), коні складалі да 80 %. Гэта гаворыць пра каласальную важнасць жывёлы для тагачаснага чалавека. Але даследчыкі катэгарычна сцвярджаюць: прыручэнне каня магло адбыцца толькі ў аселых народаў. Значыць, не качэўнік асядлаў каня, а конь прывучыў чалавека качаваць, падарожнічаць, засяляць усё новыя і новыя тэрыторыі.

Вядома, што арыйцы прынеслі з сабою ў Індыю сістэму *кастаў*. Асноўных кастаў (саслоўяў) было тры (ужо ў Індыі дадалася чацвёртая). Яны адрозніваліся паводле колеру адзення і масці коней. Брахманы (жрацы) ездзілі на сівых конях, кшатрыі (ваяры) на бурых, а вайшы (пастухі, рамеснікі) на каурых (тыпу нашых *дрыкгантаў*). Адсюль робіцца зразумелай вядомая формула рускіх народных казак, якую выкарыстоўвалі героі для выклікання чароўнага каня: “Сіўка-

бурка, вешчы каурка!” Адзін казачны персанаж – цудоўны конь – увасабляў моц усіх трох кастаў, інакш кажучы, сілу ўсёй грамады! Можа, таму ён так шмат і ўмее ў казках?

Але значэнне каня і ў рэальным жыцці цяжка пераацаніць. Яго выкарыстанне літаральна змяніла ход чалавечай гісторыі. Раней кожнае племя сядзела на месцы, толькі паступова адсяляючы ад сябе маладых людзей, а калі і перасоўвалася, то на марудных быках-валах. Коні ж дазвалялі па Вялікаму Стэпу, што расцілаўся ад Алтая да Дуная, прабягаць літаральна сотні кіламетраў за лічаныя дні. Гісторыя спорта пацвярджае нашу думку: так, у 1935 г. на конях ахалтэкінскай пароды туркмены прайшлі ад Ашхабада да Масквы (4300 км) за 84 дні. Пустыню Каракумы (360 км) яны перасяклі за тры дні. Але тое рэкорды, а вось з нашай беларускай гісторыі вядома, што пасля ўзяцця полацкім князем Брачыславам (бацькам Усяслава Чарадзея) Ноўгарада (паміж Полацкам і Ноўгарадам ішла пастаянная барацьба за волакі) кіеўскі князь Яраслаў Мудры кінуўся за палачанамі і дагнаў іх на рацэ Судоме. Ад Кіева да Судомы прыблізна 800 км. А прайшлі гэты маршрут кіяўляне за сем дзён. Значыць, рабілі ў дзень кіламетраў па 110–115, прычым не па вольным стэпе, а па лясным, рачным, балоцістым краі. (Хоць Яраслаў як быццам перамог Брачыслава, але аддаў яму Віцебск і Усвяты, гарады, якія якраз і кантралявалі спрэчныя волакі.) Вядома, што коннае войска Чынгісхана таксама рухалася з неверагоднай хуткасцю. Можна меркаваць, што і старажытныя плямёны кімерыйцаў, скіфаў, аланаў, готаў дзякуючы коням лёгка перасоўваліся з Цэнтральнай Азіі ці нават Алтая ў Еўропу. Увогуле вялікая раўніна цэнтра Еўразіі ў IV–I тыс. да н. э. іграла ролю агромністага этнічнага і культурнага катла, з якога раўнамерна, праз кожныя 300–500 гадоў, выплёскваліся людскія хвалі і рассяляліся ў асноўным на Захадзе, у Еўропе, і на поўдні, у Пярэдняй і Малой Азіі. Толькі зрэдку быў адваротны рух: хоць бы тыя ж арыйцы, калі лічыць, што ў Індыю і Іран яны прыйшлі менавіта з Украіны, а не з “катла”; аднойчы з тэрыторыі сучаснай Францыі на ўсход Еўропы прыйшлі галы, утварыўшы Галіцыю; ў VI ст. і славяне – з захаду і поўдня на цяперашнюю Украіну і Беларусь (хоць можна меркаваць, што яны вярнуліся на сваю прарадзіму, прайшоўшы па крузе за некалькі тысячагоддзяў палову кантынента). Але сама магчымасць такіх вялікіх падарожжаў абумоўлена прыручэннем каня.

На жаль, з ім, відаць, звязаны і першыя сур’ёзныя войны паміж народамі. Самы вядомы з гісторыі выпадак – пагібель Троі з-за Траянскага каня. Ці не зашыфравана ў гэтым глыбокім сімвале роля

каня ўвогуле ў войнах? Сапраўднай рэвалюцыяй ў II тыс. да н. э. аказалася выкарыстанне калясніц, прычым, дзе ўзніклі яны – невядома (прыпісваюць тым жа арыйцам), але меліся літаральна ва ўсіх дзяржавах таго часу ад Егіпта да Кітая. Калясніца была цудам мастацтва, але праблема заключалася ў тым, каб сумясціць у ёй хуткасць і здольнасць да манеўру з агнявой сілай і бяспекай. Егіпецкія фараоны вырашалі задачу па-свойму, напрыклад, у баі пры Кадашы самы, бадай, вядомы з усіх фараонаў Рамсес II, прывязаўшы лейцы да пояса, вызваліў такім чынам рукі для зброі – лука, пры гэтым імчаў на лёгкіх тонканогіх (паказаны на фрэсках) конях неверагодна хутка. Яго супраціўнікі хеты пайшлі іншым шляхам: яны выкарыстоўвалі калясніцы як своеасаблівыя танкі, якія магутнай арганізаванай атакай прарывалі абарончыя лініі егіпцян, а са зброі ўжывалі не лукі, а коп'і. Цікава, што і фараон, і цар хетаў аднолькава былі ўпэўнены ў сваёй перамозе (як пазней –Брачыслаў і Яраслаў Мудры). Дарэчы, менавіта хеты ўпершыню стварылі навуковую працу – "Трактат Кікулі" – пра дрэсіроўку коней; і сёння адпаведныя спецыялісты карыстаюцца некаторымі тэрмінамі і прыёмамі выхавання, узятымі з Кікулі. Праўда, твор прысвечаны коням менавіта для калясніц [69, 98–99].

Ваяры-коннікі ўпершыню ўзніклі ў скіфаў, якія і жылі ў тых месцах, дзе прыручаны конь. Персідскі цар Дарый II у V ст. да н. э. з агромністым войскам да 700000 чалавек увайшоў ў Скіфію. Але вымушаны быў ганебна збегчы адтуль: скіфы ні разу не ўступілі з персамі ў сур'ёзны бой, але пастаянна, з неверагоднай хуткасцю, раптоўна, па-партызанску, нападалі і, не даючы ворагам ахамянуцца, так жа імгненна знікалі. Скіфы нібы зросліся з канём. Ёсць версія, што грэкі прыдумалі вобраз **кентаўра**, упершыню ўбачыўшы менавіта скіфа. Дарэчы, "скіф" – якраз грэчаская назва, а самі скіфы называлі сябе "скалотамі" – ад "кола", "каляса". Безумоўна, калясо вынайшлі задоўга да скіфаў, але хто ведае, ад якога народа менавіта яны паходзяць, і ці не іх продкі якраз калясо і прыдумалі?

Калясніцы, а пасля і кавалерыя зрабілі вайну, можна сказаць, адным з найбольш папулярных заняткаў мужчын на працягу тысячагоддзяў. Ды і феадалізм як грамадскі лад узнік тады, калі коннік аказаўся мацнейшы за дзесяць чалавек пяхоты. Таму ў еўрапейскіх мовах "кавалер" ці "рыцар", інакш кажучы, феадал і азначае "коннік". У антычную эпоху вершнік не меў асаблівых пераваг, бо, як мяркуюць даследчыкі, сучаснае сядло і вупраж узніклі прыкладна на мяжы нашай эры. Менавіта ў Заходняй Еўропе феадалы ўяўлялі вялікую небяспеку не толькі на вайне: паводле

археалагічных дадзеных, на захад ад Дуная сяляне пахалі на марудных валах і не маглі супрацьстаяць конным бандытам. А вось на ўсход ад Эльбы феадалізм усталяваўся намнога пазней, бо аратыя працавалі на мабільных конях, і кандыдаты ў рыцары пераваг перад земляробамі не мелі [50, 107].

Што да кітайцаў, якія прыдумалі свой знакаміты жывёльны каляндар, то яны заўсёды цікавіліся коньмі (хоць і не вывялі ні адной пароды), бо на паўночнай мяжы іх краіны пастаянна перасоўваліся неспакойныя мангола-цюркскія плямёны, возячы з сабою свае юрты і ганяючы незлічоныя статкі коней, вярблюдаў і авечак з гор на раўніны, і наадварот. Можна лічыць, што менавіта баронячыся ад конніцы качэўнікаў, і пабудаваў імператар Цынь Шыхуандзі Вялікую Кітайскую сцяну.

А на іншым канцы Еўразіі, мяжуючы з “варварамі”, так жа трывожыліся грэкі, але не маглі стрымаць вуснамі Гамера свайго захаплення: у “Іліядзе” і “Адысеі” ён называе траянцаў “утаймавальнікамі коней”, Фракію – “карміцелькай коней”, Фесалію – “радзімай людзей-коней”. І праўда, зусім не варварамі былі суседзі грэкаў: тыя ж скіфы стварылі багатую і гордую цывілізацыю, выхоўвалі адважных конных ваяроў, геніяльных ювеліраў і шаманаў – праважатых з дапамогай коней душ у царства памерлых. Яны ж сур’ёзна займаліся і селекцыяй коней, перадаўшы гэту навуку германскім плямёнам готаў, а праз іх – сучасным еўрапейскім народам. Цудоўнымі каняводамі, згодна Герадоту, былі і *венеды* – бясспрэчныя, як сцвярджаюць сучасныя вучоныя, продкі славян [51, 314].

Заходнія вучоныя выказваюць думку, што коні аж да позняга Сярэднявечча выкарыстоўваліся – па прычыне сваёй высокай цаны – толькі для падарожжаў і ў ваеннай справе, а не ў сельскай гаспадарцы [50, 16]. Магчыма, гэта якраз асаблівасць Заходняй Еўропы таго часу – з яе палюсамі багацця і беднасці. А вось нашы продкі пахалі на конях, і гэтым тлумачыцца дэмаграфічны ўзрыў III–II тыс. да н. э., які і даў магчымасць старажытным індаеўрапейцам рассяліцца па велізарнай тэрыторыі. Выкарыстанне каня – гэта палепшанае ў шмат разоў земляробства, а значыць, лішні харч і адпаведна рост насельніцтва. Пра тое, як высока цаніўся конь, што літаральна вызначаў і эканоміку, і палітыку архаічнай і класічнай эпох, сведчыць захаванне ў гісторыі памяці пра некаторыя з гэтых жывёлін, напрыклад, праслаўленага каня Аляксандра Македонскага Буцэфала або каня рымскага імператара Калігулы, якога ўладар зрабіў сенатарам (!).

Такім чынам, ні адна свойская жывёла не аказала такога багатага і шматстайнага ўплыву на чалавечую цывілізацыю, як конь.

Конь як міфарэлігійны сімвал у культуры еўразійскіх народаў двухаблічны: з аднаго боку, гэта вобраз гераічны, салярны, з другога – пахавальны, хтанічны.

Конь ужо ў III–II тыс. да н. э. шырока выкарыстоўваўся ў Месапатаміі, напрыклад, у палацах асірыйскіх цароў шматлікія высокамастацкія рэльефы ўвасабляюць баі на калясніцах і паляванні на конях. Але выразна сакральнае значэнне конь набывае ў індаеўрапейскіх народаў, якія яго і прыручылі. Можна лічыць, што функцыянальны і сакральны аспекты каня развіваліся паралельна. Пра тое, што гэты працэс мог адбывацца надзвычай хутка, сведчыць практыка амерыканскіх індзейцаў. Спачатку яны асцерагаліся незвычайных жывёл, якіх прывезлі з сабою іспанцы, але даволі хутка навучыліся на конях ездзіць – у многім нават лепш за еўрапейцаў. Конь адразу ўвайшоў і ў кола асабліва шануемых істот. У індзейцаў з культам каня звязаны не толькі шаманізм, асабістыя духі-апекуны, але і таямнічыя ініцыяльныя саюзы [102, 159]. І ўсё ж найперш гаворка павінна ісці пра тыя народы, якія ўтаймавалі дзікіх коней у Еўропе, – індаеўрапейцаў.

Арыйцы прынеслі ў Індыю не толькі сістэму кастаў, але і свяшчэнныя кнігі – Веды, у якіх выкладзены арыйскі пантэон. Адзін з галоўных нябесных ведыйскіх багоў **Сур'я** (Сонца) не толькі перамяшчаўся па небе на калясніцы, запрэжанай сямёркай вогненых коней, але і сам мог быць такім канём. Браты-блізняты **Ашвіны**, надзвычай функцыянальна блізкія да грэчаскіх **Дыяскураў**, кожную раніцу і вечар аб'язджалі Сусвет на калясніцы, з'яўляючыся па сутнасці ранішняй і вячэрняй зоркамі. Бог ветру **Ваю-Веюю** (у беларусаў **Падвей**) таксама імчаў на лёгкай калясніцы. Можна меркаваць, што гэта быў саслоўны, каставы бог – апякун кшатрыяў, якія свой імклівы бег на конях атаясамлівалі з ветрам. На свяшчэннай мове арыйцаў *санскрыце* "конь" – "арван". Магчыма, ад назвы каня і народ сам сябе назваў арыйскім (хоць тлумачэнняў назвы арыяў шмат).

У рэлігіі іранцаў – *зараастрызме* – космас ўяўляўся калясніцай, запрэжанай чацвёркай коней, якія ўвасаблялі чатыры натурфіласофскія стыхіі – зямлю, ваду, агонь і паветра. Калясніца робіць цыклічныя абароты, а калясніцым выступае бог часу **Зарван**. У канцы кожнага цыклу коні перастаюць слухацца Зарвана і пачынаюць біцца

паміж сабою, пакуль не перамагае адзін з іх – агонь. Тады здараецца ўсепланетная катастрофа.

У іншых індаеўрапейскіх народаў коні ў міфалогіі прадстаўлены таксама надзвычай шырока. Напрыклад, у хетаў, якія першымі з індаеўрапейцаў стварылі імперыю (на тэрыторыі сучаснай Турцыі) і першымі пачалі каваць жалеза, галоўным богам лічыўся **Пірва** (у беларусаў яму адпавядае **Пярун**), які ездзіў на белым кані. Само імя Пірва, магчыма, азначае "першы" (і ў той жа час – "агонь").

Скіфы – лепшыя ў свеце коннікі – вядуць сваё паходжанне, згодна Герадоту, ад магутнейшага грэчаскага героя **Геракла**. Аднойчы Геракл, гонячы коней **Герыёна**, апынуўся ў незаселенай тады мясцовасці каля Чорнага мора. Ён заснуў, а коні тым часам зніклі. Шукаючы іх, Геракл трапіў да **Ехідны** – хімерычнай істоты: напалову яна – надзвычай прыгожая дзяўчына, напалову – змяя. Коні аказаліся ў яе, але яна адмовілася вярнуць іх, патрабуючы ад Геракла ўвагі да сябе. Стаўшы каханкай Геракла, Ехідна праз некаторы час аддала герою яго статак. Пасля ад'езду Геракла жанчына-змяя нарадзіла трох сыноў, малодшы з якіх – **Скіф** – і стаў першапродкам скіфаў. Той жа Герадот аставіў апісанне скіфскіх хаўтур. Калі паміраў цар, скіфы забівалі пяцьдзесят лепшых яго коней і пяцьдзесят служак, затым умацоўвалі нябожчыкаў на конях: мёртвыя вершнікі на мёртвых конях неслі ахову вакол магілы цара [28, 187]. Нароўне са скіфамі такім жа магутным народам былі кельты, якія ўжо ў II тыс. да н. э. авалодалі Заходняй Еўропай, а ў канцы I ст. да н. э. – пачатку I ст. н. э. перажывалі росквіт, асабліва на Брытанскіх астравах. Духоўны свет кельтаў незвычайны і ў многім таямнічы, але міфалагічныя персанажы вывучаны добра, бо пра іх пісаў яшчэ Юлій Цэзар, а ў X–XI ст. кельцкія паданні аформілі пісьмова ў выглядзе кнігі саг ("Эдда"), дзе, дарэчы, згадваецца наш Полацк.

У кельтаў вялікай пашанай карысталіся жаночыя багіні, у прыватнасці багіня коней **Эпона**. Калі Цэзар заваяваў кельцкую Галію, рымскія легіянеры былі зачараваны вобразам Эпоны і часта ўвасаблялі яе ў выяўленчым мастацтве [28, 38]. На поўдні Англіі, на схіле крэйдавай гары каля Вэнтэджа, да нашага часу захавалася агромністае (110 м) стылізаванае адлюстраванне каня, які, магчыма, сімвалізаваў багіню [91, 11].

Дзіўна тое, што ў кельтаў, якія, відаць, захавалі многія элементы матрыярхату, нават за ваенную справу адказвала жанчына – **Маха**, якая аднойчы, цяжарная, абагнала каралеўскіх коней. Яна ж пракляла паўночнаірландскі горад Ольстэр. Ці не таму там ужо на працягу дзесяцігоддзяў цягнецца рэлігійнае супрацьстаянне, льецца

кроў – спраўджваецца пракляцце багіні? Кельты адлюстроўвалі коней на манетах, на шматлікіх высокамастацкіх вырабах з металу, у скульптуры.

Вытокі германскага свету, як і кельцкага, скіфскага, – у гарадской культуры поўдня Сярэдняй Азіі: якраз адтуль індаеўрапейскія і цюркскія нашэсці хвалямі (менавіта дзякуючы каню) накатваліся на паўночны захад Еўропы. Вярхоўны бог скандынаваў і германцаў **Одзін** (толькі нядаўна знакаміты нарвежскі падарожнік і вучоны Тур Хейердал даказаў, што Одзін паходзіць з Кубані, дзе качэўнікі спыняліся, відаць, надоўга) валодаў чорным канём **Сляпнірам**, у якога было восем ног [71, II, 456]. Савецкія даследчыкі наіўна тлумачылі шматножжа чароўнага каня імкненнем творцаў вобраза – старажытных германцаў – перадаць хуткасць. На самай справе гэта звязана, відаць, не толькі з зямной, але і з хтанічнай прыродай Сляпніра, на якім можна было падарожнічаць у іншасвет – Хель. Бог Одзін імкнецца да Сусветнага Дрэва – ясеня Ігдрасіля, на лістах якога запісаны свяшчэнныя руны – уся мудрасць свету: само імя Ігдрасіля азначае “конь Іга”, а Іг (“Жахлівы”) – адно з імёнаў Одзіна. Чаму менавіта конь, а не дрэва Іга? На нашу думку, гэта звязана з космасам (Сусветнае Дрэва – Вось Свету). На небе можна бачыць каласальную чорную пляму – туманнасць – у выглядзе галавы каня (ёсць і сузор'е – Малы Конь): якраз касмічны чорны конь, магчыма, уражваў і хваляваў старажытных людзей. У позніх германскіх паданнях Одзін стаіць на чале Дзікага палявання, у якім бог кіруе кавалькадай душ памерлых. Відаць, гэты міф і стаў штуршком для стварэння вядомай аповесці Уладзіміра Караткевіча “Дзікае паляванне караля Стаха”.

Зусім блізкія да беларусаў – балты. Іх бог грымотнік **Пяркунас** імчыць па небе ў вогненай калясніцы, запрэжанай белым, чорным і нават чырвоным коньмі. Але ў балтаў быў спецыяльны бог коней **Усіньш**. Ён едзе на дзевяці конях, або яго конь бяжыць адначасова па дзевяці дарогах. Усіньш вырошчвае і выхоўвае коней, ён сам – конь. Бачачы добрага каня, латышы ці літоўцы ўскрыкваюць: “О, Усіньш!” Дзень ушанавання балцкага бога супадае з нашым днём Святога Юр'я, калі першы раз вясною выганяюць свойскую жывёлу ў поле. У конскага бога ёсць два сыны з чырвонымі галовамі: адзін – пастух, другі – араты. Нездарма Усіньшу ахвяруюць два кавалкі хлеба і невыпадкова стрэхі дамоў упрыгожваюць з двух бакоў конскімі галовамі [28, 67]. Дзеці Усіньша нагадваюць арыйскіх Ашвінаў і грэчаскіх Дыяскураў, што гаворыць пра старажытнасць усіх гэтых вобразаў.

У літоўскіх міфах гаворыцца, што конь створаны з сонца. Сапраўды, Усіньш блізкі да сонца і шануецца як ахоўнік агню. Ён лічыцца сынам нябеснага бога **Дыяваса** (ад імя якога паходзіць і **Зеўс**). Усіньша звязваюць з залатой расой, мёдам і півам. Ён адраджаецца кожную вясну і кожны дзень. Відаць, у старажытнасці ён выступаў як бог рання, адпавядаючы егіпецкаму **Гору** ці славянскаму **Хорсу**. Ускосна пра гэта нагадвае яго імя, блізкае да латышскага aust, літоўскага austi – “днець”, лацінскага austra – “усход”. Найбагацей распрацавана міфалогія каня ў антычных грэкаў. Яшчэ даалімпійскі бог Сонца **Геліяс** імчаў па небе на чацвёрцы вогненых крылатых коней, якія ўвасаблялі чатыры бакі свету ці чатыры пары года. Толькі аднойчы Геліяс даверыў калясніцу свайму сыну **Фаэтону**, і той не справіўся з упраўленнем, ледзь не пагубіўшы зямлю, калі залішне блізка наблізіўся да яе. Сучасныя вучоныя звязваюць міф з нейкай касмічнай катастрофай, што выпаліла паверхню Зямлі: магчыма, з узрывам планеты Фаэтон, якая размешчалася паміж Марсам і Юпітэрам. Трагедыя сына Сонца прыцягвала многіх мастакоў: Леанарда да Вінчы, Мікельанджала**,** Цінтарэта, Рубенса, Пусена, у XX ст. – Пікасо. А рака Эрыдан, у якую, паводле міфа, упаў забіты маланкай Зеўса Фаэтон, гэта наша беларуская Дзвіна [3, 18].

Паэтычна-трагічны міф аб Фаэтоне нагадвае, што коні – не толькі носьбіты святла, сябры, паплечнікі людзей, – у іх шмат і іншых функцый, у тым ліку сувязь са светам памерлых. У Грэцыі кентаўры (напалову людзі, напалову коні) ігралі ролю настаўнікаў у ініцыяльных саюзах юнакоў, уводзячы апошніх у свет мужнасці і мудрасці. Міф пра кентаўра **Хірона**, настаўніка **Ахіла**, парадыгматычны. Але нагадаем, што падчас ініцыяцыі, як правіла, пакутлівай, страшнай, юнак нібы паміраў і, апрытомнеўшы, адчуваў сябе народжаным нанова. Таму конь і быў звязаны з іншасветам: ён – атрыбут падземных багоў або часам нават вобраз, які прынімала душа нябожчыка.

Хтанічныя персанажы нярэдка таксама звязаны з канём. **Мядуза**, якую перамог герой **Персей**, на некаторых малюнках прадстаўлялася з конскай галавой і крылатым целам. Ад яе і марскога бога **Пасейдона** нарадзіўся конь **Пегас**. Паходжанне Пегаса ад бога Пасейдона даказвае, што ў грэчаскай міфалогіі конь звязаны са стыхіяй вады. Само імя крылатага каня паходзіць ад слова “pegai” – марская вада. А вядома, што марскія божышчы тыпалагічна блізкія да хтанічных.

На Пегасе герой **Белерафонт** перамог пачварную **Хімеру**, затым жанчын-ваярак амазонак і паімкнуўся нават падняцца на Алімп. Багі за гэта пакаралі яго вар'яцтвам, а Пегас пачаў вазіць самога Зеўса, прычым конь прыносіў вярхоўніку перуны ды маланкі. У некаторых старажытных пісьменнікаў Пегас лічыўся канём багіні ранішняй зоркі **Эас**. Вазіў ён на сваёй спіне і дзевяць **Муз**: багіні мастацтваў любілі Пегаса за тое, што пад ударам яго капыта адкрылася цудоўная крыніца – Гіпакрэна, ад якой атрымалі натхненне многія паэты старажытнай Грэцыі. Вось чаму Пегас пачаў увасабляць творчы парыў і ўвогуле звязаны з паэзіяй.

А вось у суседзяў грэкаў – *этрускаў* – быў не адзін крылаты конь, а два. Магчыма, з імі і звязаны блізняты Ашвіны або Дыяскуры. Спачатку міфалагічныя коні – самыя гордыя істоты на свеце – былі абсалютна свабодныя: яны насіліся ад небакрая да небакрая, а часам узмывалі і ўвысь. Ды і самі багі – як Сур'я ці Усіньш – часта ператвараліся ў коней. Толькі пазней небажыхары пачалі запрагаць непакорлівых жывёл, прычым не толькі язычніцкія багі, але і хрысціянскія святыя, напрыклад, Георгі Пераможца, які відавочна звязаны з сонечным культам. Святыя і героі заўсёды ездзілі на белых конях, якія сімвалізавалі перамогу ў ярасным баі, можа быць, перамогу і над сабою, сваёй цялеснай прыродай.

Белы конь належыў і славянскаму богу **Светавіту**, чый храм знаходзіўся ў святым горадзе Арконе на востраве Руген у Балтыйскім моры. Чатырохтвары бог з высокай гары назіраў за чатырма бакамі свету і кожную ноч выязджаў на кані для барацьбы з ворагам – відаць, богам ночы **Чарнабогам**. З дапамогай боскага каня і гадалі, і прадказвалі будучае.

Архетып касмічнага каня выступае апірышчам народнага светаадчування і невычэрпным вытокам духоўных сіл. Нездарма гэты вобраз так шырока ўвайшоў у фальклор і прыгожае пісьменства.

Міфалагічныя сонцавобразы не толькі аснова народнага светаадчування – яны сталі неад'емнай часткай народнага мастацтва і паўсядзённага побыту. Конскія галовы, умацаваныя на краю страхі, як бы неслі дом у касмічную далячынь: уся кампазіцыя сімвалізавала сонечную калясніцу. Сонца прысутнічала тут жа, на франтоне, у выглядзе, напрыклад, разеткі, а конскімі галовамі ўпрыгожвалі, акрамя верху хаты, і посуд, лыжкі, іншыя прадметы; падкову вешалі на дзверы; часта коні ў стылізаваным выглядзе пазнаюцца ў арнаменце.

Але асабліва багата коні адлюстраваны ў казках. І хоць лічыцца, што казкі ствараліся на аснове міфаў, далёка не проста расшыфраваць іх складаны код. Безумоўна, могуць быць прамыя касмічныя рэмінісцэнцыі, напрыклад, у адной з польскіх казак Сонца едзе ў алмазнай калясцы, запрэжанай дванаццаццю залатагрывамі конямі (сіўкамі), што адпавядалі дванаццаці месяцам года. Такім чынам, казка заканамерна дапоўніла шматлікую нумералагічную сімволіку, характэрную для міфалагемы каня: коні ўвасаблялі трыкалор (белы, чорны, чырвоны колеры), чатыры пары года і чатыры натурфіласофскія стыхіі, сем напрамкаў свету (чатыры асноўныя плюс зеніт, надзір, цэнтр) і дзевяць нябесных сфер (у балтаў).

Аднак у большасці выпадкаў конь выступае як важнейшы персанаж казкі і часам дзейнічае нават больш актыўна і прадуктыўна, чым асноўны герой, што і робіць казку ў многім таямнічым відам слоўнай мастацкай творчасці. Але перш чым гаварыць пра ролю каня ў казках, адзначым найперш функцыю казкі як такой. Казка – звязка. Распавядаць казку – значыць ў першую чаргу звязваць, складваць словы і прадметы. Казка ўстанаўлівае шматлікія кантакты, гэта сфера камунікацый: вось чаму такое вялікае значэнне тут мае дарога, бо дарога – сувязь, сустрэчы. А дзе дарога – там конь. Праўда, у даволі значнай частцы беларускіх казак (паводле разлікаў С. Шамякінай, да чвэрці) герой падарожнічае пешшу. Значыць: або гэтыя казкі такія старажытныя, што складаліся яшчэ да прыручэння каня, або на персанажаў не ўскладваюцца тыя задачы, якія вырашаюцца з дапамогай каня. А важнейшыя з гэтых задач: змаганне героя з супраціўнікам – хтанічнай істотай (Цмокам, Змеем) і падарожжа ў іншасвет для таго, каб вярнуць з дапамогай каня найвялікшую каштоўнасць – часцей за ўсё любімую жанчыну [120, 24–30].

Конь сам, як мяркуе ізраільскі даследчык А. Галан, з хтанічнага свету, яго параджэнне: “Конь не толькі “пераносіў” памерлага на той свет. Ён, як і яго папярэднік алень, уяўляўся прадстаўніком іншасвету” [24, 49]. Вучоны звяртае ўвагу на дэманічны характар каня ў рытуалах. Сапраўды, на Купалле палешукі спальваюць у вогнішчы чэрап каня як увасабленне “відмы”, смерці. У Літве захаваліся старажытныя надмагільныя пабудовы ў выглядзе галавы каня. Літаральна ва ўсіх індаеўрапейскіх народаў конскі чэрап выступаў у якасці будаўнічай ахвяры. Але ён жа – і абярэг. У старажытнай украінскай казцы “Кобіляча голова” ў хацінку да

дзяўчыны пастукалася конская галава. Паслядоўна выконваючы ўсе просьбы галавы – аж да праходжання праз яе вушы – дзяўчына ператвараецца ў прыгажуню і набывае багацце [75, I, 119–120].

Улазіць і вылазіць праз вушы каня (радзей – каровы), у выніку чаго змяняецца выгляд і статус героя, – адзін з самых распаўсюджаных казачных матываў. Ён, магчыма, звязаны з ініцыяцыяй, якая азначала смерць і новае нараджэнне, прычым сімвалічна гэта выяўлялася ў праходжанне праз цела хтанічнай жывёлы, якою мог быць і конь: ёсць сведчанні, што на месцах ініцыяцый у лесе будаваліся хацінкі ў форме каня. Але адкуль увогуле з'явілася міфалагема памірання як праходжання праз чыё-небудзь цела – часцей змея? На нашу думку, тут іграў ролю зноў-такі салярны культ, вынік назіранняў за сонцам, якое, апусціўшыся на захадзе, павінна было ноччу прасоўвацца праз варожае для сябе асяроддзе, як праз нечае цела – доўгае, значыць, змеепадобнае (у старажытных егіпцян – праз цела змея **Апопа**). Нельга не здзівіцца з сувязі каня і змея, напрыклад, у казках **Змей Гарынавіч** ездзіць на чароўным кані, які папярэджвае пачвару пра небяспеку з боку героя-волата, а ў Харватыі цара змеяў называюць Kacji Konj ("змяіны конь") [100, II, 591].

Хтанічную прыроду каня адзначаюць шматлікія даследчыкі. У казках яна пацвярджаецца праз шматлікія элементы апавядальнай структуры, напрыклад, тое месца, дзе знаходзіць герой багатырскага каня: у гары, у склепе ці пячоры, прыкаванага на дванаццаці ланцугах; часам герою дорыць каня яго памерлы бацька з магілы (успомнім, што скіфаў хавалі разам з коньмі). Вядомы расійскі даследчык фальклору У. Проп звярнуў увагу на тое, што ў некаторых дэталях казка захоўвае больш архаічныя рысы, чым грэчаская рэлігія. У казцы каня дае мярцвяк, у антычнай міфалогіі даруюць коней заўсёды ўжо багі [86, 173 ]. У. Проп мае на ўвазе, што культ продкаў больш старажытны, чым пантэон. Гэта сапраўды так. Тым і каштоўныя казкі: яны данеслі да нашага часу тыя вераванні, якія яшчэ не склаліся ў застылыя персаніфікацыі, але тым не менш выявіліся ў складанай сістэме сімвалаў. Галоўная наша думка: конь адыгрывае важнейшую ролю ў цыкле смерць – адраджэнне – несмяротнасць. Звычайна даследчыкі прыводзяць некалькі іншую формулу: нараджэнне – смерць – новае нараджэнне. Мы ж акцэнтуем увагу на несмяротнасці – вечнасці. Прычым у прасторы казкі ні адзін з трох названых элементаў не можа быць экстрапаліраваны і разгледжаны ў адрыве ад астатніх – інакш перавернецца сістэма каштоўнасцей. Толькі маючы на ўвазе гэту ўмову, функцыя каня ў

якасці салярнай і хтанічнай, трыумфальнай і пахавальнай, божаскай і бясоўскай жывёлы не будзе супярэчыць сама сабе.

Такім чынам, герой атрымоўвае каня з магілы. Вельмі часта конь белы – гэта азначае, што ён страціў цялеснасць (на такім кані ездзіць у Апакаліпсісу сама смерць). І А. Галан, і У. Проп лічаць белага каня душой нябожчыка. Значыць, конь даруецца бацькам, і конь, як можна меркаваць, – сам бацька (яго душа): герой падароджнічае на ўласным бацьку, таму і атрымоўвае ад каня дапамогу (у егіпецкай рэлігіі ад ужо мёртвага **Асірыса** нараджаецца бог ранішняга сонца **Гор**) [120, 34–36]. Але прынцып міфалагічнага мыслення абавязкова патрабуе супрацьлеглай якасці-функцыі: конь звязаны не толькі з мінулым, але і з будучым, часта або сам прарочыць, або ўдзельнічае ў прадказаннях. У сербскім эпасе вешчы конь прадказвае смерць свайму гаспадару Марку Кралевічу. У “Аповесці мінулых гадоў” (пад 912 годам) жрэц-вяшчун прадказвае смерць князю Алегу ад каня, і князь вымушаны адмовіцца ад жывёлы-сябра; праз шмат гадоў Алег смяецца над прароцтвам, наступаючы на чэрап свайго каня, але з таго выпаўзае змяя і кусае Алега, ад чаго той паміраe (зноў сувязь змяі і каня). З пазнейшай гісторыі вядома, што ў Пскове загінуў конь Івана Грознага, і жорсткі цар, убачыўшы ў гэтым знак-пагрозу ўласнаму жыццю, нават адмовіўся ад пакарання псковічаў. У казках конь заўсёды папярэджвае героя пра небяспеку і дае парады, як дасягнуць жаданага.

Такім чынам, з канём нездарма звязаны круг, калясніца: ён замыкае сабою кола часу. Адсюль натуральная сувязь з вечнасцю, несмяротнасцю. Акрамя таго, неабходна памятаць, што міфалагізаваны конь мае дачыненне і да сонца, і да апраметнай. Сонца і пекла самі звязаны паміж сабою непарыўна. Конь – атрыбут сонца (ці само сонца): ён з’яўляецца сувязным паміж нашым светам і іншасветам па той прычыне, што так падарожнічае сонца – і па небе, і пад зямлёю. Трыдзесятае царства ў казках – вобласць выпрабаванняў і трансмутацый, смерці і ўваскрэсення. У многіх казках герой – аналаг сонцу, у іншасвеце ён павінен набыць новае цела і новую душу, веданне імёнаў і таемнай мовы, здольнасць перамяшчацца ў паветры і валодаць агнём, знаходзіць тых, хто апынуўся ў іншасвеце (маці, жонку, сястру) і вяртаць іх у свет жывых. Вось гэта, бадай, самая таямнічая функцыя жанру! Казкі – рэшткі нейкіх далёкіх-далёкіх цудаў, у якія сам апавядальнік ужо не верыць, але па якіх моцна, пакутліва сумуе – інакш казкі не дажылі б да нашага часу. Сапраўды, калі герой ці яго конь (гэта можа быць адно і тое ж – успомнім **Сур’ю**), – Сонца, то зразумела, чаму ён вяртаецца з

апраметнай: сонца кожную раніцу нязменна ўстае над далягладам (англійскае "horse" – "конь" адпавядае славянскаму богу ранішняга сонца **Хорсу**). Але што сімвалізуе тая жанчына, з якою разам вяртаецца герой? Уласную яго душу, якую можна набыць, узбагаціць, ачысціць, зрабіць несмяротнай толькі падчас цяжкіх выпрабаванняў? Ці гэты вобраз мае адносіны да нейкага касмічнага аб'екту? (Поўні?) Але часам герой вяртаецца з трыдзесятага царства са здабытым там канём (ён – вышэйшая каштоўнасць), якога якраз і можна разглядаць як душу героя – тут выбудоўваецца па-міфалагічнаму стромкі ланцуг: герой – душа – конь – сонца. Магчыма, вобраз каханай (ці маці) героя у казках – гэта сімвал нейкага вышэйшага стану чалавечага існавання, які, згодна платонікам, не смерць, але адрозніваецца і ад жыцця ў нашым звыклым разуменні – таму дзеянне і адбываецца ў іншасвеце? (Гэты стан – каханне ці нешта іншае?) А можа быць, бег каня ў казках – гэта палёт думкі, якая вяртаецца з найвялікшай каштоўнасцю – новым вобразам, новым разуменнем свету, спасціжэннем сутнасці, прыхаванай прыроды рэчаў? Нездарма ў Кітаі крылаты конь носіць на спіне Кнігу Закона. Вось чаму ён і быў узяты з Задыяк. Такім чынам, з казачным канём звязана мноства пытанняў.

## АВЕЧКА

Задыяк – слова грэчаскае, яго літаральны пераклад – "кола жывёл". Але больш дакладнае і сімвалічна больш правільнае значэнне слова "задыяк" – "кола (пояс) жыцця". У гэтым паняцці заключаны глыбокі сэнс. Задыяк – спрадвечны шлях Сонца, Месяца і планет, з якімі непарыўна звязана ўсё жыццё Зямлі ў цэлым і кожнай жывой істоты паасобку. Розныя народы набліжалі Задыяк таксама і да вобразу вялікай і свяшчэннай Нябеснай дарогі: кітайцы, напрыклад, называлі яго Жоўтай дарогай, а вавілонцы – Дарогай Сонца. Сузор'і Задыяка нібы ўвабралі ў сябе ўсю гісторыю чалавецтва і яго культурнае багацце. Старажытная сімволіка Задыяка настолькі цесна пераплецена з міфалагічнымі, рэлігійнымі сістэмамі, з мастацкімі традыцыямі, філасофскімі поглядамі і акультнымі ведамі розных народаў, што яго з поўным правам можна назваць касмічным люстэркам, якое адлюстравала ў сабе культуру чалавецтва.

Раннія хрысціяне верылі, што Бог стварыў свет і надаў рух нябесным сферам з іх свяціламі вясною, калі Сонца знаходзіцца ў сузор'і Авена. Таму, хоць Задыяк – круг, у якім няма ні пачатку ні канца, лік задыякальных сузор'яў пачынаюць з Авена: ён – першы

сярод містычна-нябесных жывёл. Менавіта па гэтай прычыне Авен – адзін з астральных сімвалаў Хрыста, якога называюць Агнец Божы. У першыя вякі хрысціянства Вялікдзень святкаваўся не толькі як Уваскрэсенне Бога, але і як веснавое Стварэнне Свету, пра што гаварыў і Кірыла Тураўскі ў сваіх словах-казаннях.

У эпоху Антычнасці, калі грэчаская навука афармлялася ў дэфініцыях і тэрмінах, увабраўшы ў сябе ўвесь эзатэрычны вопыт Усходу і Захаду, кропка веснавога раўнадзенства знаходзілася ў знаку Авена, а менавіта яе павольнае прасоўванне вызначае прэцэсіяльны рух – галоўны прынцып нябеснай механікі. Гэта значыць, што вучоныя Антычнасці, як задоўга да іх егіпцяне, індусы, вавілонцы і кітайцы, цудоўна ведалі пра *прэцэсію*, у выніку якой Зорны Глобус робіць поўны круг за 25920 год. Каб ведаць і ўлічваць прэцэсію – важнейшы для Зямлі нябесны закон, неабходна было назіраць неба як мінімум пяцьдзесят тысяч гадоў, – і гэта адно з самых неаправержных сведчанняў існавання Чалавечай Цывілізацыі задоўга да пачатку яе афіцыйнай гісторыі.

Пра Стварэнне Свету менавіта вясною пісалі пісьменнікі-геніі, што валодалі, безумоўна, і нейкімі патаемнымі ведамі: Дантэ ў “Божаскай камедыі” (XIII ст.), Фірдоусі ў “Шах-Намэ” (XI ст.), Джэфры Чосер у “Кентэрберыйскіх аповядах” (XIV ст.).

Платон у сваім вядомым дыялогу “Цімей” паведамляе, што Дэміург з дзвюх першасутнасцей – нейкіх касмічных рэчываў – склаў нешта кшталту літары Х – касога крыжа. У многіх старажытных арнаментах канцы такога знака закручваліся падобна рогаў барана, напрыклад, у іанічных капітэлях калонаў антычнага архітэктурнага стылю. У хетаў такі ж іерогліф з’яўляўся сімвалам неба. Ён генетычна звязаны з егіпецкім іерогліфам, што азначаў таксама неба, пастаўленае на слупы. Знак барана наверсе калоны – сімвал Сусветнага Дрэва, вяршыня якога падтрымлівае неба. Такім чынам, двухвалютная капітэль іанічнай калоны сімвалічна азначае Неба, або Свет, створаны пад знакам святога барана – Авена.

“У Егіпце лічылі, што вобраз Авена прымае сам бог Сонца Амон. Яго малявалі чалавекам з авечай галавой. У час свята Сонца пад раніцу, калі Авен падымаўся над гарызонтам, з самага старажытнага храма Амона – Карнакскага – выносілі статую боства. Людзі лічылі, што ў гэты дзень яно выказвае сваю волю” [115, 112]. І сёння да храма Карнака падводзіць велічная алея сфінксаў з галовамі баранаў. Увогуле ж, на нашу думку, уся *эзатэрыка*, звязаная з Авенам, прыйшла ў Грэцыю з Егіпта, спадкаемцы нейкай архаічнай і намнога больш развітай, атлантычнай ці азіяцкай, цывілізацыі. У

эпоху егіпецкага Новага Царства **Амон-Ра** ў вобразе барана атрымаў надзвычай шырокае распаўсюджанне (яно і зразумела, паколькі Сонца ў гэты перыяд падчас веснавога раўнадзенства знаходзілася менавіта ў знаку Авена). Так, адзін толькі фараон Рамсес III загадаў пабудаваць шэсцьдзесят пяць храмаў у гонар Амона-Ра. Іншыя багі, напрыклад, **Хнум**, таксама мелі галавы баранаў.

У 332 г. да н. э., калі Аляксандр Македонскі высадзіўся ў Егіпце, аракул Амона абвясціў македонскага цара сынам бога, таму Аляксандр сваёй эмблемай выбраў два рогі барана – як галоўныя атрыбуты Амона. Вось чаму ў Азіі Аляксандра называлі Іскандэр Двурогі [20, 220]. Праўда, рагатыя галаўныя ўборы ўпрыгожвалі шмат якіх багоў, напрыклад, у асірыйцаў менавіта рагатая тыяра з’яўлялася найбольш характэрным божаскім атрыбутам. Семіцкі **Баал-Баал-Бел** (адпаведны нашаму **Вялесу**, або **Белабогу**) адлюстраваны ў скульптуры з выразнымі рогамі барана [40, 132].

На думку вядомага англійскага даследчыка сербскага паходжання Захарыі Сітчына, слова “амінь” (“амен”), што заключае кожнае хрысціянскае маленне, паходзіць ад імені бога Амона [99, 50]. У яго гонар названа і сталіца Іарданіі Аман, і хімічнае рэчыва аміяк, і выкапневыя малюскі аманіты з ракавінай, закручанай быццам баранаў рог, і Амонаў рог – звіліна ў чалавечым мозгу, у якой гняздзіцца памяць.

Паводле многіх старажытных вераванняў, Стварэнне Свету адбылося пасля таго, як Вярхоўная Істота прынесла ў ахвяру нейкую іншую істоту, закалоўшы яе нажом, спаліўшы на вогнішчы ці разрубіўшы на часткі. З частак цела ахвярнай жывёлы і ўтвараўся свет. Архетып гэты надзвычай старажытны і трывалы, занатаваны глыбока ў падсвядомасці; ён заснаваны на аб’ектыўным крузеператварэнняў рэчыва, калі кожны матэрыяльны аб’ект фактычна ахвяруе сабою дзеля таго, каб рух жыцця не перарываўся: мінералы аддаюць сябе раслінам, расліны – жывёлам, жывёлы – чалавеку, а чалавек, безумоўна, Богу. У гэтым – значэнне вядомай міфалагемы са Старога Запавету, калі Аўраам прыносіць у ахвяру свайго сына Ісаака, хоць непасрэдна на алтары Бог замяняе чалавека на баранчыка. Некаторыя даследчыкі ўпэўнены, што згаданая біблейская прыпавесць і сімвалізуе пачатак эры Авена ў касмічнай гісторыі Зямлі [70, 43].

Незадоўга да нараджэння Хрыста кропка веснавога раўнадзенства перайшла ў сузор’е Рыб, але значэнне Авена, як да таго значэнне Цялка, і звязанай з касмічным знакам рэальнай жывёлы не

стала меншым: за тысячу дзвесце шэсцьдзесят год яны трывала ўвайшлі ў гісторыю культуры.

Грэкі яшчэ ў ІІ тыс. да н. э. склалі надзвычай прыгожы міф пра арганаўтаў, што падарожнічалі за Залатым руном. Руно, безумоўна, мае сувязь з сонцам, бо плыць за ім неабходна было да сына Сонца **Ээта** ў Калхіду (цяперашняя Абхазія), а яна, па словах англійскага даследчыка і пісьменніка Р. Грэйвса, з'яўляецца самай далёкай з вядомых грэкам краін на Усходзе [25, 435]. Тлумачэнне даволі наіўнае: Каўказ меў, відаць, іншы сэнс, пра які сёння мы і не здагадваемся (нездарма на Каўказе быў прыкуты **Праметей** і да каўказскай гары Арарат прыбіла каўчэг **Ноя**), а Руно – не толькі Сонца-Авен, сонца, што пачало сабою новую касмічную эру, але і нешта патаемнае і надзвычай каштоўнае: як мы ўжо пісалі, верагодна, руны – свяшчэнныя веды. Магчыма, рунамі былі занатаваны звесткі якраз пра пэўныя касмічныя працэсы, бо можна амаль не сумнявацца, што быкі, на якіх **Ясон** араў поле, – сімвал папярэдняй касмічнай эры Цялка, а дракон, што сцеражэ Руно, – сузор'е Дракона, размешчанае акурат у цэнтры неба, на полюсе экліптыкі. Верагодна, дракон, што "скруціўся ў тысячу кольцаў", увасабляе тое самае касмічнае кола, па якім рухаецца Сонца і ўся Сонечная сістэма ў сваім прэцэсійным рухе.

У некаторых краінах, напрыклад, у Велікабрытаніі, Ордэн Залатога Руна і сёння – самы ганаровы. Ім адзначаюць не проста прафесіяналаў у нейкай сферы, часцей за ўсё эканамічнай ці палітычнай, а, можна сказаць, "жрацоў", пасвячоных, тых, хто вызначае напрамак развіцця той самай эканомікі ці, тым больш, ідэалогіі, хто, інакш кажучы, кіруе масамі. Не выпадкова Авен – першы знак задыяку – у традыцыйнай медыцыне адпавядае галаве. Яшчэ адно нарашчэнне сэнсу – у дачыненні якраз да чалавека, ўзнагароджанага ордэнам, – "галава" дзяржавы.

Авечка мае дачыненне і да іншых багоў. Мусульманская культура ў многім літаральна "авечая". У Дагестане нарадзіўся баранчык, на спіне якога выразна відаць слова "Алах" (Паведамленне па тэлевізійнай праграме ОНТ 20. 10. 2002 г.).

У Індыі адзін з самых шануемых багоў – **Агні** – ўвасабляўся ў баранчыка або ездзіў на ім. Дарэчы, і імя Агні блізкае да "агнец". Больш за тое, Агні (агонь) сам быў у некаторым сэнсе і крыжом, бо ўяўленне пра бога злівалася з уяўленнем пра тое прыстасаванне, з дапамогай якога жрацы распальвалі ахвяравальны агонь. Прыстасаванне ўяўляла сабою дзве перакрыжаваныя палачкі, адну з якіх круцілі да таго часу, пакуль уся канструкцыя не загаралася. У

містэрыях некаторых народаў, напрыклад, фрыгійцаў, да свяшчэннага дрэва ў сакральную ноч веснавога раўнадзенства нават падвешвалі баранчыка. Тут сувязь паміж вялікодным ахвяравальным агнцам і раскрыжаваннем Ісуса асабліва відавочная і асязальная.

Крыж у звязцы з нябесным агнём – Сонцам – ёсць і на небе. Кожны год вясною Сонца перасоўваецца з паўднёвага нябеснага паўшар'я ў паўночнае, праходзячы адзін з нябесных крыжоў – кропку веснавога раўнадзенства: перасячэнне экліптыкі з нябесным экватарам. Гэты пераход і ёсць сапраўдны Вялікдзень, або яўрэйская Пасха. Сапраўды, з вобразамі задыякальнага Авена звязаны і іўдзейская Пасха, і хрысціянскі Вялікдзень, і Новы год (Наўруз) у большасці мусульманскіх народаў. Вось чаму авечка (баранчык) была лепшай ахвярай Богу – пра гэта неаднаразова згадваецца ў Бібліі і ў Каране. У многіх еўрапейскіх народаў (чэхаў, славакаў, балгар) захавалася традыцыя на Вялікдзень абавязкова мець на святочным стале баранчыка – можна нават з цукру ці крэма, а не сапраўднага, – важны сімвал.

Такім чынам, разуменне Хрыста як "Агнца Божага" мае безумоўную касмічную прыроду, пра што сведчаць многія факты з культуры старажытных народаў.

Аналіз кодаў, звязаных з той жывёлай, што сімвалізуе год, не можа абысціся без пошуку падстаў уключэння той ці іншай істоты ў вавілонска-антычнае задыякальнае кола або ў кітайскі жывёльны каляндар. Сапраўды, з Авенам звязана знаходжанне кропкі веснавога раўнадзенства ў пэўную гістарычную эпоху, якая пачалася прыблізна за 1260 год да н. э., і па гэтай прычыне Авен з'яўляецца першым знакам Задыяка. Але ж самі знакі атрымалі назвы намнога раней, і вось тут узнікае пытанне: чаму з тысяч розных жывёл людзі выбралі менавіта гэтыя дванаццаць? Чаму мыш, а не прыгожанькая вавёрка, чаму свіння, а не магутны насарог, чаму авечка, а не ганарлівы алень у кітайскім календары, або чаму рак, скарпіён – не вельмі прыемныя істоты – у грэчаскім задыяку? Зразумець гэта – значыць спасцігнуць логіку і светаадчуванне нашых старажытных продкаў.

Адно з тлумачэнняў ляжыць, як быццам, на паверхні: самі абрысы пэўных сузор'яў мелі падабенства да тых ці іншых жывёл. Але, па-першае, канфігурацыя зорак таксама мяняецца (якраз у выніку прэцэсіі), па-другое, бачанне тых ці іншых віртуальных істот на небе усё ж рэч вельмі суб'ектыўная – як прымусіць паверыць у яе ўвесь народ?

Што ні ўзяць у якасці дапушчэння, гэта абавязкова будзе фармальнае тлумачэнне, бо для нас недасягальна галоўнае – *цэласнасць міфа*, на аснове якога і называліся сузор'і.

Стоячы на пазіцыі зноў-такі прымітыўна-рацыянальнай, можна меркаваць, што задыякальнымі сузор'ямі сталі татэмы найбольш магутных і ўплывовых плямён пэўных рэгіёнаў Азіі. Аднак вядома, што мядзведзь быў татэмам вялікага народа *ся* [96, 263], імем якога нават названы адзін з перыядаў гісторыі Кітая [54, 34], тым не менш мядзведзь не ўваходзіць у задыякальнае кола кітайскага календара.

Звычайна матэрыялісты, выхаваныя на марксісцкай філасофіі, заклікаюць зыходзіць з рэальных якасцей і функцыянальнай ролі адпаведнай жывёлы. З гэтага пункту гледжання, самыя істотныя біялагічныя асаблівасці авечкі наступныя: пластычнасць, статкавая форма існавання, спажыванне танных кармоў, рухомасць і цягавітасць, плоднасць і хуткаспеласць, слабое развіццё вышэйшай нярвовай сістэмы, тонкае рэагаванне на стрэсавыя фактары [56, 107]. У гэтай характарыстыцы адразу адчуваецца позірк гаспадарнікаў, зацікаўленых толькі прыбыткам і абсалютна раўнадушных да той істоты, якую яны бяруцца разводзіць. Бо, сапраўды, як можа сумяшчацца слабое развіццё вышэйшай нярвовай сістэмы і ў той жа час схільнасць да стрэсаў?

Нашы продкі больш уважліва ставіліся да паводзін і характару жывёл, з якімі побач жылі. Нездарма жывёлы так шырока ўключаны ў культурны кантэкст, па-рознаму і надзвычай багата выяўлены ў мастацтве, найбольш часта выступаюць у выглядзе глыбокіх і шматзначных *сімвалаў*. А сімвал заўсёды бачыць ў аб'екце нешта самае істотнае, важнае, сутнаснае, выяўляе фундаментальную сувязь розных формаў і з'яў прыроды паміж сабою. Паводле тэорыі сімвалаў, авечка ў Кітаі – жыццё ў адзіноце; у хрысціянстве авечкі – вернікі Хрыста, што ўспрынялі словы Яго апосталаў [63, 221]. На касмалагічным узроўні авечкі – традыцыйны сімвал касмічных сіл, што выяўляюць стан, прамежкавы паміж хаосам і ўпарадкаванасцю [53, 352]. У беларускім фальклоры авечкі – зорачкі, а Месяц – іх пастух: гэты матыў своеасабліва злучыў хрысціянскае ўяўленне пра Ісуса – добрага пастара і рэшткі старажытнай астралагічнай навукі. Беларускі вобраз дапамагае зразумець вобраз кітайскі: часцей за ўсё жывуць у адзіноце пастухі, нездарма Месяц – заўсёды адзін.

Ёсць меркаванне, што авечка – другая жывёла пасля сабаку, прыручаная чалавекам. Адбылося гэта, безумоўна, не ў эпоху мезаліту, як пішуць энцыклапедыі (гэта значыць, шэсць-восем тысяч год таму),

а мінімум на парадак раней. Ва ўсялякім разе, сустракалася ў друку сведчанне, што на тэрыторыі Ірана знойдзена паселішча палеалітычных людзей, якому дванаццаць тысяч гадоў, і ў ім – велізарная колькасць костак авечак. У гаспадарцы авечка, безумоўна, надзвычай эканамічная свойская жывёла: патрабуе няшмат дагляду, а дае мяса, малако, поўсць, шкуру. Цэлыя цывілізацыі былі заснаваны на развядзенні авечак, напрыклад, цюркская, семіцкая, мангольская. У выніку на сённяшні дзень існуе сто пяцьдзесят парод авечак [1, 322]. Такая вялікая колькасць – якраз, на нашу думку, сведчанне даўнасці прыручэння жывёлы. Спецыялісты-біёлагі, дарэчы, гавораць пра былую, вельмі старажытную, родавую сувязь барана і казла; вось чаму і год 2003, а таксама 2015 – не толькі гады авечкі, але і казы.

*Этрускі*, якіх сёння ўсё часцей называюць першапродкамі не толькі рымлян, але і славян (паўднёвых), гадалі пра будучае па костках жывёл, у прыватнасці, па лапатцы барана, прычым працэнт угадвання быў надзвычай высокі. Да нас дайшла таксама бронзавая мадэль авечай печані з Пьячэнцы, раздзеленай на шаснаццаць зон з імёнамі багоў, што адказваюць за розныя прыродныя стыхіі і часткі цела, органы чалавека. Этрускі вынеслі навуку (менавіта навуку) *гекатаскапію* з Усходу, дзе (на тэрыторыі Месапатаміі) знойдзена каля чатырохсот такога кшталту мадэляў печані. Вядома, што перад нейкай палітычнай падзеяй ці прыродным катаклізмам печань авечкі ў пэўным месцы набывала некаторую фізіялагічную анамалію, і ўжо справай жрацоў, якія вучыліся па бронзавых мадэлях, было вызначыць, што ж павінна адбыцца [77, 180–184]. Падобная магічная практыка, якая патрабавала бясспрэчнага, хоць і вельмі своеасаблівага, прафесіяналізму, значыць, дакладнага ведання аб'екту, таксама дае падставы лічыць авечку найбольш рана прыручанай з усіх свойскіх жывёл. Яе шматфункцыянальнасць пачала атаясамлівацца – згодна цэласнасці міфалагічнага мыслення – з шматфункцыянальнасцю агню, а агонь – брат Сонца. Уласна, сонца – і ёсць агонь (плазма). Таму гадавы рух сонца і аказаўся часткова звязаны з ціхай, рахманай жывёлай.

Астролагі гавораць, што сузор'е Авена сімвалізуе перамогу розуму над стыхійнымі сіламі [17, 418]. Ці не знак гэта памяці пра прыручэнне дзікага барана муфлона, а значыць, утаймаванне чалавечым розумам стыхійных сіл прыроды? Але зноў-такі – тлумачэнне залішне прыземленае.

Звычайна астролагі выводзяць характар чалавека з размяшчэння зорак, сузор'яў, планет на небе. Так, Сімяон Полацкі, які, з'яўляючыся праваслаўным светаром, патаемна цікавіўся

астралогіяй, прадказаў у складзеным ім гараскопу неўтаймаваны тэмперамент і незвычайны лёс будучага цара Пятра I. А раптам усё наадварот: прасочаныя на працягу стагоддзяў заканамернасці нараджэння людзей з пэўнымі рысамі характару, блізкімі да нораву той ці іншай жывёлы, пачалі праецыравацца на тую вобласць неба, якая каляндарна "адказвала" за іх нараджэнне, таму адпаведна яе і назвалі? Напрыклад, людзі Авена моцныя і прамадушныя; для іх характэрны прыхаваныя душэўныя сілы, узроўні яшчэ нявыяўленых ведаў, уменне абстрагавана паглядзець на ўсе феномены свету [6, 281]. Праўда, цяжка заўважыць усё гэта ў канкрэтнай жывёліне – авечцы, але гэта нам – цяжка, а людзі мінулага ўмелі больш глыбока спасцігаць сутнасць рэчаў і іх сувязі паміж сабою. У астралогіі, як бы да яе ні ставіцца, найбольш яскрава выявіўся універсальны прынцып узаемадзеяння макра- і мікракосмасу. Па гэтай прычыне і ў мастацтве авечка (баран) увасоблены надзвычай шырока.

У эпоху палеаліту скульптурныя і графічныя адлюстраванні барана на сцянах пячор складаюць прыблізна 7% ад агульнай колькасці выяўленых жывёл. У гістарычную эпоху вобраз барана ў розных формах найбольш часта сустракаецца ў качавых народаў Еўразіі. Так, адна з самых старажытных архітэктурных формаў, што захавалася і да нашага часу, – юрта – па канструкцыя геніяльна простая і рацыянальная. Але, хоць яе планіроўка ўяўляе сабою адзінае архітэктурна-мастацкае цэлае, яна ўмоўна раздзелена на выразныя функцыянальныя зоны, якія вызначаюць і арганізоўваюць рытм будзённага жыцця людзей. Зоны якраз адпавядаюць дваннацацігадоваму цыклу "жывёльнага календара", або ўсходняму Задыяку. У прыватнасці, зона авечкі – адразу каля ўвахода злева, тут захоўваецца верхняе адзенне.

Юрта – жыллё без вуглоў і фактычна без мэблі, таму важнейшае значэнне ў яе ўбранні маюць дываны, кошмы, посцілкі, Ды і сама юрта зроблена з лямцу, скачанага з поўсці авечак. Адна з самых характэрных рыс ткацтва ў манголаў, казахаў, кіргізаў, іншых народаў Сярэдняй і Цэнтральнай Азіі, – арнамент у выглядзе стылізаваных рагоў барана [42, 80–86]. Для беларусаў такога кшталту арнамент нехарактэрны, што гаворыць пра мінімальны ўдзел цюркскіх народаў у нашым этнагенезе. Хоць авечка з'явілася на тэрыторыі Беларусі больш за тысячу гадоў таму [127, I, 22].

На самай архаічнай (эпохі неаліту) кераміцы Кітая, дзе і ўзнік жывёльны Задыяк, выявы барана сустракаюцца неаднаразова, але ў пазнейшы час, у эпоху Шан, калі тут выраблялася лепшая ў свеце

бронза, баран як дэкаратыўны элемент у посуду з'яўляецца рэдка, намнога часцей – дракон, фенікс, тыгр, алень [84, 68–86].

Алені з золата – найбольш часты вобраз і ў вырабах так званага скіфскага жывёльнага стылю. Але прысутнічаюць у скіфаў сярод шматлікіх прадстаўнікоў фаўны і авечкі. Найбольш яскравыя прыклады – залатыя пектаралі (нагруднае ўпрыгожанне), знойдзеныя ў скіфскіх курганах. Так, у пектаралі, адкапанай у 1868 г. у кургане Вялікая Блізніца на Таманскім паўвостраве, элегантныя козачкі і баранчыкі пасуцца сярод кветак і пальметак, акантаваных двума залатымі скрутамі [32, 11]. Яшчэ больш вытанчаную пектараль знайшлі на Украіне ў царскім кургане Тоўстая Магіла ў 1971 г. Тры ярусы гэтага шэдэўра ювелірнага мастацтва перадаюць міфалагічна-філасофскую мадэль свету. Пасярэдзіне верхняга яруса, што адлюстроўвае жыццё людзей, два мужчыны шыюць са шкуры барана кажух, а побач хлопцы дояць авечак [72, 19–20]. Надзвычай складаная кампазіцыя, выключна-мастацкая па сваёй пластыцы, мае, безумоўна, сімвалічнае, яшчэ не разгаданае, значэнне.

У сучаснай Украіне, для якой характэрна надзвычай багатая па формах і размалёўцы кераміка, шырокай папулярнасцю карыстаецца паліўны посуд у выглядзе тоўсценькіх прысадзістых баранчыкаў. Традыцыя такіх вырабаў ідзе, як даказаў акадэмік Б. Рыбакоў, яшчэ з Трыполля (V–IV тыс. да н. э.) [94, 154].

У Антычнай Грэцыі на востраве Дэлас, дзе нарадзіліся багі-блізняты **Апалон** і **Артэміда**, знаходзіўся велізарны алтар з назвай Кератон, поўнасцю складзены з рогаў баранаў, казлоў, быкоў [20, 218]. Сама назва Кератон неяк суадносіцца са словам “карона”. Падобна на тое, што першымі каронамі багоў, а пасля цароў, былі менавіта рогі. У антычным вазапісу і фрэсках Авен прадстаўлены даволі шырока. Так, у разбураным вывяржэннем Везувія (79 г. н. э.) горадзе Геркуланум нядрэнна захавалася фрэска на сюжэт “Фрыкс на залатарунным Авене імкнецца выратаваць сястру Гелу з глыбінь мора” [61, 179]. Менавіта **Фрыкс** даставіў у Калхіду Залатога Авена, руно якога падараваў цару **Ээту**.

У касмічную эру Авена авечка, баранчык (асабліва белыя, значыць, найчысцейшыя) – самая жаданая ахвяра для багоў. Таму ў розных міфалагічных сістэмах паступова складваецца аднатыповы вобраз жывёлы, для якой характэрны незласлівасць, рахманасць, безабароннасць, мяккасць, пасіўнасць, цярплівасць, прастата, пяшчота, любоў, ахвярнасць. Найбольш ярка-вобразна гэтыя рысы авечкі ўвасобіў слынны грэчаскі байкапісец Эзоп (VI ст.да н.э.) – сам у

юнацтве пастух – у сваіх надзвычай глыбокіх прыпавесцях, напрыклад, “Воўк і ягня”.

Праўда, розныя міфалогіі раздзяляюць біялагічны від паводле полавай прыкметы: мужчынскай (баран) і жаночай (авечка). Баран увасабляў сабою плоднасць і сувязь з сонцам, але часам ён надзелены і адмоўнымі рысамі, у прыватнасці, глупствам. Вядомая байка Кандрата Крапівы “Дыпламаваны баран” геніяльная таму, што абапіраецца якраз на міфалагізаваны архетып. У вобразе авечкі падкрэсліваюцца рысы нявіннасці, пяшчоты, безабароннасці (невыпадкова для сатанінскага вопыту сучаснай навукі – кланіравання – была выбрана менавіта авечка). Тыя ж рысы яшчэ больш выразна выяўлены ў маленькім ягняці. “Нявіннае ягня” – часта гавораць пра ціхага, залішне сціплага і пасіўнага чалавека; у апошні час усё часцей гавораць з іроніяй, забываючыся, што ягня (агнец) – сімвал Выратавальніка і Ахвяра выкуплення.

“Статкам дурных баранаў” лічаць сучасны электарат (так называюць цяпер народ) расійскія ўлады і буржуазныя СМІ, якія якраз сваімі фенаменальна нізкімі па якасці матэрыяламі і дэбілізуюць насельніцтва. У сваёй пагардзе да простага чалавека яны неарыгінальныя: скажона-прымітыўна паўтараюць думку нямецкага філосафа Ф. Ніцшэ, які большасць людзей называў бязмозглымі авечкамі, што паслухмяна падпарадкоўваюцца пастуху – звышчалавеку. На жаль, думка вар’ята (і пры гэтым геніяльнага мысляра) трывала вызначыла сацыяльную псіхалогію XX і пачатку XXI стагоддзяў. Але з’явілася і контрідэя. У модным рамане сучаснага бразільскага пісьменніка Паула Коэльо “Алхімік” герой-пастух Санцьяга ў пошуках свайго жыццёвага прызначэння шмат што зразумеў,назіраючы паводзіны менавіта авечак: яны валодаюць асаблівай мудрасцю, заўсёды знаходзячы – толькі дзякуючы сваёй інтуіцыі – усё, што ім патрэбна, – ежу, начлег, супакаенне. Так і чалавек, давяраючы не розуму, а сваёй інтуіцыі, пойдзе менавіта па тым Шляху, які прызначаны яму лёсам. Аўтар гаворыць, што авечкі навучылі героя мове, якая “зразумелая ўсім, мове, на якой гаворыць Сусвет” [59, 98]. Між іншым, пастух Эзоп, назіраючы, здавалася б, прымітыўных жывёл (ён пасвіў таксама авечак), ужо ў маленстве выхопліваў назіральным вокам важныя для яго дэталі. Геніяльнасць яго заключаецца ў тым, што ён пісаў кароткія творы з доўгім, амаль невычарпальным, зместам, умеючы ва ўсім бачыць дасціпную аналогію.

Біблейскі Давід, будучы цар, заснавальнік ізраільскай дзяржавы, таксама ў юнацтве быў пастухом – як і ўсе першапродкі

яўрэйскага народа. Таму вельмі часта яны прадстаўлены ў акружэнні авечак ці з ягняткамі на руках. Так, у мазаіках знакамітай візантыйскай царквы Святога Віталя ў Равене (VI ст.) на першым плане сцэны "Тройца" каля стала, за якім сядзяць тры анёлы, стаіць ягня, аглядаючыся на гасціннага Аўраама: жывёлінка нібы нагадвае, што яго сын як ахвяра Богу быў некалі заменены баранчыкам, і з таго моманту пачалася новая эпоха ў гісторыі чалавецтва. У мініяцюры IX ст. з Парыжскай Псалтыры на тэму "Давід спявае псалмы" Давід абкружаны авечкамі і козамі [65, 63, 113].

На партале знакамітага Шартскага сабора ў Францыі Іаан Хрысціцель паўстае з авечкай на руках: магчыма, гэта сімвал яго ўласнага ахвяравання ці, хутчэй за ўсё, згадка пра тое, што ён першы назваў Хрыста Агнцам [108, 214]. Авечкі амаль заўсёды прысутнічаюць у тэме "Звеставання пастухам" (напрыклад, у малюнку вядомага рускага мастака XIX ст. Аляксандра Іванова "Яўленне анёла, што паведамляе пастухам пра нараджэнне Хрыста" [30, 39]) і ў віфлеемскіх сцэнах: "Нараджэнне Хрыста", "Святая сям'я", "Пакланенне волхваў" (напрыклад, фрэска вялікага Джота "Пакланенне" [74, 18]). Авечка – бадай самая папулярная жывёла ў хрысціянскім мастацтве. Часам Агнец алегарычна заменены воблакам, напрыклад, у геніяльнай "Сікстынскай мадоне" Рафаэля, якую так любіў наш Максім Багдановіч.

Агнец як сімвал Хрыста – адзін з улюбёных і найбольш частых вобразаў на працягу ўсяго існавання хрысціянскага мастацтва. Ён абумоўлены словамі таго ж Іаана Хрысціцеля, які, бачачы Хрыста, што ішоў да яго, прамовіў: "Вось Агнец Божы, які бярэ на сябе грэх свету" [Іаан, 1:29]. Хрыстос Збавіцель у вобразе Добрага Пастара (з ягняці на плячах) часта сустракаецца ў мастацтве ранняга хрысціянства (у прыватнасці, катакомбным), але ў мастацтве эпохі Адраджэння ён выкарыстоўваецца рэдка. Праўда, Рэнесанс больш складана інтэрпрэтуе тэму. Напрыклад, буйнейшы нідэрландскі жывапісец XV ст. Ян ван Эйк у грандыёзным Генцкім алтары пяць ніжніх створак поўнасцю прысвяціў галоўнай тэме алтара – "Пакланенне Агнцу". Тут паўстае шырокая панарама, персанажы якой, здаецца, прадстаўляюць увесь зямны свет, а ў цэнтры на ўзвышэнні – Залаты Агнец з німбам [41, 130].

Свецкі варыянт тэмы пастухоўства – так званая *пастараль* у музыцы, выяўленчым мастацтве і ў паэзіі, якой аддаў даніну і Сімяон Полацкі ("Беседы пастускія"). Геніяльны рускі паэт Сяргей Ясенін свядома ствараў сабе імідж пастушка, бо менавіта пастухі першымі даведаліся пра нараджэнне Бога. У карціне мастака-сімваліста

Усевалада Барысава-Мусатава “Дафніс і Хлоя” (1901 г.) – паводле аднаго з самых вядомых у свеце антычных пастаральных раманаў – любоўная сцэна (а пастараль – і ёсць паказ кахання на ўлонні прыроды) адбываецца ў акружэнні авечага статка [125, 67]. Авечкі – абавязкова элемент *ідылічнага пейзажу*, пачынаючы з мастацтва *барока*.

З казачных матываў, звязаных з баранам, толькі нямногія, на думку аўтараў энцыклапедыі “Мифы народов мира”, захоўваюць сувязь з міфалогіяй (напрыклад, здабыча баранам ці казлом агня, ператварэнне героя ў барана); большая частка матываў мае дачыненне да тэмы садружнасці жывёл (баран і казёл, баран і кот, баран і птушка, дванаццаці баранаў і г. д.), да тэмы барана і ваўка [71, II, 238]. Аднак тут, як здаецца, заключана памылка, выкліканая неразуменнем самой сутнасці казак, у якіх усе сюжэты і матывы – наскрозь міфалагічныя, а таму алегарычны сэнс прысутнічае, на нашу думку, і ў казках пра садружнасць жывёл. Магчыма, тут маюцца на ўвазе стасункі сацыяльных груп, кастаў-варнаў, выяўленыя праз вобразы татэмных жывёл, або, хутчэй за ўсё, яны маюць касмаганічны сэнс, бо сузор'і ў далёкія часы ў нашых продкаў называліся інакш; захаваліся ж з іх нямногія – той жа Авен, а іншыя назвы засталіся ў казках ды загадках.

Пра глыбіню сімвалізму, заключанага ў традыцыйным матыву, сведчыць актуальнасць невялікай казкі беларускага пісьменніка Змітрака Бяспалага “Як воўк авечкай прыкідваўся”: яе можна з поўным аснаваннем прыкласці да ўзаемаадносін, скажам, некаторых расійскіх алігархаў. Сюжэт казкі наступны: воўк, апрануўшыся ў авечую скуру (“воўк у авечай скуры” – не толькі матыў казак і баек, але нават маўленчы крылаты выраз), каб пахарчавацца баранінай, сам робіцца, знаходзячыся ў авечым статку, ахвярай іншага – больш моцнага і нахабнага ваўка, ды яшчэ і ад пастуха атрымоўвае кіём па спіне [44, 64–65]. Сюжэт, сапраўды, павучальны.

У народнай культуры – павер'ях, прыкметах, замовах – авечка сустракаецца даволі часта. Напрыклад, у Англіі, пачатак капіталізму ў якой нават звязаны з авечкамі (“агароджванне”), лічыцца ўдачай, калі, адпраўляючыся ў далёкі шлях, сустракаеш авечы статак. Або, каб шанцавала ў жыцці, неабходна насіць з сабою маленькую костачку з авечай галавы. Для вылечвання дзіцяці яго праводзілі праз авечы статак, прычым абавязкова на світанні [126, 294] (натуральна, бо авечка звязана з сонцам, яго энергіяй, гаючай сілай – **Т. Ш.**).

На той падставе, што велікоднае ягня – сакральная ежа, нельга абмінуць тэмы барана як харчу. На святы беларусы выпякалі

абаранкі (ад “баран”) і казулі (ад “казы”), што імітавалі закручаныя рогі ці абрысы жывёл. Звычайна аўтары кніг па беларускай кулінарыі прыводзяць не больш дзесяці-дваццаці рацэптаў нацыянальных страў з бараніны [36, 30–32]. На самай справе іх, безумоўна, намнога больш, хоць бараніна ўсё ж не вельмі спалучаецца са славянскімі традыцыямі – кіслай капустай, салёнымі агуркамі, бульбай. Ды і запіваць бараніну неабходна не гарэлкай, а гарачай зялёнай гарбатай ці халодным чырвоным віном, што таксама ў нас не вельмі прынята. І ўсё ж ёсць прыемныя выключэнні – папулярныя плоў і шашлык. Праўда, плоў мы так і не навучыліся гатаваць: атрымоўваецца проста каша з мясам. А вось шашлыкі трывала ўвайшлі ў побыт гарадскога насельніцтва, асабліва калі яно выязджае на прыроду. Прычым гатуем па-свойму, а не па-каўказку. Грузіны марынуюць мяса ў гранатавым соку, а мы – у воцаце, цыбулі, перцы. Але часта і бараніну, якая ўсё яшчэ застаецца некаторай экзотыкай, замяняем на банальную, але такую родную, свініну. Пытанне харчовых прыхільнасцей – надзвычай важнае ў вызначэнні этнічнай самасвядомасці. Сістэма харчавання беларусаў будавалася на перавазе раслiннай (вегетарыянскай) ежы, хоць больш каштоўнымі і заўсёды прэстыжнымі лічыліся мясныя стравы. І ўсё ж не бараніна. Нават на Вялікдзень у нас пераважала свініна. Падставы для гэтага сур’ёзныя. На нашу думку, беларусы пераважна паходзяць з еўразійскага (індаеўрапейскага) суперэтнасу, сямейныя роды якога спрадвек займаліся апрацоўкай зямлі і развядзеннем свіней, быкоў, кароў, пазней коней. Рэліктавыя ж перыферыйныя прадэтнасы – заўсёды збіральнікі, а не вытворцы, і разводзілі авечак і коз, даглядаць якіх намнога лягчэй, чым пералічаных вышэй жывёл. Безумоўна, у гістарычны час шмат якія этнасы перамяшаліся паміж сабою, але традыцыі, якім – многія тысячагоддзі, адчуваюцца і па сёння. Таму і важна час ад часу ўглядацца ў пэўныя культурныя з’явы (а свойская жывёла – таксама такая з’ява), каб вяртацца да нашых спрадвечных традыцый.

## МАЛПА

Цікавасць сучасных беларусаў і ўвогуле еўрапейцаў да жывёльнага ўсходняга календара адпавядае нейкім важным псіхалагічным запатрабаванням белага чалавека. Магчыма, імкненню да экзотыкі, а з другога боку, тузе па прыродзе, адчуванню неабходнасці большай блізкасці да яе. І тут не мае значэння, што некаторыя жывёлы ў Еўропе і, у прыватнасці, у Беларусі не водзяцца. Чалавек XXI ст. валодае дастатковай інфармацыяй пра тую ж малпу.

Наша задача з гэтай прычыны – даць звесткі не зусім вядомыя і, галоўнае, цікавыя і карысныя для разваг адукаваных людзей.

На тэму паходжання чалавека ад малпы ёсць такі гумарыстычны афарызм: “Чалавек ганарыцца сваімі продкамі, а малпа – нашчадкамі”. Дарвіністы па-ранейшаму трымаюць людзей пад прыгнётам гэтай – на першы погляд навуковай – ісціны, хоць яна супярэчыць Бібліі і прыніжае чалавека як вянца Тварэння. Праўда, раней вучоныя бачылі найбольшую блізкасць чалавека да шымпанзе, а сёння знайшлі іншага “родзіча” – малпу баноба, што жыве ў Заіры. У гэтага віда доўгія прамыя ногі, высокі лоб, маленькія вушы і вусны ружовага, як у чалавека, колеру; баноба лёгка навучаюцца, міралюбівыя, не любяць шуму, паважаюць сваіх самак і амаль ва ўсім падпарадкоўваюцца ім [105, 18]. І, як заўсёды, галоўны “аргумент” – ідэнтычнасць генаў чалавека і баноба – аж 98 % . Але ў ката і чалавека таксама амаль падобныя гены. Відаць, ва ўсіх жывых істот на Зямлі большасць генаў аднолькавыя, а генетыкі хаваюць ад шырокай публікі гэты факт, не тлумачаць яго. Як сведчаць самыя сучасныя доследы нямецкіх вучоных, больш важным аказваецца не аднолькавасць генаў, а асаблівы працэс у клетцы, які называецца *сплайсінг*, – ён прынцыпова адрознівае чалавека ад малпы [67, 2–14].

Калі і з’яўляюцца навуковыя даныя, што супярэчаць дарвінізму, яны носяць ускосны і некалькі двухсэнсоўны характар. Так, у паўднёваафрыканскім навуковым часопісе “Джорнал оф сайенс” з’явіўся артыкул вучонага-палеантолага Р. Кларка, які вывучаў знаходкі аўстралапітэкаў, знойдзеныя ў паўднёваафрыканскіх пячорах у Стэркфонтэйне. Ён лічыць, што продак сучаснага чалавека аўстралапітэк сышоў з дрэва і... адразу пачаў крочыць прамой паходкай на двух нагах, а не на суставах пальцаў, як гэта робяць чалавекападобныя малпы. Адсюль робіцца выснова, што мы з малпамі не родныя браты, а стрыечныя, але ўсё роўна, і продкі чалавека, выходзіць, жылі на дрэвах.

Спрабуючы даказаць, што эвалюцыя адбывалася менавіта паводле Ч. Дарвіна, антраполагі ідуць нават на падробкі і фальсіфікацыі, як ужо неаднаразова здаралася з рэшткамі так званых першабытных людзей. Вучоныя дамовіліся паміж сабою, што пераходнае звяно паміж малпай і чалавекам з’явілася ў Афрыцы, як гаварыў Дарвін, і з таго часу падганяюць пад названую тэорыю ўсе знаходкі (ды і самі знаходкі цяжка ідэнтыфікаваць). Між тым, незразумела, чаму ўвогуле малпы ці продкі чалавека сыходзілі з дрэў, дзе ім было вельмі зручна і бяспечна, а сышоўшы, сталі на дзве нагі ў той час, калі чатырохногі бег лёгкі, хуткі і выкарыстоўваецца ўсімі

наземнымі малпамі? У чым прычына страты людзьмі поўсці на целе, бо нават у тропіках па начах холадна, і ўсе малпы захоўваюць поўсць, а вось на галаве ў іх доўгія валасы, наадварот, у адрозненне ад чалавека, не растуць? Ёсць пытанні і наконт костак, біцэпсаў, зубоў, барады, але вучоныя даюць адказы на іх настолькі наіўныя, што нават у філолагаў яны выклікаюць іранічную ўсмешку, бо супярэчаць не толькі навуцы, але і здароваму сэнсу.

Ужо даўно варта ўнушаць дзецям у школах, што людзі паходзяць ад *людзей*, як і даводзіцца ў Бібліі. Больш за тое, магчыма, і малпы паходзяць ад людзей, як сцвярджае рускі вучоны А. Бялоў у сваёй кнізе “Антрапалагічны дэтэктыў” [10, 281–302]. У выніку пагаршэння прыродных умоў некаторыя папуляцыі людзей дэградавалі, здзічэлі і ператварыліся ў малпаў. На жаль, дэградацыя паўсюдна і заўсёды ідзе намнога хутчэй, чым эвалюцыя.

Доказам паходжання менавіта малпы ад чалавека з’яўляецца падобнасць толькі што народжаных немаўлят чалавекападобных малпаў да дзяцей. У Інданезіі махляры карысталіся гэтым і прадавалі маленькіх арангутангаў (галілі рыжанькую поўсць і абсыпалі цельца талькам) пад выглядам чалавечых дзяцей замежным бяздзетным сем’ям. Ёсць і ўласна любіцелі экзотыкі, упэўненыя, што з малпы можна выгадаваць чалавека. Сапраўды, у дзіцячым узросце арангутангі лёгка прывучаюцца чысціць зубы, есці лыжкай за сталом, самастойна апранацца і глядзець тэлевізар. Але ў дарослых малпаў усе культурныя навыкі амаль цалкам страчваюцца; былі нават выпадкі, і даволі частыя, нападу дарослых арангутангаў на сваіх прыёмных бацькоў. Адбыўся адваротны працэс ператварэння ў жывёлу. Ды і ўвогуле чалавекападобныя малпы зусім не бяскрыўдныя. Нямецкі (чэшскага паходжання) вучоны-заолаг, даследчык дзікіх жывёл, прапагандыст аховы прыроды, аўтар больш як дваццаці кніг Бергнард Гржымек пісаў, як у Афрыцы гарылы забівалі пігмеяў. Праўда, і пігмеі, помсцячы, палявалі на гарылаў [26, 206].

Усе беспаспяховыя імкненні навучыць малпаў гаварыць, хадзіць на двух нагах, чысціць зубы прадыктаваны не высакароднай мэтай ачалавечыць жывёлу, а хутчэй жаданнем даказаць нам усім, што мы паходзім ад малпаў, а таму няма чаго ад чалавека чакаць нейкіх высокіх парыванняў духу. Але доказы дарвіністаў на цяперашні наш розум не вытрымліваюць крытыкі. Такія ж бесперспектыўныя імкненні зрабіць гібрыд чалавека і малпы. Сапраўды, малпы найбольш блізкія да чалавека па свайму генатыпу. Але пераадолець міжвідавы бар’ер зусім няпроста. Ды і навошта гэта рабіць?

Усё сказанае вышэй не пярэчыць меркаванню аб неабходнасці вывучэння малпаў і іх рэакцый на розныя з’явы, іх спосабы арганізацыі статку, бо гэта дапамагае разабрацца і ў чалавечай свядомасці, у псіхалогіі, скажам, натоўпу. Для навукі ўсе жывёлы і, бясспрэчна, малпы – найкаштоўнейшы аб’ект. Не дзіва, што яны першымі за чалавека ляталі і ў Космас. У ЗША запускалі агідных мух, мышэй і менавіта малпаў, а ў СССР – высакародных сабак. Першым сярод малпаў здзейсніў пазапланетнае падарожжа шымпанзе Хэм, запушчаны амерыканцамі ў 1961 годзе ў ракеце “Меркуры”. У 1969 г. малпа Боні пасля палёту на арбіту загінула. І тады кангрэс ЗША забараніў касмічныя эксперыменты з прыматамі. У СССР малпы пачалі лятаць у 1989 г., калі ўжо стала правілам ва ўсім арыентавацца на ЗША (“сіндром малпы”) – нават калі ў самой Амерыцы з’ява перастала існаваць. Ад шымпанзе ў Савецкім Саюзе адмовіліся, бо яны залішне вялікія і менш устойлівыя да ўздзеяння неспрыяльных фактараў. Таму ляталі толькі макакі-рэзусы; імёны ім давалі па алфавіце, прычым прыдумвалі імёны дзеці супрацоўнікаў расійскага касмадрома Плясецк [81, 3–5].

Сёння ў Новай Зеландыі прынятый закон, які прыроўнівае правы чалавекападобных малпаў да правоў чалавека. Забаронена праводзіць над імі навуковыя эксперыменты, і ў заапарках іх павінны трымаць ў вялікіх вальерах за шклом, а не за кратамі. Здавалася б, такі закон павінен выклікаць толькі іронію. Наадварот. У Англіі, напрыклад, прапанавалі зрабіць закон сусветным і пашырыць яго на ўсіх малпаў. Па вялікаму рахунку, падобнага кшталту закон варта было б распаўсюдзіць на ўсіх без выключэння жывёл: усе іх віды маюць права на абарону, шанаванне і любоў ужо хоць бы таму, што чалавек у XX–XXI стагоддзях аказаўся намнога мацнейшы за іх, заваладаў планетай, спаганіў яе сваёй індустрыяй і пазбавіў шмат якія істоты іх звыклага асяроддзя. А з другога боку, новазеландская ініцыятыва міжволі прымушае задумацца аб нашым уласным лёсе. Ці не тое ж чакае нас – усіх, хто не мае дачынення да “залатога мільярду”: шмат дэмагагічнай гаворкі пра “правы чалавека”, а жыць прыдзецца фактычна, як у заапарку, – толькі без кратаў...

Малпы – цёплалюбівыя істоты, і распаўсюджаны яны галоўным чынам у краінах з трапічным кліматам. У Індыі іх больш за шэсьдзесят мільёнаў – у асноўным макакі-рэзусы. Менавіта малпы як бы помсцяць чалавеку за пашкоджаную ім прыроду. Яны пастаянна псуюць ураджай на палях, у садах ды агародах, рабуюць склады, часта забіраюцца ў жылыя дамы, крадуць рэчы, дробных хатніх жывёл і нават дзяцей. У аповесці-казцы Рэд’ярда Кіплінга “Маўглі” ўсе

звяры ў джунглях жывуць у добрай згодзе паміж сабою, акрамя малпаў, – яны супрацьстаяць жывёльнай грамадзе сваім нахабствам і нежаданнем падпарадкоўвацца лясным законам. Але “Маўглі” – твор пра Індыю, створаны заходнім чалавекам. У самой Індыі малпы – свяшчэнныя істоты. Можна меркаваць, што піітэт да жывёл, якія ў бытавым плане наносяць людзям толькі шкоду, абумоўлены велізарнай папулярнасцю ў народзе літаратурнага эпасу “Рамаяна”, у якім галоўнаму герою **Раму** ў пераадоленні ліха і вяртанні любімай жонкі **Сіты** дапамагаў цар малпаў **Сугрыва**. Цар даў у памочнікі царэвічу свайго галоўнага дарадчыка і міністра – наймудрэйшага з малпаў **Ханумана**, сына бога вятроў **Ваю**. Цікава, што хоць дзеянне “Рамаяны” адбываецца на індыйскай глебе, але напачатку войска малпаў павінна было шукаць Сіту на поўначы. Сугрыва даволі маляўніча апісвае маючы адбыцца паход: спачатку неабходна пераадолець вобласць цемры (рэгіён палярнай ночы), за якою пасярод Акіяна знаходзіцца Царства Святла з залатой гарой Меру пасярэдзіне. Праўда, войска ўсё ж адправілася на поўдзень, бо, як высветлілася, злы дракон **Равана** аднёс Сіту ў сваю дзяржаву – на востраў Ланкі (цяперашні Цэйлон). Па дарозе да войска малпаў далучыліся і мядзведзі. Прайшоўшы праз усю Індыю, звяры ўсе разам дайшлі да акіяна. Здавалася, пераадолець яго немагчыма. Але аказалася, што Хануман умее лятаць хутчэй за думку. У адно імгненне ён апынуўся на востраве ў садзе Раваны, дзе сумавала Сіта, і паабяцаў ёй хуткае вызваленне. Вырваўшы з карэннямі дрэвы ў садзе, ён, бегаючы па гораду, сваім хвастом паджог усе дамы і знік, перш чым дэманы здолелі нешта зразумець. Урэшце малпы дапамаглі Раму перакінуць каменны мост праз мора да вострава Ланкі (сапраўды існуючы Адамаў Мост) і перамагчы пачвараў [29, 108].

У іншым нацыянальным эпасе Індыі “Махабхараце”, які распавядае пра барацьбу за ўладу над краінай двух кланаў стрыечных братоў Каўраваў і Пандаваў, таксама дзейнічае Хануман – ужо як цар малпаў. Прычым ён валодае чароўнай уласцівасцю амаль неабмежавана павялічваць памеры свайго цела. Асаблівасць даволі нечаканая і не сустракаецца ў іншых літаратурных эпапеях ды казках. Хануман дапамог Пандавам, і тыя перамаглі. Хануман (натуральна, яго адлюстраванне) заўсёды дапамагаў і дапамагае ўсім бяздзетным жанчынам Індыі, якія мараць зацяжарыць. Не толькі ў Індыі – і ў іншых краінах малпа сімвалізуе сексуальнасць.

З “малпавай” лініі індыйскіх эпасаў сёння выводзяць розныя тэорыі. Напрыклад, пра паходжанне старажытнай арыйскай цывілізацыі з Поўначы, з легендарнай Гіпербарэі. Вялі суайчыннікаў у

Індыю праз Сібір Рама разам з Хануманам. І вось ужо вядомы індыйскі гуру (настаўнік) і рышы (мысляр) Сацья Саі Баба паведамляе расійскім паломнікам пра сваё містычнае бачанне каля вёскі Акунёва Омскай вобласці глыбока пад зямлёю руінаў старажытнага храма Ханумана. Сапраўды, раён вёскі Акунёва незвычайны: увесь час тут назіраюцца таямнічыя свячэнні, слупы святла, шаравыя маланкі. Ясна, што ўсе гэта звязана з глыбіннымі разломамі зямной кары: планета тут скідвае як бы лішак сваёй энергіі. Але чаму месца аказваецца вядомым індыйскаму філосафу і чаму яно тычыцца Ханумана? [90, 357–362]

У Індыі Ханумана называюць "алмазным целам" і звязваюць з ім мастацтва ёгі. Адсюль можна зрабіць выснову, што ў вобразе Ханумана ўвасоблены прадстаўнік нейкай іншай чалавечай расы, іншага віду homo sapiens, які некалі існаваў на Зямлі, і, безумоўна, іншай цывілізацыі – хутчэй за ўсё не тэхнічнай, а біялагічнай, што развівала не прылады працы, а магчымасці самога чалавека (змяненне малекулярнай структуры цела, уменне лятаць, практыка ёгі).

У горадзе Айодхі – адным з сямі свяшчэнных цэнтраў усіх індуістаў, бо тут нарадзіўся Рама, – знаходзіцца і храм пад назвай "Цытадэль Ханумана". Сваімі вежамі і высокімі сцянамі храм сапраўы нагадвае крэпасць. Паводле падання, храм стаіць на месцы палаца, у якім выхоўваўся Рама, а потым жыў разам з Сітай. У храме размешчаны шматлікія скульптуры Рамы, Сіты і Ханумана. Адна са скульптураў апошняга ўпрыгожана агромністым сапфірам. Вакол храма – сапраўдны горад малпаў. Храм, памяшканні і парк вакол яго кожную раніцу акуратна мыюць, але ўжо вечарам усё настолькі забруджана малпамі, што людзям прайсці немагчыма [29, 98].

У Індыі мноства храмаў, вакол якіх жывуць малпы, – і ў гарадах, і ў вёсках. Часта гэта – цэлыя комплексы з палацамі і басейнамі, дзе малпы – адзіныя насельнікі і поўныя гаспадары. Насельніцтва краіны клапоціцца пра жывёл, але малпы ставяцца да людзей непрыязнена – кідаюць у іх арэхамі, каштанамі, палкамі. Дзякуючы Хануману малпы – свяшчэнныя жывёлы. І ўсё ж малпа не шануецца ў той ступені, як карова, якую індусы літаральна абагаўляюць, – не шануецца, бясспрэчна, з-за свайго дрэннага характару і варожасці да чалавека.

Пра паходжанне малпаў розныя народы распавядаюць дзіўныя рэчы. Напрыклад, у народаў Тыбета і ў бушменаў Афрыкі распаўсюджаны легенды пра малпаў як здзічэлых нашчадкаў канібалаў. У афрыканскага народа бамбуці існуе павер'е, што

шымпанзе – старажытнае племя людзей, выгнаных іншымі плямёнамі ў лес за свой злосны нораў і здзічэлых там. Ды і розум прыматаў значна перабольшаны. Ім, бясспрэчна, далёка да дэльфінаў, а таксама, на нашу думку, да сланоў.

Тым не менш у фальклоры шмат якіх народаў малпа паўстае разумнай і знаходлівай істотай, напрыклад, у японскай казцы “Печань жывой малпы”. Дзіўна, што і ў эфіопскім фальклоры ёсць падобны сюжэт (казка “Малпа і бегемот”), толькі тут для вылечвання марской істоты (у японцаў дачкі дракона, у эфіопаў жонкі бегемота) патрабавалася не печань, а сэрца малпы. А ў індыйскай казцы сэрца малпы павінен прынесці сваёй жонцы дэльфін. Падабенства матываў здзіўляючае. Магчыма, яно звязана якраз з памяццю пра былы канібалізм некаторых груп людзей, якія і ўвасоблены ў вобразе малпы. У згаданых казках сюжэт будуецца на жаданні іншых жывёл з'есці малпу ці яе органы. Яна спачатку паддаецца на падман, але потым усіх нязменна абдурвае. У амхарскіх (эфіопскіх) казках звяртаецца ўвага не толькі на хітрасць малпаў, але і на іх пастаяннае жаданне ўсіх сварыць паміж сабою.

Цэйлонская казка “Малпа і царэвіч Брыдош” сюжэтна поўнасцю адпавядае еўрапейскай “Кот у ботах”, толькі прыродныя і бытавыя рэаліі, натуральна, іншыя. Цікава, што такі ж сюжэт ёсць і ў кітайцаў, але там герою дапамагае ліса. Хто ж у каго запазычыў? На нашу думку, дадзены сюжэт, як і папярэдні, узнік у Індыі – сусветным генератары фальклорных матываў.

У храме першага сёгуна (ваеннага уладара Японіі) Такугавы ў горадзе Ніко ўсіх наведвальнікаў нязменна прыцягваюць тры драўляныя скульптуры малпаў з закрытымі вачамі, вушамі і ротам. Яны азначаюць: “Не бачу дрэннага, не чую дрэннага, на гавару пра дрэннае”. Спачатку пад гэтымі вобразамі разумеліся разведчыкі, пасланыя багамі, каб атрымаць звесткі пра чалавечыя ўчынкі. У далейшым у Японіі малпа пачала азначаць свядомае ўхіленне ад ліха, мудрую асцярожнасць [43, 52]. У заходняй традыцыі, наадварот, яна ж увасабляе дапытлівасць і балбатлівасць. Праўда, тут адрозніваюць проста малпу і малпу чалавекападобную. Апошняя – свавольніца, ганарліўка, блазан. У хрысціянстве малпа нязменна паўстае ў адмоўным свеце і сімвалізуе хітрасць, пажаднасць, грэх, непрыстойнасць, легкадумнасць, любоў да раскошы, нават д'ябла (паводле аналогіі: антыпод Бога – д'ябал, антыпод чалавека – малпа).

Ва ўсіх народаў Еўропы малпа ў тэорыі сімвалаў яшчэ з эпохі Антычнасці ўвасабляе бессаромнасць, нахабства, зласлівасць, ніжэйшыя інстынкты. На ўсіх творах жывапісу яна паўстае як

карыкатура на чалавека і ў той жа час як жывёла. Часта мастакі яе прадстаўлялі з яблыкам у зубах, што сімвалізавала грэхападзенне **Адама** ды **Евы**, а пазней у больш гумарыстычным плане як адлюстраванне мастака-эпігона [63, 219–220].

Пошук аналогій у сімвалізму, параўнанні розных нацыянальных традыцый адносна жывёл паглыбляюць сэнсавае напаўненне кожнага з вобразаў ўсходняга задыяку, больш пэўна акрэсліваюць месца той ці іншай жывёлы ў сімвалічнай карціне свету і, бясспрэчна, дабаўляюць нюансы да разумення свядомасці самога чалавека. Сімвалізм кожнай жывёлы адлюстроўвае свет прыхаваных інстынктаў, падсвядомыя глыбіні псіхікі. Мы дазволім сабе выказаць думку, што кожная жывёла – адпаведны пласт, узровень структуры несвядомага ў чалавечым мозгу.

У кітайскай традыцыі малпа – увасабленне знешняй непрыгажосці, махлярства, ніжэйшых сіл, неўсвядомленай актыўнасці [53, 344]. Чаму ж у такім выпадку яна ўключана ў Задыякальнае кола? Можна меркаваць, што ў вобразе – падобна вобразам многіх іншых міфалагічных істот – спалучаюцца два аспекты. З аднаго боку, неўсвядомленая сіла – небяспечная, бо накіравана на разбурэнне, з другога – часам дабратворная, калі нечаканая. Вось чаму ў Кітаі тая ж малпа можа забяспечыць моцнае здароўе, поспех і абарону. Гэтым яна падобная да некаторых славянскіх міфалагічных персанажаў, напрыклад, дамавіка. У цэлым на Усходзе сімволіка гэтай жывёлы супярэчлівая. Яна ўвасабляе як станоўчыя, так і адмоўныя бакі чалавечых паводзін. Інакш кажучы, вобраз амбівалентны.

У Старажытным Егіпце малпаў цанілі: негры з поўдня Нубіі аддавалі магутнай егіпецкай імперыі павіянаў як даніну. Малпам прыпісвалі здольнасць разумець чалавечую гаворку. Дзіўна, што хоць егіпецкі бог **Тот** звычайна ўяўляўся чалавекападобным з галавой ібіса, на малюнках яго зрэдку можна бачыць і ў выглядзе павіяна, які сядзіць за спіною пісара і назірае за яго работай.

У старажытнамексіканскіх культурах малпа таксама, як ў Кітаі, з’ўлялася каляндарным сімвалам. Лічылася яна богам танца. Характэрна, што ў альмекаў малпа, як і бог Хануман у Індыі, мела адносіны да ветру. У працэсе перыядычных катаклізмаў, пра якія маляўніча распавядалі старажытнамексіканскія міфы, Другая Эра (або эра Ветравога Сонца) завяршылася страшэннымі бурамі і патопам. Людзі той эпохі ператварыліся ў малпаў. На нашу думку, гэта сімвал чалавечай дэградацыі.

Цікава, што беларускае слова “малпа” не мае адпаведнасцей у іншых індаеўрапейскіх мовах, хіба толькі ў англійскай – “ape” [113, I,

584]. Калі выводзіць этымалогію з уласнай мовы і лічыць слова кампазітумам, то тут нельга не ўбачыць марфему "мал" ("малы") і марфему "па" ("маленькі тата"). Калі ж прыняць версію пра агульнасць паходжання беларускага слова і англійскага, можна зрабіць выснову, што малпа была вядомая яшчэ кельтам, якія ўдзельнічалі ў нашым этнагенезе і, прайшоўшы па Еўропе, спыніліся на Брытанскіх астравах.

Вобраз малпы ў прыгожым пісьменстве не вызначаецца асаблівай разнастайнасцю. Вылучаецца навела нямецкага пісьменніка-казачніка пачатку XIX ст. Вільгельма Гаўфа "Малады англічанін", дзе ў гофманскім духу аўтар здзекуецца з буржуазнага пошлага грамадства, для якога ўзорам арыстакратызму і дасканаласці стаў апрануты па-чалавечы арангутанг, прыняты за англічаніна. Вобраз малпы цікавы ў дзіцячай літаратуры: "Таямнічы востраў" Жуль Верна, "Чараўнік Ізумруднага горада" Аляксандра Волкава, "Доктар Айбаліт" Карнея Чукоўскага, "38 папугаяў" Георгія Осцера. Як ужо адзначалася, у маленькіх малпаў і маленькіх дзяцей ёсць нешта падобнае. У беларускай літаратуры жывёла не карыстаецца асаблівай павагай.

Матывы надзвычайнай велічыні малпаў або сяброўства чалавека ды малпы, або эксперыментаў над малпамі актыўна эксплуатуюцца ў сучасным кінамастацтве – дастаткова назваць сусветна вядомых "Тарзана" і "Кінг-Конга", або "Магутнага Джо Янга", або "Планету малпаў", або савецкую выдатнейшую камедыю "Паласаты рэйс". Больш шырока за малпаў у кіно прадстаўлены, бадай што, толькі ваўкі ды сабакі. Яно і справядліва: усё ж сабака, а не малпа дзесяткі тысяч гадоў пражыў побач з чалавекам, дзяліў з ім радасць і гора, сябраваў з ім і дапамагаў яму. Сабаку і большая пашана.

## ПЕВЕНЬ

Певень з'яўляецца адзіным прадстаўніком птушынага царства ва ўсходнім жывёльным календары.

Людзі здаўна абагаўлялі птушак, бо назіралі іх пераважна над сабою, у паветранай стыхіі, у небе, якое заўсёды звязвалася з багамі. Але птушкі не маглі не здзіўляць нашых продкаў і па іншых падставах. Пазванковыя, як і жывёлы, птушкі маюць дзве нагі, чым прынцыпова адрозніваюцца ад жывёл. У іх развіты мозг і органы пачуццяў, асабліва зрок і слых, – для людзей таксама надзвычай важныя. Некаторыя птушкі нават умеюць гаварыць па-чалавечы

(папугаі, вораны, шпакі), і, як сёння заўважана, гаварыць свядома, а не проста паўтараць; у іх зафіксавана здольнасць да лічэння, што сведчыць пра развіццё левага – аналітычнага, разумовага – паўшар'я кары галаўнога мозгу. Па хуткасці перасоўвання і пераадолення вялікіх адлегласцей птушкі стаяць на першым месцы сярод пазванковых істот. Гэта заўсёды выклікала зайздрасць з боку чалавека і ў рэшце рэшт таксама падняло яго ў неба з дапамогай прыдуманых тэхнічных сродкаў, знешне падобных да птушак (але далёка-далёка не такіх дасканалых). Складанасць розных з'яў, звязаных з размнажэннем, выключна цікавыя пры гэтым паводзіны ("арыстакратызм" заляцання, шлюбныя танцы, самаахвярны клопат пра птушанят) таксама не магло не выклікаць здзіўлення, захаплення, а, магчыма, нават і людскога падражання. Для птушак характэрныя і складаныя формы групавых паводзін, групавой арыентацыі і сігналізацыі, што забяспечвае ім высокую эфектыўнасць размнажэння, паспяховае здабыванне ежы і абарону ад ворагаў [34, VI, 5–32] – яшчэ адзін лёсавызначальны для чалавека як сацыяльнай істоты – прыклад. Тым больш, што высокая экалагічная пластычнасць птушак аблягчае ім кантакты з чалавекам – яны лёгка прыручаюцца. Хуткасць і свабода перасоўвання, прытым, што па арыентацыі ў прасторы птушкам няма роўных сярод жывых наземных істот, давалі і даюць ім вялікую перавагу ў свеце. Чалавек заўсёды марыў быць свабодны, як птушка. Менавіта ў працэсе назірання за птушкамі ў людзей узнікла ідэя аддзялення духоўнага пачатку ад зямнога, матэрыяльнага. Вось чаму і душа чалавечая ў Старажытным Егіпце, у Індыі, у Персіі, у еўрапейскіх народаў заўсёды ўвасаблялася ў вобразе птушкі. Акрамя таго, птушка сімвалізуе дух паветра, знак боскай прысутнасці, магчымасць кантактаваць з багамі і падняцца над будзённасцю, звычайнасцю, усёй жыццёвай драбязой.

Птушкі, з аднаго боку, цудоўна прыстасаваныя да экалагічных змен, напрыклад, паніжэнне тэмпературы, пагаршэнне надвор'я выклікаюць іх хуткае перамяшчэнне – пералёты ці перакачоўкі; з другога боку, птушкі надзвычай кансерватыўныя ў адносінах месцазнаходжання: жыццё кожнай з іх непарыўна і цесна звязана з тым адносна невялікім абшарам зямной паверхні, дзе яна з'явілася на свет, інакш кажучы, беларускае паняцце "родны кут" мае прамое і непасрэднае дачыненне да птушак, вучыць і людзей патрыятызму, любові да роднага дому.

Адзін з буйнейшых філосафаў Антычнай Грэцыі Дэмакрыт (VI ст. да н. э.) лічыў, што птушкі навучылі чалавека таксама і некаторым відам мастацкай творчасці – будаваць дамы, спяваць, танцаваць.

Не дзіва, што ў міфалогіі птушка – цэнтральны персанаж. У шматлікіх міфах птушкі гралі важную ролю ў стварэнні свету або ўпраўлялі прыроднымі стыхіямі. Птушка-змяя **Кецалькаатль** ў міфах народаў Мексікі спалучала ў сабе нябесную і зямную ўладу. Але ў большасці міфах свету нябесная і зямная сферы раздзеленыя, і ў такім выпадку шырока выяўленая ў іканаграфіі барацьба птушкі і змяі адлюстроўвае фундаментальны канфлікт паміж святлом і цемрай, духам і матэрыяй, салярнымі сіламі і хтанічнымі. Якраз певень ў шматлікіх міфалагічных сістэмах – увасабленне салярнага божышча.

У папярэдніх раздзелах, прысвечаных жывёлам кітайскага календара, мы імкнуліся дашукацца прычын, паводле якіх тая ці іншая жывёла была ўключана ў задыякальную сістэму і ў далейшым – ужо ў наш час – набыла папулярнасць не толькі ва ўсходнім, але і ў заходнім свеце. Такі ж пошук неабходны і адносна пеўня. Прэтэндаваць на ўвасабленне сонца маглі б шмат якія іншыя птушкі: нават у сям'і тых жа курыных ёсць больш прыгожыя, бліскучыя, ганарлівыя – паўлін, фазан, цэсарка. Але кітайцы выбралі пеўня. Значыць, іх выбар быў абумоўлены і іншымі фактарамі, чым усяго толькі знешні воблік.

Усе курыныя паходзяць з паўднёва-ўсходняй Азіі. Прычым, на думку аўтараў энцыклапедыі "Жыццё жывёл" [34, VI, 311], прыручэнне курэй у Індакітаі ішло не дзеля яек, а дзеля спартыўных мэт, з-за байцоўскіх якасцей птушак. Версія, на нашу думку, спрэчная. Але ў міграцыях птушак, іх прыручэнні, з'яўленні на тэрыторыі Еўропы ўвогуле шмат загадкавага, незразумелага, нават таямнічага. У прынцыпе спецыялісты-арнітолагі хітра абыходзяць гэтыя пытанні. Таму прыходзіцца выбудоўваць уласныя версіі.

Логіка падказвае, што чым больш аселая птушка і чым больш яна прывучаная да чалавека, тым раней яна з'явілася на той ці іншай тэрыторыі. Звычайныя хатнія куры распаўсюджаны практычна па ўсім свеце. Можна меркаваць, што на тэрыторыю цяперашняй Беларусі, шырэй – Усходняй Еўропы, курэй прынеслі яшчэ *барэалы*, што ішлі на поўнач услед за адыходзячым ледавіком. Значыць, непасрэдна ў нас куры маглі з'явіцца неўзабаве пасля Патопу (ледавік, безумоўна, астаўляў пасля сябе масы вады). Аднак прыручылі курыных, паводле нашай уласнай версіі, намнога раней – гэта зрабілі людзі дапатопнай цывілізацыі, суперцывілізацыі. Пасля катастрофы яе насельніцтва ў невялікай колькасці ацалела на тэрыторыі Індыі, у Гімалаях. Якія факты сведчаць на карысць гіпотэзы? Чым далей вывучаеш міфалогію народаў свету, тым больш пачынаеш верыць,

што міфы ў зашыфраваным выглядзе распавядаюць пра сапраўдныя гістарычныя падзеі – гэта яшчэ знакаміты Канфуцый, прарок кітайскага народа, сцвярджаў. Магчыма, чалавецтва ўзнікла надзвычай рана і эвалюцыянізавала ў сваёй гісторыі не аднойчы, стварала не адзін раз культуру, цывілізацыю, але амаль цалкам гінула ў выніку чарговага буйнога планетарнага катаклізму. Найбольш старажытныя паданні, што дайшлі да нас, распавядаюць пра перыядычныя знішчэнні чалавецтва праз пэўныя адрэзкі часу. Так, у індыйскіх Ведах, у якіх выкладзены, як мяркуюць, самыя архаічныя міфы чалавецтва, гаворыцца пра незлічоныя вякі існавання людзей. Самая маленькая адзінка часу ў чалавечай цывілізацыі, згодна Ведам, Калі-юга, роўная перыяду ў 4320000 гадоў. Калі зыходзіць з такога працяглага існавання чалавецтва, то ясна, што і свойскія жывёлы побач з людзьмі жылі здаўна і былі, хутчэй за ўсё, не прыручаныя, а выведзеныя з дапамогай генетыкі.

Няхай гаворка ідзе нават не пра мільёны гадоў, а ўсяго толькі пра тысячы, усё роўна курэй можна лічыць ледзь не самымі першымі насельнікамі людскіх сядзібаў. Пра тое сведчыць не археалогія, бо курыныя косткі не могуць захоўвацца тысячы гадоў, а, як ні парадаксальна, фальклор, у прыватнасці, так званыя *кумулятыўныя казкі.*

Згаданыя творы, глыбокі архаізм якіх не выклікае сумненняў, пабудаваны паводле прынцыпу далучэння адно да другога дзеянняў, асоб, прадметаў, прыкмет, інакш кажучы, паслядоўнасці пералічэнняў, апісальнага спосабу паказу (тыпу “Калабок”, “Церамок”, “Рэпка”) [16, 61–69]. Пеўнік і курачка з’яўляюцца тыповымі героямі кумулятыўных казак, прычым, на нашу думку, самых старажытных. Сустракаюцца яны ва ўсіх народаў Еўропы. Так, у “Казках братоў Грым” ёсць некалькі расповедаў пра падарожжа пеўніка разам з курачкай на вазку. Сюжэты – разнастайныя: ясна, што нямецкія даследчыкі змясцілі ў зборніку некалькі найбольш характэрных твораў і пры гэтым з яўнымі адметнасцямі ў фабуле. У адной з казак (“Кампанія абадранцаў”) Пеўнік майструе вазок з арэхавай шкарлупіны, і да яго з Курачкай у час паездкі падсаджваюцца розныя лясныя жыхары, а далей усе разам яны – пасажыры на дзіва безразмернага вазка – помсцяць ліхому чалавеку [15, I, 66–67]. Часты таксама сюжэт пра смерць Курачкі на Арэхавай гары, дзе яна падавілася арэхам. Пеўнік жонку імкнецца выратаваць, прадпраймае розныя захады, але Курачка ўсё ж памірае. Зноў-такі яе вязуць на вазку, на які падсаджваюцца ўсё больш вялікія па памерах звяры. Нарэшце просіцца падвесці зусім маленькая істота – блаха, і калі яна

ўсаджваецца, вазок не вытрымлівае перагрузкі і тоне ў багне [15, I, 359–361]. Навейшай па фабуле, хоць таксама з некаторымі кумулятыўнымі рысамі, з'яўляецца шырокавядомая казка "Брэменскія музыкі": тут Пеўнік вянчае сабою піраміду з жывёл, якія напалохалі разбойнікаў [15, I, 145–148].

Даследчыкі-фалькларысты і тэарэтыкі літаратуры (А. Весялоўскі, У. Проп, А. Бройтман) лічаць, што кумуляцыя ўяўляе сабою сінкрэтычны тып мыслення, які папярэднічаў вобразнаму паралелізму. Але нам здаецца, што такога кшталту казкі – аскепкі нейкіх складаных павучальных тэкстаў, якія адшліфоўвалі мысленне дзяцей, у тым ліку, і праз парадоксы (блаха, што перагружае вазок). Так, можна меркаваць, што ў вазок падсаджваюцца жывёлы, якіх прыручалі (ці стваралі) у пэўным парадку ўслед за курынымі. У паслядоўнасці казачных падзей таямнічы код быццам нібы дэшыфраваўся, алгарытм рабіўся ўсё больш відавочны, раскладваўся на нейкія пастаянныя элементы. Казка – па свойму надзвычай дасканалая сістэма, якая ў простай і сімвалічнай форме давала глыбокія веды пра нейкія першапачаткі жыцця. І тое, што ў анталагічных па сутнасці творах дзейнічаюць пеўнік і курачка, не можа быць выпадковасцю.

Глыбокія даследчыкі – браты Якоб і Вільгельм Грым – змясцілі ў зборніку і казку, у якой па сутнасці няма сюжэту, не адбываецца нічога істотнага: Пеўнік угаворвае Курачку залезці на стол і пакляваць крошкі на ім, за што іх абодвух б'юць. У навуковых каментарыях да казкі сучасныя аналітыкі выказалі асцярожнае меркаванне, што тут назіраецца імкненне перадаць "мову" пеўня і курачкі [15, II, 328–329]. На нашу думку, тлумачэнне недарэчнае, як і ўсе іншыя назіранні і думкі, звязаныя з героямі – пеўнем і курачкай (мы іх нават не прыводзім). Згаданая казка "Хлебныя крошкі на стале" з'яўляецца аскепкам нейкага сакральнага тэксту. А саміх персанажаў караюць, на нашу думку, таму, што яны парушылі табу: у шмат якіх народаў, у тым ліку, і ў нашага, ні ў якім разе не дазвалялася курам хадзіць па стале – месцу ў доме сакральнаму, аналагу алтара ў храме. Прычым стол як алтар – з'ява, бясспрэчна, яшчэ дахрысціянская, глыбока старажытная. Не выпадкова і тое, што Пеўнік Курачку ўгаворвае: сапраўды, курыцы, у адрозненне ад пеўня, адводзілася месца на зямлі, і яна гэта павінна была ведаць, певень – больш звязаны з верхам. Хоць часам і ён – выразна амбівалентны: у беларусаў пеўняў да іх семігадовага ўзросту заўсёды імкнуліся зарэзаць, бо лічылася, што ён пасля сямі год абавязкова знясе яечка. А гэта надзвычай небяспечна – парушэнне важных законаў прыроды. У адной з навел

“Шляхціца Завальні” Яна Баршчэўскага з яйка, знесенага пеўнем, вылупіўся цмок. Цмок – істота нячыстая: ён можа некаторы час выконваць жаданні гаспадара, але ўрэшце абавязкова адбірае ў яго душу. Ва ўкраінцаў дэманічны (значыць, незвычайны) пеўнік называецца “царык”. Ён пачынае спяваць яшчэ ў яечку, а калі вырастае, шануецца па ўсёй акрузе. Менавіта ён першы абвяшчае світанне, і яго баяцца нячысцікі. “Царыка” якраз ні ў якім разе забіваць нельга [35, 303]. У Сербіі вераць, што певень можа быць “змеем”. Такі певень вызначаецца магутнай сілай і падчас навальніцы змагаецца з душамі самагубцаў, якія водзяць хмары [101, 307].

Па прычыне сваёй выключнасці, магічнай значнасці певень – лепшая ахвяра прыродным стыхіям, персаніфікаваным у вобразе духаў і багоў. Чорнага пеўня беларусы прыносілі ў дар вадзяніку. І сёння на Палессі забіваюць пеўня на месцы будучай лазні – ахвяруюць духу месца. Апошнімі словамі філосафа Сакрата, асуджанага на смерць, было звяртанне да вучня: “Памятай, што мы абяцалі Асклепію пеўня!” Мудры Сакрат нават у апошні свае хвіліны быў верны народнай традыцыі.

Далёка не ўсё ў стаўленні людзей да пеўня паддаецца тлумачэнню. У зусім незразумелай нямецкай казцы “Ханс-Вожык” падобны да вожыка хлопчык збег з дому і ўвесь час жыў на дрэве, нязменна седзячы на пеўні [15, ІІ, 96–101]. Певень тут, мяркуючы па ўсім, сонца, а хто ж хлопчык-вожык? Ці не камета, што ўвайшла ў межы Сонечнай сістэмы? Мы хочам сказаць, што тлумачэнні казак пра пеўня і курачку могуць быць і касмалагічныя. Касмічную ролю пеўня найлепш адчуваюць паэты. Надзвычай тонкі ў апісанні прыродных з’яў выдатны рускі паэт-натурфілосаф Мікалай Забалоцкі ў вершы “Пеўні спяваюць” адчуў у спеве пеўняў таямнічы розум сузор’яў, а зямным фокусам Вялікага Каўша (Вялікай Мядзведзіцы) палічыў кожную пеўневу душу. А ў беларускай паэткі Алены Руцкай

“Разабралі ночку пеўні,
Летню ночку невялічку”, –
Так калісь спявалі жнеі,
Калі ніва сярпы кліча.

Першы певень нечакана
У цішы гукнуў чуллівай –
Цемра спуджана апала
Пераспелай сіняй слівай.

Другі певень зыкам звонкім

Злёгку хістануў нябёсы –
Зор рабінавыя гронкі
Пастрасаліся на плёсы.

Трэці певень галасісты
Абудзіў крыламі вецер,
Туманы сагнаў дачыста
Пад лазовыя павеці…

Паводле старажытных касмаганічных уяўленнях нашых продкаў, Свет створаны з агромністага Касмічнага Яечка. На небе сярод сузор'яў украінцы бачылі і Квочку, што знесла тое самае Яечка – гэта сузор'е Плеяды (у беларусаў – Сітко, Стажары). Але логіка жыцця патрабуе, каб, акрамя Курыцы, быў і зорны Певень. Ён не зафіксаваны; хутчэй за ўсё, пра яго забыліся, ды некалькі тысяч год таму і канфігурацыі зорак былі іншыя. Але чамусьці здаецца, што такім сузор'ем мог быць цяперашні Крыж (сузор'е Лебедзя), хоць Мікалай Забалоцкі называе нават Вялікую Мядзведзіцу – самае прыкметнае сузор'е неба. На карысць нашай версіі гаворыць тэорыя вядомага ізраільскага даследчыка А. Галана, які лічыць крыж надзвычай старажытным сімвалам, што азначаў агонь. А певень таксама сімвалізуе агонь.

Касмічная роля Курыцы і Пеўня – тэма, якая патрабуе, бясспрэчна, спецыяльнага даследавання. А вось пра сувязь пеўня з світаннем, сонцам і святлом гавораць міфы ўсіх народаў, за выключэннем, можа быць, кельтаў і скандынаваў, дзе певень з'яўляецца вестуном іншасвету. Невыпадкова і ў “Казках братоў Грым” – казках еўрапейскіх народаў, у этнагенезе якіх бралі ўдзел кельты і скандынавы, пеўнік часта звязваецца, хоць і ўскосна, са смерцю. Але і сонца ў германцаў – часцей за ўсё Чорнае Сонца – Падземнае, якое ўвасаблялася графічна ў выглядзе свастыкі, павернутай ў адваротны па стрэлцы гадзінніка бок.

Больш выразна менавіта нябесна-сонечная сімволіка пеўня прасочваецца ў казках усходнеславянскіх народаў. У шырокавядомай казцы “Кот, певень і ліса” хітруганка спявае пад вакном, выклікаючы выглянуць Пеўня, пасля чаго яго і крадзе [75, I, 48]. З вакном заўсёды было звязана Сонца: і на небе, паводле вераванняў нашых продкаў, яно выглядае ў акенца. У семіётыцы Дома вокны ўвасаблялі сувязь хатняга космасу з касмічнымі стыхіямі і аб'ектамі, перш за ўсё Сонцам ды Месяцам. Яны ўвайшлі і ў арнаментыку аканіц, надзвычай багатую ў шмат якіх рэгіёнах Беларусі [117, 5– 28].

У варыянтах казкі пра пеўня і лісу Певень з Катом жывуць у Дзеда з Бабай (сімвалы чалавечых продкаў) або разам з Баранам, прычым Кот нязменна ва ўсіх варыянтах выручае Пеўня з бяды, адбірае ад Лісы. Ліса тут – хтанічны персанаж, увасабленне ночы, цемры, ліха, а Кот, на нашу думку, даволі позняя замена Вавёркі, якая была сувязной паміж рознымі ўзроўнямі-сферамі на Касмічным Дрэве. Праўда, невысветленым застаецца пытанне, чаму такая замена адбылася.

У казцы "Мядзведзь і Пеўнік" з дому збягаюць Вол, Баран і Певень і пасяляюцца разам у лесе [75, I, 78]. Вол (бык), баран і певень – жывёлы ўсе салярныя, прычым Певень, які адыгрывае галоўную ролю ў сюжэце, увасабляе сабою ранішняе ці, хутчэй за ўсё, веснавое сонца. У папулярнай ва ўсіх усходніх славянаў казцы "Зімоўе звяроў" менавіта певень з'яўляецца прывабнай ежай, ласункам для лясных звяроў (як і Калабок у аднаіменнай казцы).

У беларускага, рускага, украінскага народаў, як і ў іншых этнасаў Еўропы, сустракаюцца казкі кумулятыўнага характару, кшталту "Смерць Пеўніка", "Кочат і Курыца". Тут гіне менавіта Пеўнік, і Курачка, каб выратаваць яго, кідаецца па ваду; яе набыццё патрабуе, у сваю чаргу, звяртання да пэўных істот і шэрагу адпаведных дзеянняў, якія вынікаюць адно з другога, чапляюцца адно за другое. Казка выразна сведчыць пра сувязь усіх з'яў і прадметаў у свеце, а гэта цалкам укладваецца ў межы міфалагічнага мыслення. Магчыма, перад намі – своеасаблівы тэст, які дэманструе прыхаваную структуру ў знешне, здавалася б, хаатычных з'явах.

У казках пазнейшага часу Певень выяўляе сваю ваяўнічасць. Так, у "Казе лупянай" ён праганяе нахабную Казу (замену Дракона – пасланца іншасвету), у "Лісе і Зайцы" з касой на плячах выганяе з зайчынай хаткі Лісу. Сапраўды, у антычных грэкаў певень суправаджаў ваяўнічых багоў – **Арэса** і **Афіну**. Але быў ён атрыбутам і іншых багоў – **Апалона (**увасабленне Сонца), **Персефоны** (сімвалу адраджэння прыроды вясною), **Гермеса** (вестуна багоў), **Асклепія** (медыцыны). Певень – пільны, нецярпімы да зла, стаіць на абароне справядлівасці, дабра і здароўя (па ўсёй Еўропе некалі верылі, што лекі падзейнічаюць, калі даваць іх хвораму у момант спеву пеўня). У Кітаі, дзе і ўзнік жывёльны задыякальны круг, певень лічыўся сімвалам смеласці, адвагі і мужнасці. У ноч на Новы год пеўня ашчыпвалі і вывешвалі на браму – гэткім чынам гаспадары ахоўвалі сябе ад няшчасцяў [124, 664]. А японская народная архітэктурная форма, што стала ўвогуле сімвалам Японіі, – *торыя* – і ёсць не што іншае як вобразная імітацыя насесту для пеўня [79, 19]. У японскіх

сінтаісцкіх храмах абавязкова жывуць пеўні, бо лічацца свяшчэннымі птушкамі.

У Кітаі слова "певень" – амонім "удачлівага лёсу". Чырвоны певень адводзіць пажар ад дому, а белы адганяе прывіды. Птушку могуць прыносіць у ахвяру (як і ва ўсім свеце), але з павагі не ядзяць. Певень з'яўляецца сімвалам пяці (5 – свяшчэнная лічба) кітайскіх дабрачыннасцяў: пачуцця ўласнай годнасці, высакародства, мужнасці, надзейнасці і велікадушнасці (апошняе – з-за звычкі пеўня прапаноўваць знойдзеную ежу спачатку курам, а затым ужо есці самому). Магчыма, згаданыя ўласцівасці і закладваліся генетыкамі Суперцывілізацыі ў праграму стварэння прыгожай, ганарлівай і мужнай птушкі. У буддызме, што ўзнік у Індыі, певень увасабляў сексуальную прагу, пажаднасць, але разам з тым з'яўляўся адным з трох эмблематычных жывёл (поруч з свіньёй і змяёй), якія суправаджалі чалавека ў крузе нараджэння і смерці [63, 244].

І ўсё ж у еўрапейскім рэгіёне казак пра пеўня значна больш, чым на тэрыторыі, блізкай да яго радзімы – Кітая, Японіі і Індыі. Дарэчы, і назваў птушкі ва Усходняй Еўропе шмат: "певень" (бел.), "петух" (руск.), "кочет" (руск.), "будзімір" (укр.), "півень" (укр.), "кур" (агульнаслав.), "петел" (балг.), "петао" (сербск.), "петелін" (славенск.), "когут" (польск.) [113, II, 27–28]. Найбольш старажытная назва, на нашу думку, – "кур". Корань "ур", пра што мы ўжо неаднаразова пісалі ў розных артыкулах, з'яўляецца назвай святла, бога Неба (**<u>Ур</u>ана**) і адначасова ўваходзіць у пераможны крык ваяроў – "<u>ур</u>а", які літаральна азначае "з намі бог-святло". Пачатковае "к" ("кур") ва ўсіх славянскіх мовах азначае набліжэнне да чаго-небудзь. Такім чынам, "кур" – той, хто блізкі да святла. Можна прапанаваць і іншую версію: у старажытных шумераў бог Неба **Энліль** меў эпітэты – Кур-галь, Кур-ан (адсюль паходзіць, відаць, слова "курган"), што азначала "Высокую гару", "Гару Неба". Такім чынам, нават сама назва істоты прама ўказвала на яго функцыю. Натуральна, што і ў народзе яго заўсёды лічылі абвяшчальнікам світання, вестуном узыходу сонца – ён <u>першы</u> вітае сонца: гэта, відаць, і было вызначальным у выбары кітайцамі птушкі для свайго календара. Украінскае "будзімір" таксама прама ўказвае – "будзіць мір", а пад "мірам" разумелі і святло, і сацыяльны космас, інакш кажучы, народ. "Кочет" паходзіць, магчыма, ад гукапераймальнага выклічніка, а беларускае "певень", рускае "петух", украінскае "півень" і падобныя словы ў іншых славянскіх народаў маюць агульны корань са "спевамі". Выдатны даследчык міфалогіі і фальклору славянаў А. Афанасьеў у XIX ст. пісаў: "Крык пеўня – сігнал, што на небе звоняць да ранішняй службы; як толькі

пачуецца ён, чэрці, вупары, ведзьмакі і ведзьмы спяшаюцца разбегчыся па сваіх месцах...” [75, I., 502]. У беларускай легендзе “Тураўскія саркафагі” певень жыве нават на балоце (чамусьці) і сваім спевам праганяе русалак. Інакш кажучы, без яго нельга абысціся ў стасунках паміж рознымі светамі – светам жывых і светам памерлых.

Сучасны беларускі даследчык фальклору А. Ненадавец адзначае, што сімволіка пеўня звязана з усім комплексам уяўленняў: жыццё – смерць – новае нараджэнне, і прыводзіць шматлікія прыклады ў доказ [78, 190]. Сапраўды, гэта так, паколькі певень – метафарычная назва Сонца, а Сонца падарожнічае не толькі па небе – царстве багоў, а і ў падземным, чужым і варожым для сябе, хтанічным свеце, дзе ўсё ж абавязкова перамагае цемру і нязменна адраджаецца кожную раніцу. Больш за тое, яшчэ вучоныя-міфолагі XIX ст. імкнуліся рэканструяваць імя славянскага бога часу. Якоб Грым у сваёй класічнай працы “Нямецкая міфалогія” (1835 г.) прыйшоў да высновы, што яно гучала як “Крэт” – сугучнае ў першых літарах грэчаскаму богу **Крону** (**Хронасу**). Даследчыкі XX ст. канчаткова ўстанавілі, што імя бога часу ў старажытных славянаў – **Курэт**. Як бачым, корань слова той жа, што ў назве пеўня – “кур”.

Самы шырокі філасофскі абсяг уяўленняў, звязаны з пеўнем, натуральна, робіць яго вобраз шматфункцыянальным у слоўнай мастацкай творчасці, героем выключна разнастайных сюжэтаў. Так, у зборніку таго ж А. Афанасьева “Русские народные сказки” прыводзіцца казка, у аднолькавай ступені, але ў розных варыянтах, характэрная для беларускага, рускага, украінскага народаў. Схема казкі наступная: па дубу ці па гаросе (сімвалах Сусветнага Дрэва) Дзед узлазіць на неба, дзе бярэ чароўныя жаронцы (сімвал Сусветнага Рухавіка – Рыты-Раты) і Пеўня (сімвал Сонца). Баярын ці іншы злодзей жаронцы крадзе. Певень праследуе яго і патрабуе вярнуць цудоўную рэч. Пеўня кідаюць у калодзеж – ён выпівае ўсю ваду, затым саджаюць у печ – ён залівае яе вадою, і ўрэшце вяртае жаронцы [75, II, 30]. Наша тлумачэнне казкі: Сонцу-Пеўню не страшная вада, бо яно ў сваіх сутачных падарожжах праходзіць ноччу праз ваду (Акіян), якім часта ўяўлялася хтанічная сфера. Тым больш не страшны Сонцу агонь, бо ён сам – агонь. Часам перыфразаю агню і з’яўляецца выраз “чырвоны певень”. Сучасны расійскі пісьменнік Міхаіл Успенскі, фантаст і гумарыст, правёўшы адваротны працэс дэметафарызацыі, у сваім фантастычным рамане “Там, дзе нас няма” персаніфікаваў вобраз “чырвонага пеўня” ў рэальны (і ў той жа час казачна-фэнтэзійны) персанаж – **Будзіміра.** Будзімір-Певень, паколькі ён усё ж на самай справе – агонь, неаднаразова выратоўвае

менавіта ў гэтай сваёй якасці галоўнага героя **Жыхара** – сімвала славянскіх народаў – і яго сябра-спадарожніка **Яр-Тура (Артура**) – будучага караля англійскага народа [109].

Вобраз пеўня неаднаразова сустракаецца ў мастацкіх творах, прычым найбольш цікава – у літаратурных казках. У самага жыццярадаснага і разнастайнага ў сюжэтах амерыканскага пісьменніка XIX ст. – рамантыка Вашынгтона Ірвінга – ёсць навела ва ўсходнім стылі "Легенда пра арабскага астролага", якую выкарыстаў, моцна трансфармаваўшы, Аляксандр Пушкін у сваёй "Казцы пра залатога пеўніка". У Ірвінга пеўнік, што стаяў на спіне барана, згадваецца як адно з цудаў Старажытнага Егіпта, але астролаг, па загадзе султана, стварае ўсё ж і чалавекападобнага жалезнага вартавога – быццам у дапамогу аглядальніку-пеўню. У іранічнага Пушкіна на вяршыню вежы мудры вяшчун памясціў менавіта пеўніка-вартаўніка, бо ва ўсіх народаў Еўропы флюгерамі былі, як правіла, пеўні. У сусветна вядомага дацкага казачніка Ганса Хрысціяна Андэрсена нават ёсць казка "Дваравы певень і флюгерны". "Да трэціх пеўняў" – так назваў выдатны рускі пісьменнік XX ст. Васіль Шукшын сваю філасофскую аповесць-казку, у якой надзвычай дакладна ў вобразнай форме прадказаў усё, што адбылося на мяжы стагоддзяў з нашай духоўнасцю. Часам у стаўленні да пеўня праглядае ўсё ж некаторая іронія: сурьёзную кнігу пра літаратуру (класічную і сучасную) беларуская даследчыца Людміла Корань называе "Цукровы пеўнік". Не без сарказму апісвае свайго персанажа – Пеўня – Аляксей Талстой у вядомай казцы "Залаты ключык, або Прыгоды Бураціна". Мала каму вядома, што ўсе героі твора мелі сваіх прататыпаў, прыкладам, Карабас Барабас – злосная карыкатура на рэжысёра Усевалада Мейрхольда, П'еро – на Аляксандра Блока, Мальвіна – на яго жонку Любоў Дзмітрыеўну і г.д. Праўда, яшчэ не ўсе прататыпы раскрытыя, але можна меркаваць, што сярод знаёмцаў з'едлівага аўтара быў і "Певень" – чалавек пыхлівы, задзірлівы і дурны.

Паколькі з пеўнем звязваюць сексуальную патэнцыю, ён сустракаецца ў замовах на каханне, у варажбе, у снах. Так, каб прывабіць жаніха, неабходна з пячной застаўкі пакарміць пеўня. На Каляды дзяўчаты часта варажылі з пеўнем: загадвалі жаданне на розныя віды зерня і пускалі птушку, глядзелі, з якой кучкі і якое зерне будзе певень кляваць. Існавалі і іншыя гаданні з пеўнем. Шырока распаўсюджаныя і прыкметы. Так, калі пеўні спяваюць усю ноч – чакай ліха. Пеўні распеліся не ў час – да вестак. Калі курыца запела пеўнем – хто-небудзь памрэ. У навеле ўкраінскай пісьменніцы XIX ст.

Марка Ваўчок “Сон” маладзіца сасніла сон пра чырвоны месяц, унутры якога белы певень крыламі маша і спявае: сон напрарочыў хуткае вяртанне з Крыма яе маладога мужа-чумака. У палякаў на вяселлі перад маладымі неслі пеўня як сімвал мужчынскай сілы і плоднасці (у адной з рускіх іранічных казак Певень спавядаецца перад Лісою, каючыся ў граху – мае семдзесят жонак). І ў беларускай вясельнай абраднасці певень і курыца выкарыстоўваюцца шырока і на розных этапах рытуалу. Увогуле певень увасабляе салярны і мужчынскі прынцыпы, адсюль – і пэўныя яго функцыі.

Калі певень сніцца, гэта абяцае ўдачу і павышэнне прэстыжу. Пачутыя ў сне рэальныя ранішнія спевы пеўняў абяцаюць для моладзі ўдалую жаніцьбу ці замужжа і дабрабыт у доме. Калі сніцца, што певень крычыць ноччу ці вечарам, прыйдзецца плакаць, і не раз. Гэтаксама, як апостал Петр успомніў прадказанне Хрыста, пачуўшы птушыны крык, так і нас сон з пеўнем можа перасцерагчы ад памылак і заблуджэнняў.

У хрысціянстве певень вітае ўсход Сонца-Хрыста на ўсходзе. Пазалачоны флюгерны певень ахоўвае храмы ўначы, калі маўчаць званы. Ён увасабляе праведнікаў, якія абвяшчалі прыход Світання-Хрыста. А.Ненадавец згадвае раннехрысціянскую легенду, паводле якой Хрысту падчас апошняй вячэры з вучнямі падалі смажанага пеўня. “А калі Іуда пайшоў, каб здрадзіць свайму настаўніку, Хрыстос загадаў пеўню ісці за ім. Той так і зрабіў, а вярнуўшыся назад, расказаў аб здрадзе – і ва ўзнагароду за гэта трапіў у рай. У другой раннехрысціянскай легендзе апавядаецца, што Хрыстос уваскрэс пасля першага крыку пеўня” [78, 191]. У сувязі з апосталам Пятром певень сімвалізуе чалавечую слабасць і пакаянне: Пётр адракаўся ад Хрыста раніцой перад Раскрыжаваннем. Пра гэту легенду нагадвае і певень, што сядзіць на самым версе агромністага гадзінніка Страсцбургскага сабора. Кожны раз, калі скульптура Пятра з’яўляецца сярод апосталаў, чуецца спеў пеўня. Вось чаму певень стаў адным з атрыбутаў Святога Пятра, які, у сваю чаргу, лічыцца апекуном гадзіннікавых майстроў.

У сувязі з салярнай семантыкай, ды і з прыгажосцю (пастава выключна зграбная, вытанчоная, асабліва ў профіль), певень – часты персанаж выяўленчага і дэкаратыўна-пабытавага мастацтва. Кельты-галы насілі выяву пеўня на зброі і сцягах, ён увогуле стаў эмблемай Галіі (дзякуючы гульні слоў лацінскай мовы, дзе “gallus” азначаў і “певень”, і “гал”). У Францыі певень лічыцца эмблемай незалежнасці, свабоды, але і задзірлівасці. Француз любіць атаясамліваць сябе з пеўнем. Птушка часта сустракаецца ў гярбах не толькі гарадоў і

арыстакратычных родаў Францыі, але і ў геральдыцы суседніх краін. У цэнтральным зале пасяджэнняў будынка ЮНЕСКА, размешчанага ў Парыжы, усю сцяну займае агромністы габелен з выявай на ім пеўня як увасаблення сонца, святла, раніцы, адраджэння, культуры, аховы і абароны ад усялякага ліха. Стварыў габелен сусветна вядомы мастак Жан Люрса, у якога шмат чаму навучыліся прызнаныя майстры беларускага манументальнага габелену – Анатоль Кішчанка і Міхась Савіцкі. У Кітаі певень – адзін з важнейшых абярэгаў, нярэдка малюецца нават на сцянах дамоў (у нас стылізаваны – на драўляных стрэхах). У беларусаў певень паўстае на вясельных ручніках, але асабліва часта яго ганарлівая выява сустракаецца ў вырабах з саломкі і ў выцінанках – характэрна беларускіх нацыянальных жанрах дэкаратыўна-побытавага мастацтва.

Спеў пеўня неаднаразова імітываўся кампазітарамі-класікамі, напрыклад, Міхаілам Глінкам, Пятром Чайкоўскім. У савецкі час папулярнасцю карысталася сімфанічная паэма іспанскага кампазітара Лопеса Флорэса "Песня пеўня" – яе часта перадавалі па радыё. У кінастужках спеў пеўня за кадрам – знак вясковай раніцы, і характэрна: заўсёды настройвае на адпаведны эмацыянальны лад.

Такім чынам, мудрыя кітайцы, калі яшчэ ў глыбокай старажытнасці выбіралі птушку для свайго календара, неяк вельмі правільна ўгадалі надзвычай шырокую распаўсюджанасць пеўня ў свеце і любоў да яго з боку шматлікіх народаў. Але ў семантыцы вобраза пеўня застаецца яшчэ, як не дзіўна, шмат невытлумачанага.

## САБАКА

Пра многіх з так званых "каляндарных" жывёл – асабліва пра сабаку – напісана шмат. І ў прынцыпе пра яго можна пісаць бясконца – настолькі жывёла цікавая і як ніякая іншая блізкая да чалавека. Але нягледзячы на тое, што існуе велізарная колькасць кніг і нават цэлая навука – кіналогія [ад грэч. "кінас" – сабака і "логас" – навука], шмат якія праблемы, звязаныя з сабакам, так і застаюцца невырашаныя. Некаторыя трывала сцверджаныя ў навуцы тэорыі сёння пераглядаюцца. Так, доўгі час лічылася, што сабакі паходзяць ад ваўкоў і шакалаў. Нядаўна высветлілася, што продак амаль чатырохсот парод сабак – выключна воўк: з дзевяноста асноўных рыс паводзін сабак семдзесят маюцца і ў ваўка; у шакалаў з сабакамі агульных рыс намнога менш. Удакладнены і даты прыручэння ваўка, які стаў сабакам: раней пісалі пра восем тысяч, сёння ўжо ідзе гаворка пра абсяг у дваццаць тысяч гадоў. Не здзіўлюся, калі ўрэшце

гэты тэрмін павялічыцца на парадак: інакш не хапае часу, каб утварыць чатырыста парод.

Але самае незвычайнае і таямнічае ў паходжанні сабакі – сам механізм прыручэння ваўка людзьмі. Тлумачэнні кінолагаў, што ваўкі пасяляліся каля чалавечага жытла, бо там было лягчэй харчавацца, выглядаюць больш чым наіўнымі. Чаму, у такім разе, ваўкі не прыбіваліся да чалавека ў гістарычныя часы, калі многія народы ўжо жылі асела і значна пабагацелі? Свойскую жывёлу ваўкі заўсёды кралі, але зусім не жадалі пасяляцца каля чалавека, каб гарантавана карміцца ў паселішчах. Драпежнікі заставаліся драпежнікамі, і лес для іх – родны дом.

А сапраўды, цікава: з усіх драпежнікаў разам з чалавекам жывуць кошка ды сабака. Прычым кошка паводзіць сябе даволі незалежна і трымае ад людзей дыстанцыю намнога большую, чым сабака. Толькі сабаку мы лічым сапраўдным сябрам, верным і шчырым. Але што прымусіла наблізіцца адзін да аднаго чалавека і ваўка – да такой ступені, каб воўк стаў нашым ахоўнікам і памочнікам? Выхаванне ваўчанятаў людзьмі на працягу некалькіх пакаленняў? Лагічна. Але ўсё ж не тлумачыць некаторыя дзіўныя з'явы ва ўзаемных стасунках чалавека і менавіта гэтай жывёлы. Чаму псіхічна хворыя на лікантропію ўяўляюць сябе ваўкамі? Чаму пярэварацень у многіх выпадках – воўк? Чаму большасць дзяцей-"маўглі" аказваліся ў асяроддзі пераважна ваўкоў? Дарэчы, сюжэт "Маўглі" навеяны Кіплінгу, з аднаго боку, аповедамі пра індыйскіх ёгаў, якія валодаюць дарам аддаваць разумовыя загады жывёлам, з другога – біблейскім міфам, які гаворыць, што да грэхападзення і выгнання з Рая **Адам**, гэта значыць, Чалавек жыў у гармоніі з жывёламі – Боскімі стварэннямі і нават гаварыў з імі на адной мове.

Прафесар камярунскага універсітэта Біка Акіа сцвярджае, што ў Афрыцы здаўна вядомая такая загадкавая з'ява, як пабрацімства чалавека і якога-небудзь звера. Вядома, што еўрапейцы ў чалавеку адрозніваюць цела і душу – матэрыяльны пачатак і духоўны. Паводле ж афрыканцаў, чалавек складаецца з чатырох элементаў. З іх тры ёсць ва ўсіх – цела, сэрца, дыханне, а чацвёрты – толькі ў асобных людзей, пасвячоных-жрацоў і людзей-звяроў: ён называецца "у". Гэта нейкая таямнічая сіла, што даецца чалавеку ад нараджэння і дазваляе яму кантактаваць з жывёлай. Чалавек, які адчувае ў сабе сілу "у" (адкуль яна генетычна бярэцца? – **Т.Ш.**), выбірае жывёлу, адлоўлівае яе, надразае цела ў сябе і ў яе і змешвае кроў. (Успомнім: "Мы з табой адной крыві", – гаворыць Маўглі ў Кіплінга кожнаму са звяроў – **Т.Ш.**). Пасля гэтага паміж чалавекам і

жывёлай ці птушкай усталёўваецца поўная духоўная сувязь, узаемаразуменне і ўзаемадапамога. Так даводзіць Біка Акіа. Памятаецца, як гадоў дваццаць таму сусветная прэса шмат пісала пра судовыя працэсы супраць плямёнаў-кракадзілаў і плямёнаў-леапардаў у той жа Афрыцы. Некаторыя людзі з гэтых плямёнаў не толькі сябравалі з яўна татэмнымі жывёламі, але і самі, як быццам, маглі ператварацца ў іх, каб у жывёльным выглядзе забіваць ворагаў з іншых этнічных груп. Ёсць звесткі, што і ў Еўропе ваяроў-вікінгаў вучылі як бы “перамяшчаць” сваю свядомасць у мозг птушкі ці звера або, наадварот, “памяшчаць” іх розум у сваім, каб устанавіць асаблівую сувязь з жывёльным сімвалам: тады вікінгі станавіліся асаблівымі смелымі, яраснымі ў баі – *берсеркамі* (літаральна – “мядзведзь-воўк”).

Прыводзячы гэтыя прыклады, мы хочам сказаць, што адносіны паміж чалавекам і жывёлай больш складаныя і загадкавыя, чым уяўляецца нашаму прагматычнаму, закаснеламу ў рацыянальнасці, скептычнаму розуму. Анімістычнае мысленне архаічных людзей адухаўляла літаральна ўсё: касмічныя працэсы і з’явы, стыхіі, элементы ландшафту, расліны, ваду, зямлю. Але калі нават камень жывы, дык наколькі багатая і складаная душа ў жывёлы! Так думалі продкі. А можа, і праўда?

На працягу дзесяткаў гадоў вядомы рускі пісьменнік і журналіст Васіль Пяскоў вядзе ў “Камсамольскай праўдзе” рубрыку пра незвычайныя здольнасці жывёл і птушак. Гэта, відаць, адзіны нармальны, праўдзівы, цікавы матэрыял, які толькі і можна чытаць у поўнасцю бульварнай “Камсамолцы”. Але справа ў іншым. Шмат якія выпадкі, што апісвае В. Пяскоў, незвычайныя і прымушаюць пра многае задумацца. Напрыклад, леснікі Калужскай вобласці на працягу некалькіх месяцаў назіралі мядзведзіцу, у сям’і якой разам з медзведзянятамі жыла цялушка, што аднойчы, відаць, заблудзілася ў лесе. Адносіны да яе з боку мядзведзяў былі вельмі цёплыя – не як да будучага харчу. У Балгарыі ў адным з лясных раёнаў паляўнічыя сустракалі групу ваўкоў і разам з імі кабанчыка. Ваўкі і не думалі ўспрымаць яго як патэнцыяльную ахвяру. Справа, відаць, у тым, што ў кабанчыка ўжо сфарміравалася свядомасць ваўка, і яго лічылі за браціка. Але што спрыяла прыняццю капытнага ў сям’ю драпежнікаў? Відаць, у жывёльным свеце адбываецца не толькі дзяленне на ворагаў і здабычу, на сваіх і чужых. Жывёлы здольныя разгледзіць істоту, якой патрабуецца дапамога, і пашкадаваць яе. Адсюль, магчыма, і вырастала асаблівае стаўленне ваўкоў да людзей, узнікала прыязнасць і дружба. Але і чалавек разумеў: з чым ён

прыходзіць у прыроду, тое і атрымоўвае ў адказ. Не выпадкова многія святыя сябравалі з жывёламі. Самі жывёлы, асабліва сабакі (а першапачаткова, безумоўна, ваўкі як найбольш разумныя звяры ў лесе), ведаюць пра нас намнога больш, чым мы пра іх: яны валодаюць магутнай інтуіцыяй, чуццём. У народзе вераць: добрых людзей драпежнікі не чапаюць. Тысячы выпадкаў незвычайнай пранікліваcці, дабрыні, вернасці, ахвяравання сабою сабак апісаны ў літаратуры. Украінскі пісьменнік-класік Міхайла Кацюбінскі гаварыў, што “сабака вывеў чалавека ў людзі”. Нават так!

Амерыканскі даследчык Т. Эндрус лічыць, што жывёламі кіруюць разумныя нематэрыяльныя ўтварэнні, таму і кантакты іх з чалавекам адбываюцца не на вербальным, а на энергетычным узроўні. Сімвалісты пачатку ХХ ст. гаварылі, што ўсё ў свеце напоўнена сэнсам, знакамі якога з’яўляюцца ў тым ліку і жывёлы. Птушка, што білася ў вакно лецішча Івана Мележа ў момант яго смерці (наша сям’я назірала), не ўсведамляла, што робіць, а з’яўлялася пасланнем ад пэўных духоўных існасцяў. І так ва ўсім і заўсёды.

Некаторыя законы фізікі і біяфізікі, што ляжаць у аснове гэтых працэсаў, якія мы пакуль выкладаем на мове хутчэй міфалагічнай, чым навуковай, ужо адкрыты даследчыкамі. Так, даказана, што самыя эфектыўныя лекары – менавіта сабакі. Прысутнасць сабакі ў доме амаль напалову зніжае небяспеку інфаркту ў гаспадароў. Кошкі – таксама: кладуцца на хворае ў чалавека месца. Але сабакі, у адрозненне ад катоў, лечаць дыстанцыйна, забіраюць адмоўную энергію. Акадэмік РАН А. Скаржынскі многія гады вывучае ўздзеянне сабак на людзей. Ён тлумачыць станоўчы эфект тым, што частотныя параметры біяэнергетычных патэнцыялаў людзей і сабак блізкія паміж сабою. Таму сабакі і лечаць, таму яны і сябры чалавека. Але ці выпрацавалася гэта ў працэсе сумеснага жыцця, ці было напачатку, таму і адбылося збліжэнне? А калі, як мы лічым, напачатку, то чаму так распарадзілася Прырода? Вось дзе галоўная загадка.

Магчыма, наблізіцца да разгадкі ўзаемнага сяброўства чалавека і сабакі дапамогуць міфалогія і фальклор: у іх зашыфраваныя шмат якія рэальныя гістарычныя звесткі.

Аўтары энцыклапедыі “Беларуская міфалогія” прыводзяць такое старажытнае паданне пра сабаку: Бог, стварыўшы чалавека, робіць сабаку вартаўніком апошняга. Але Бог стварыў чалавека без поўсці, голым, таму д’ябал, напусціўшы холаду, змог дабрацца да чалавека і нашкодзіць яму. А вось сабаку Бог падараваў поўсць [7, 443]. Ва Украіне такое ж паданне існуе ў вялікай колькасці варыянтаў. Вобраз сабакі ў міфалогіі незвычайны ўжо тым, што ён

фігуруе ў шматлікіх сюжэтах, што распавядаюць менавіта пра стварэнне чалавека. Бог стварыў чалавека і сабаку з аднаго і таго ж матэрыялу. Гэта надзвычай важны момант: міф пацвярджае спрадвечную асаблівую блізкасць чалавека і сабакі, гаворыць пра тое ж, пра што і навука.

Праўда, ва Украіне, як, дарэчы, і на Беларусі, існуюць і дастаткова негатыўныя паданні не столькі пра сабаку, колькі пра яго сувязь з чалавекам. У прыватнасці, ствараючы Еву, Бог узяў з Адама рабро і паклаў сушыцца. Сабака схапіў костку і пачаў грызці. Анёлы ледзь адабралі недагрызенае рабро. Таму зрэдку жанчыну называюць “сабачым недагрызкам” [35, 264].

Тым не менш, ва ўсіх паданнях ды апокрыфах сабака спрадвек – з моманту ўтварэння чалавека – прысутнічае побач з людзьмі. Адначасова міфы фіксуюць асаблівую блізкасць сабакі да Бога (Вышэйшага Свету). Можа, таму рымскі пісьменнік Плутарх лічыў, што сабака ўвасабляе філасофскі пачатак у свеце. У некаторых міфалагічных сістэмах (амерыканскіх індзейцаў, плямёнаў астравоў Мікранезіі) сабака – татэмны продак і дэміург-культурны герой. У прыватнасці, ён з’яўляецца вынаходнікам агню і даруе яго чалавецтву, набываючы функцыі нават больш шырокія, чым тыповы культурны герой – грэчаскі **Праметэй,** які ўсяго толькі ўкраў божаскі агонь і прынёс людзям.

У скандынаўскага вярхоўнага бога **Одзіна** два сабакі і два вораны жывуць як дарадчыкі. У сібірскім шаманізме сабака – пасланец духаў лесу, што блізка да тэорыі нашага сучасніка вучонага Т. Эндруса.

Сабака ёсць і на небе – адна з самых яркіх зорак Сірыус. У Старажытным Егіпце з’яўленне Сірыуса на небасхіле папярэднічала штогадоваму разліву Ніла, ад якога залежыў ураджай, і якраз з гэтай падзеі пачынаўся егіпецкі Новы год. Яе чакалі, да яе рыхтаваліся. У свядомасці людзей утварылася сувязь паміж свяшчэннай зоркай, што папярэднічала разліву, і сабакам, што звычайна сваім брэхам папярэджваў пра чыё-небудзь з’яўленне. Магчыма, таму Сірыус (Соціс) назвалі Сабачай зоркай ці, больш дакладна, “Зорным Сабакам”. Менавіта з гэтай зоркай егіпцяне звязвалі паходжанне сваёй цывілізацыі – адтуль, як быццам, прыляцелі.

У Кітаі і Японіі сабакі – сімвалы абароны. У зорным задыяку азіятаў сабака, на нашу думку, ахоўвае ўсіх астатніх каляндарных жывёл.

У Персіі сабака таксама быў свяшчэннай істотай. У рэлігійнай кнізе зораастрызму “Авесце” ёсць нават такі выраз: “Розумам сабакі трымаецца свет”.

Некаторыя расійскія даследчыкі (напрыклад, В. Калашнікаў), паўтараючы заходніх, гавораць пра магутную цывілізацыю мудрых змеяў-цмокаў (драконаў), якія паступова вымíралі (але існавалі ў асобных экземплярах нават у гістарычную эпоху) і былі заменены такімі самымі мудрымі ваўкамі і сабакамі [45, 24]. Безумоўна, гаворка ідзе пра міфалагічных істот, хоць не выключана захаванне дыназаўраў ці, як пісалі летапісы, “каркадзілаў” у глухіх месцах Еўразіі, у тым ліку, паводле сцвярджэння акадэміка Б. Рыбакова, у балотах Палесся. А ў міфалагічнай свядомасці, на нашу думку, захавалася ўяўленне пра пераемнасць цывілізацый, пра нейкую роднаснасць змеяў і ваўкоў. Так, першапродак сербскага народа называўся **Змей Агнявы Вук** (Воўк). Наш Усяслаў Чарадзей, што лічыўся ваўкалакам, нарадзіўся, паводле падання, ад **Агнявога Цмока**. Ніхто з даследчыкаў, здаецца, яшчэ не звярнуў увагу на тое, што ў чарадзейных казках сабакі (хорты) вельмі часта суправаджаюць цмокаў, падказваючы апошнім стратэгію дзеянняў. Атрымоўваецца, што прадстаўнікі маладой культуры – сабакі – разумнейшыя за дэградантаў заняпалай, адміраючай цывілізацыі драконаў, хоць у Кітаі драконы і сёння лічацца вышэйшымі істотамі.

У выніку ганаровым было весці свой род ад ваўкоў і сабак. Звычайна такога кшталту паходжанне мелі багі, цары і волаты. Напрыклад, “сабачымі дзецьмі” былі герой ірландскага эпасу **Кухулін** і мангол **Бадангар** – продак Чынгісхана. Ваўка-сабаку ў старажытнаславянскай мове называлі хортам і, на нашу думку, ён меў дачыненне да сонечнага бога **Хорса**. Нездарма ў “Слове пра паход Ігараў” Усяслаў-ваўкалака і Сонца-Хорс згадваюцца побач.

У адной з работ мы імкнуліся давесці, што беларускія міфалагічныя сабакі **Стаўры** і **Гаўры** таксама мелі дачыненне да багоў ці былі самі ўвасабленнем багоў. Стаўры мы звязваем са **Стрыбогам.** Гэта адзін з самых таямнічых багоў, які ўваходзіў у пантэон 980 года князя Уладзіміра. Тлумачэнняў імені Стрыбог шмат, але прывядзём і сваё. Вядома, што імёны вярхоўных багоў індаеўрапейцаў мелі некалькі эпітэтаў. Ныпрыклад, у скандынаўскага Одзіна іх было дванаццаць. Тое ж датычыць усходнеславянскага **Сварога**. Яго імя сустракаецца ў шматлікіх пісьмовых крыніцах, і таму існаванне бога ў міфалогіі не выклікае сумнення. Стрыбог, відаць, – яго эпітэт, пад якім ён і ўвайшоў у пантэон. Эпітэт меў на ўвазе, што Сварог – бацька трох багоў (прыстаўка “с” ва ўсіх

старажытных словах раней азначала “се” – “гэты”, а марфема “тры” ў імені – і ёсць лічба). Сапраўды, Сварожычамі, інакш кажучы, сынамі Сварога, нашы продкі называлі трох багоў – **Перуна**, **Дажбога** і **Агонь**, дваіх нябесных і аднаго зямнога – зрэдку яны атаясамліваліся. Магчыма, у іпастасі сабакі выступаў і сам бог Стрыбог-Сварог. Ва ўсялякім разе, вызначыць у календары для ўшанавання памяці спецыяльны дзень (як было ў беларусаў у дачыненні да названых сабак) можна толькі для бога – няхай і такога архаічнага, як Сварог-Стрыбог.

Такім чынам, першыя літары імені Стаўры паходзяць ад бога Стрыбога, а наступныя дзве марфемы маюць, бясспрэчна, гукапераймальны характар – нагадваюць пра, так бы мовіць, “гаворку” самога сабакі. Яшчэ ў большай ступені з гукапераймannем звязана, як быццам, імя **Гаўры**. Але мы лічым інакш. Гаўры мы выводзім ад імені **Га** – самай старажытнай багіні не толькі славянскага, але індаеўрапейскага пантэону. Імя не сустракаецца ў пісьмовых крыніцах (акрамя старажытнаегіпецкіх) і ў фальклоры – мы рэстаўруем яго на аснове выключна лінгвістычных і міфалагічных дадзеных, улічваючы вялікую колькасць важных слоў і імёнаў міфалагічных персанажаў з першапачатковай марфемай “га” ў еўрапейскіх і азіяцкіх народаў. Так, у нашых суседзяў літоўцаў **Габія** – надзвычай шануемая багіня хатняга ачага, агню [27, 254]. Га ў першаславянаў – тое ж, што **Гея** ў грэкаў, – Вялікая Багіня, сама планета Зямля, Маці ўсіх іншых багоў. Гея – жонка Урана-Неба. Так і ў нас Га – жонка Неба-Сварога-Стрыбога. Натуральна, адной з яе іпастасяў мог быць сабака, як і ў нябеснага бога. Такім чынам, беларусы пэўнага рэгіёну (Краснапольшчыны) захавалі памяць пра найбольш старажытных славяна-балцкіх багоў – шлюбную пару **Га** і **Сварога**. Безумоўна, гэта гіпотэза, але ў жанры культуралагічнага эсэ часам можна сабе дазволіць выказацца больш смела, чым у навуковым артыкуле.

Бязмежнае поле для фантазіі даюць і казкі. **Шэры Воўк**, што згадваецца ў славянскіх чарадзейных казках, на нашу думку, – не свойская жывёла, упершыню прыручаны сабака, і не татэмны продак. Воўк бяжыць, быццам ляціць; ён намнога разумнейшы за чалавека, шмат што прадбачыць наперад, ведае, напрыклад, што **Воран** ахоўвае мёртвую і жывую ваду. Магчыма, казачны воўк – і не жывёла зусім, а магутны бог-пярэварацень, напрыклад, **Купала-Апалон**. Апалона грэкі часта называлі Лікейскім, што азначае – Ваўчыны. У тых жа грэкаў сабакі суправаджалі надзвычай

аўтарытэтных багоў – **Асклепія** (**Эскулапа**), сына Апалона, і **Гермеса (Меркурыя**).

У Кітаі сабака адганяў злых духаў. Між іншым, тое ж у беларусаў. Беларускі даследчык А. Шамак піша: “Сабака адчувае і бачыць Духаў. Нядобрых адганяе ад сядзібы сваім брэхам, тым самым ахоўвае хату ад усялякага ліха. Калі Нядобры Дух ноччу схопіць у свае лапы чалавека, дык даволі забрахаць сабаку, каб Дух зараз жа кінуў сваю здабычу” [119, 102]. Гэта яшчэ адзін доказ блізкасці сабакі да нябеснага свету, да добрых багоў.

Нельга скідваць з рахунку і трывалую веру продкаў, што раней жывёлы і людзі – як бы адна еднасць, толькі жывёлы адрозніваліся ад людзей сваім адзеннем – шкурай і поўсцю. Чалавек і звер лёгка перакідваліся адзін у аднаго. Пра пярэваратняў распавядаюць шматлікія былічкі і чарадзейныя казкі літаральна ўсіх народаў свету. І адсюль жа паходзіць сістэма параўнанняў у фальклоры і мастацкай літаратуры (чалавек як леў, дзяўчына – лебедзь белая і інш.), а ўжо ў наш час – адпаведная сімвалічная атрыбутыка ў адноўленых народных абрадах.

На Беларусі, ва Украіне, у Расіі надзвычай шырока былі распаўсюджаны былічкі пра ведзьмаў, якія ператвараліся ў свіней, сабак, катоў. Спосабы ператварэння ведзьмаў і ведзьмакоў у жывёл розныя, і адзін з іх – апрананне ў звярыныя шкуры і пер’і птушак. Успомнім аповед Герадота пра нашых продкаў – неўраў, што раз на год рабіліся ваўкамі: ясна, што ў аснове абраду – пераапрананне ў шкуры звяроў. А доўгія рукавы ў адзенні сярэднявечных славянак – гэта, на нашу думку, напамін пра крылы качак ці лебедзяў. Раней жрыцы ці простыя жанчыны падчас пэўных святаў, відаць, прычаплялі да рук птушыныя крылы. Чарадзейныя казкі перапоўнены вобразамі дзяўчат, што пераўвасабляліся ў качак ці лебедзяў. Магчыма, мужчыны – у абрадах якраз звяры, а жанчыны – птушкі. А калі вярнуцца да сабак, дык неабходна адзначыць, што не толькі ведзьмы прымалі сабачы воблік, але некаторыя і сабакі маглі ведзьмаў лёгка адчуваць. Такі сабака ў кожнай вёсцы надзвычай цаніўся – ва Украіне ён называўся ярчук [35, 266]. У папярэднім артыкуле мы пісалі і пра пеўняў-царыкаў з незвычайнымі ўласцівасцямі, што часам выводзіліся ў славянскіх вёсках. Значыць, не толькі сярод людзей зрэдку нараджаюцца выключныя асобы, а і сярод звяроў. Гэта, дарэчы, працуе на міф пра цывілізацыю мудрых змеяў, калі лічыць, што птушкі (а певень – птушка) паходзяць ад дыназаўраў.

Адносіны сабак з чалавекам не заўсёды складваліся проста. Кідаецца ў вочы надзвычай шырокая распаўсюджанасць у казках Еўропы сюжэта пра выгнанне гаспадарамі старога сабакі, якому дапамагае воўк. Тут сэнс празрысты, ён нагадвае пра роднасныя сувязі жывёл, і не мае значэння тое, што аповед у значнай ступені іранічны ў адносінах да ваўка: казка ў некаторых момантах настолькі істотна трансфармуе рэальнасць, што бывае вельмі цяжка дашукацца першапачатковага сэнсу.

У вядомай казцы "Мікіта Кажамяка" царэўна трапляе да цмока, але хатні сабачка носіць ад яе лісты бацькам. У большасці казак удзячны за сваё выратаванне сабака дапамагае герою. Казкі акцэнтуюць увагу на вернасці, высакароднасці сабак – уласна на тым, за што і любіць жывёліну чалавек.

Шырока фігуруе сабака ў павер'ях. І невыпадкова. Выключнае чуццё, уменне прадбачыць будучае, адчуваць сабакамі ліха прымушала чалавека ўважліва прыглядацца да іх паводзін. Так, практычна па ўсёй Еўропе людзі ведалі, што выццё сабакі прадракае смерць некага з яго гаспадароў. Рускія, пачуўшы скуголенне, пераварочвалі падушкі і гаварылі: "На сваю галаву" – тады сабака замаўкаў. Яшчэ адно назіранне: калі да вас прывязваецца чужы сабака – лічыце добрым знакам. Існуе цікавае павер'е і ў амерыканскіх вадзіцеляў вялікіх грузавых аўтамабіляў: калі перад капотам на асфальце раптам з'яўляецца сабака, гэта пэўны знак, што неабходна спыніцца і адпачыць – сабака папярэджвае пра стомленасць. Псіхалагічна ўсё гэта лёгка тлумачыцца, але заўважым, што ў візуальнай галюцынацыі ўзнікае менавіта сабака, хоць больш лагічным было б, напрыклад, з'яўленне каня як транспартнага, падобна машыне, сродку, ды і сярод продкаў сённяшніх амерыканцаў шмат каўбояў.

У сучасным гарадскім фальклоры распаўсюджваюцца міфы пра надзвычай разумных сабак, якія пераходзяць дарогу толькі на зялёнае святло светафораў, лёгка арыентуюцца ў метро, з усё большым вынаходніцтвам здабываюць сабе ежу і падобнае. Але і вучоныя сцвярджаюць, што сабака робіцца ўсё больш інтэлектуалам. Нядаўна нямецкія даследчыкі даказалі, што, як быццам, сабакі разумеюць чалавечую гаворку – не толькі інтантацыю, а сэнс слоў, і ледзь ужо не самі імкнуцца гаварыць. На жаль, іх галасавы апарат прыстасаваны для гэтага горш, чым у катоў і некаторых птушак (і ў тых і ў тых поспехі ў гэтым плане фенаменальныя, і пра іх часта піша прэса). Значыць, робяць выснову вучоныя, жывёлы разумнеюць і ўсё больш цягнуцца да чалавека.

Можна ставіцца да ўсяго гэтага з гумарам. Атрымоўваецца, што навука недалёка адышла ад міфалогіі. Але неабходна, дарэчы, адзначыць, што навука заўсёды цікавілася сабакам. Яшчэ геніяльны Арыстоцель падрабязна апісаў восем пародаў сабак. Вядомы старажытнагрэчаскі пісьменнік Ксенафонт напісаў спецыяльную працу пра паляванне з сабакамі; старажытнарымскі паэт Гарацый стварыў вершаваны трактат па догляду за сабакамі. Пра іх пісалі знакамітыя грэчаскія і рымскія аўтары: Герадот, Вергілій, Лукрэцый, Плутарх, Пліній, Страбон [31, 75].

У мастацкай літаратуры сабаку паказаў першы і самы знакаміты еўрапейскі паэт Гамер: у “Адысеі” менавіта сабака пазнае гаспадара, што толькі што вярнуўся на родную Ітаку пасля дваццацігадовай адсутнасці. Сусветныя пісьменнікі даследавалі ледзь не ўсе дзевяноста рыс сабакі, стварыўшы яго цэласны псіхалагічны партрэт. Вельмі часта сабака адыгрывае важную ролю ў сюжэце; дапамагае лепшаму раскрыццю вобразаў людзей, што ўдзельнічаюць у яго лёсе, ці нават спрыяе аналізу адносін у чалавечым грамадстве; нярэдка сабака – больш верны і высакародны, чым чалавек, – як дакор апошняму. Шмат якія творы шырока вядомыя нашаму чытачу: “Слон і Моська” Івана Крылова, “Муму” Івана Тургенева, “Леў і сабачка” Льва Талстога, “Каштанка” Антона Чэхава, “Сабака Баскервілей” Артура Конан-Дойля, “Трое ў адной лодцы, не лічачы сабакі” Джэрома Клапкі Джэрома, “Белы ікал” Джэка Лондана, “Белы пудзель” Аляксандра Купрына, “Сабачае сэрца” Міхаіла Булгакава, “Белы Бім, чорнае вуха” Гаўрыіла Траепольскага, “Львы” Івана Пташнікава.

Нядрэнныя поспехі і ў адлюстраванні сабакі ў кіно: “Лэсі”, “Да мяне, Мухтар!”, “Бетховен”, “101 далмацінец”, “Камісар Рэкс”, “Эркюль і Шэрлак супраць мафіі” і інш. Сабакі аказаліся яшчэ і артыстамі. Магчыма, сапраўды, авалодваючы ўсё большай колькасцю прафесій, жывёлы разумнеюць.

Сабака – адзін з папулярных персанажаў сусветнага выяўленчага мастацтва. Асабліва любілі адлюстроўваць сабаку-хорта асірыйцы і персы на рэльефах сваіх палацаў у старажытных сталіцах Ніневіі і Персепалі. Часцей за ўсё гэта сцэны палявання. Даволі частыя сюжэты з сабакамі ў мазаіках Антычнага Рыма, якія захаваліся ў асноўным як падлогі дамоў ці ўнутраных двароў. У мастацтве Візантыі і сярэднявечнай Еўропы сабака на рэльефах і фрэсках суправаджае Хрыста – Добрага Пастара. Не абыходзілі сабаку і мастакі Адраджэння, напрыклад, Пізанела. Асабліва неабходна назваць знакамітую карціну “Паляўнічыя на снезе” Пітэра

Брэйгеля-старэйшага. З XVIII стагоддзя ў арыстакратычных замках Еўропы пачынаюць з'яўляцца партрэты паляўнічых сабак. Развівалася і скульпутра. Так, царыца Кацярына II ставіла помнікі на магілах сваіх любімых сабачак. Скульптура сабакі ёсць і ў парку Радзівілаў у Нясвіжы. Увогуле помнікаў сабаку шмат, напрыклад, сенбернару на перавале Сен-Бернар – за выратаванне людзей, засыпаных снежнымі лавінамі; у 30-я гады акадэмік І. Паўлаў з вялікай цяжкасцю дамогся ад бальшавіцкіх уладаў помніка сабаку за яго ахвяраванне ў навуцы. У XX стагоддзі сабака – у вялікай ступені персанаж анімацыі. А выдатнейшы дацкі мастак, лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру, Херлуф Бідструп у серыі карыкатур паказаў візуальнае падабенства сабак да іх гаспадароў.

Характэрна, што індывідуалізаваныя вобразы сабак з'яўляюцца ў мастацтве XIX–XX стагоддзяў, калі абвастраецца ўвага да асобы – перш за ўсё, натуральна, асобы чалавека. Але ў мастацкай літаратуры з'яўляюцца персанажы, да таго маргінальныя, напрыклад, дзеці. І адначасова абуджаецца цікавасць да жывёл – таксама менавіта як да асоб, якія апісваюцца з дапамогай *псіхалагічнага аналізу*, а часам нават *плыні свядомасці*.

Да XIX стагоддзя анімалістыка была не менш, а, можа, і больш багатая, але вобразы жывёл паўставалі ў асноўным у сваім алегарычным і сімвалічным сэнсе, што меў вытокам міфалагічную свядомасць людзей. Выключнае багацце міфалагічных, казачных значэнняў, у тым ліку, сабакі, і з'явілася ў XIX–XX стагоддзях магутным інструментам псіхалагічных праекцый.

Сабака як звер, прыручаны першы і найбольш блізкі да чалавека, атрымаў за тысячагоддзі цэлыя пласты розных сэнсаў. Вышэй мы гаварылі ў асноўным пра сэнсы станоўчага плану ці, лепш сказаць, семантыку, звязаную з жыццём. Але сабака – жывёла і іншасвету.

Рускі археолаг М. Дзікаў на Камчатцы раскапаў магілу сабакі, які быў пахаваны прыкладна дзесяць тысяч год таму з выключнай пашанай як знакамітая асоба. Гэта гаворыць пра надзвычай моцны культ сабакі ў Азіі. Але ў большасці выпадкаў сабаку хавалі не асобна, а ўсё ж разам з чалавекам як вернага сябра, дарадчыка і ахоўніка. Верылі, што ён быў неабходны гаспадару на тым свеце.

У далейшым выспявае іншы сэнс: сабака, як і конь, *праводзіць* чалавека ў іншасвет (у народаў Сібіры, Кітая, Паўднёва-Усходняй Азіі). Нездарма ў Грэцыі ён блізкі да бога **Гермеса**, які займаўся тым самым: суправаджаў душы памерлых у Аід. Адначасова фарміруецца ўспрыняцце сабакі як *псіхапомпа*, інакш кажучы, як ахвяры менавіта

для мэт праводзін нябожчыка, каб забяспечыць апошняму камфорт у іншасвеце, або як “казла адпушчэння”, калі, “нагрузіўшы” яго грахамі, няшчаснага забівалі (так рабілі індусы, індейцы-ацтэкі). У персаў сабака суправаджаў пахавальную працэсію [63, 308].

У старажытных егіпцян бог памерлых **Анубіс** – з сабачай галавой. Ён не толькі ўдзельнічае ў муміфікацыі мерцвякоў, але і дапамагае Сонцу, што ноччу рухаецца пад зямлёю, трымацца вернага шляху. А значыць, дапамагае і чалавечай душы, бо душы праведнікаў перасоўваюцца разам з Сонцам – у яго чаўне, і гэта гарантыя іх несмяротнасці.

У некаторых народаў сабака – пасрэднік паміж светамі або вартаўнік іншасвету. Тады ён прымае пачварныя формы. Такі ў грэчаскай міфалогіі **Цэрбер** з трыма галовамі і змяіным хвастом. Цэрбера вывеў з Аіда **Геракл**, і ажыццявіць гэты подзвіг асілку аказалася цяжэй за ўсе іншыя. Тры галавы Цэрбера ўвасабляюць усёпаглынаючы час у трох яго аспектах – сапраўднае, мінулае, будучае. Нямецкія даследчыкі В. Баўэр і І. Дзюмоц лічаць, што трохгаловы сабака – істота, ва ўсім супрацьлеглая богу, уласна, апошні страх, які неабходна пераадолець пасвячонаму падчас містэрыі-ініцыяцыі. Геракл імкнецца, як і кожны чалавек, да несмяротнасці, і таму хоча пераадолець час. Бог апраметнай Аід дазволіў Гераклу вывесці Цэрбера толькі з той умовай, што асілак не будзе выкарыстоўваць сваю зброю. Інакш кажучы, герой перамагае час (і адначасова сваю ўласную падсвядомасць) за кошт уласных фізічных і маральных магчымасцей [6, 98]. Але заўважым, што Геракл адводзіць Цэрбера назад у Аід, а гэта азначае, што пераадоленне мяжы паміж свядомасцю і несвядомасцю, паміж нашым светам і іншасветам не знішчае гэтую граніцу ўвогуле – яна застаецца.

Ізраільскі даследчык-міфолаг А. Галан распавядае пра шырока распаўсюджанае і ў старажытных, і ў сучасных грэкаў павер’е, што дэманічны сабака з’ядае душы памерлых. Магчыма, міф узнік таму, што ў некаторых народаў сабакам давалі з’ядаць целы памерлых. Як толькі не выкарыстоўваюцца сабакі – у іх дзесяткі функцый: аказваецца, была і такая. Затое і прадстаўнікі іншасвету, перасякаючы мяжу ў накірунку нашага свету, набывалі воблік сабакі.

У шмат якіх народаў сабака, як мы гаварылі, лічыўся свяшчэннай жывёлай. У Старажытным Егіпце за яго забойства каралі смерцю. Цюркі, персы і кітайцы ў сваіх міфах паходзілі ад сабак. Але ізраільцяне і арабы-мусульмане лічылі сабаку істотай нячыстай. Часткова гэта захавалася і ў хрысціянстве: сабака не павінен

уваходзіць у храм; калі сабака пройдзе паміж жаніхом і нявестай, яны пасварацца.

Усё гэта дзіўна. Сабака – сімвал вернасці, прыязнасці да чалавека; ён першы, хто з жывёл пачаў жыць разам з чалавекам, здаўна дапамагае яму. І ў той жа час слова "сабака" лічыцца абразай. "Сабакам-Каінам" клічуць ворага ў рускіх былінах; "сабакам" называюць запарожцы турэцкага султана, ды і сёння лаянка засталася. Што гэта – уплыў іудаізму ды ісламу ці дзіўная трансфармацыя міфалагемы паводле прынцыпу: свяшчэннае – забароненае – небяспечнае – нячыстае? Праўда, у адрозненне ад кошкі, сабака, сапраўды, не зусім акуратны ў побыце. Але лёгка прывучаецца да парадку. Тым не менш – як вышэйшая ступень негатыву – у чорнага пудзеля нават пераўвасабляецца д'ябал – Мефістофель у "Фаусце" Ёгана Гётэ; у выглядзе чорнага сабакі пастаянна надакучваў сатана Марціну Лютару.

Амбівалентнае стаўленне чалавека да сабакі – цікавая, але цяжкая тэма. Думаецца, у аснове тут – якраз напластаванні сэнсаў: ад паходжання (усё ж воўк – жорсткі драпежнік) да багоў, якім сабака служыў: сярод іх і страшныя, напрыклад, сабака суправаджаў індыйскага бога смерці **Яму**. Не хочацца пра гэта думаць, але магчымая і зайздрасць чалавека да істоты, якая часта аказваецца больш высакароднай, чым ён сам. Чалавек – супярэчлівы, складаны, псіхалагічна няўстойлівы, і пераносіць свае рысы на лепшага сябра з жывёльнага свету, прыніжае яго, мяркуючы, што ўзвышае гэтым сябе.

Ёсць у нас і зусім "белетрыстычная" версія, але яна тлумачыць вельмі многае. Сабака, як, магчыма, і сам homo sapiens sapiens, – генетычна мадыфікаваны аб'ект чужых, іншапланетных, тэхналогій. Частцы ваўкоў была закладзена праграма – служыць чалавеку. Але сам чалавек, які ніколі не астаўляў надзеі наблізіцца да ўзроўню багоў (слова **Элахім**, што азначае стваральніка свету ў Бібліі, на самай справе перакладаецца не як "бог", а як "багі"), раўніва ставіцца да дзейнасці невядома адкуль прыляцеўшых чужынцаў. Хоць, магчыма, генетычнымі эксперыментамі займаліся вучоныя-жрацы зямной дапатопнай суперцывілізацыі, вядомай пад кодам Атлантыда. Як бы там ні было, чалавек адчувае ў сабаку нешта "не сваё". І ўсё ж любоў да яго перамагае.

Адвяргаючы традыцыйную, часта вельмі штучную, этымалогію, мы звяртаемся да роднай (менавіта роднай) мовы як да ісціны ў апошняй інстанцыі. Вядома, што кітайцы адрознівалі ў чалавеку дзве душы: жывёльную (падсвядомасць) і нябесна-

несмяротную. Першая, на нашу думку, у продкаў беларусаў, як і ў старажытных егіпцян, называлася “ка”, другая – “ба” (пра “ба” як назву душы ў славянаў пісаў акадэмік А. Весялоўскі). У слове “сабака” прыстаўка “са” – прэфікс злучэння. Са-ба-ка – істота, якая заключае ў сабе дзве моцна злучаныя душы, як і ў чалавека. Чаму ж менавіта так – больш празрыста, чым самога сябе, – назваў наш продак свайго жывёльнага сябра?

## СВІННЯ

1995 і 2007 гады праходзяць пад знакам зялёнай (сіняй) свінні паводле ўсходняга календара. Знак свінні асацыіраваўся з цёмным, або жаночым, пачаткам “інь”. Год свінні завяршаў сабою дванаццігадовы цыкл кітайскага жывёльнага календара. І ў іншых элементах усходняй культуры свінні належыла апошняе месца. Так, юрта манголаў, раздзеленая на дванаццаць сектараў, з’яўлялася як бы праекцыяй нябеснага задыяку. Кожная задыякальная жывёла вызначала гаспадарчае значэнне таго месца, з якім яго звязвала традыцыя. Галоўнае месца – прама насупраць увахода – належыла “мышы”: там знаходзіліся куфэркі з багаццем сям’і. Побач, бо юрта ж круглая, было месца “свінні”: у ім размяшчаліся гаспадарчыя рэчы, якімі карысталася гаспадыня дома. У прынцыпе гэта самае “нізкае” па сваёй семантыцы месца. Але негатыўна народы Усходняй Азіі да свінні ўсё ж не ставіліся. Вядома, што кітайцы пад Новы год прыносілі ў якасці ахвяры нябесным багам якраз парася, – лепшае, на іх думку, з усяго харчу [47, 236].

Іншае стаўленне да свінні ў народаў Заходняй (Пярэдняй) Азіі і часткова Афрыкі. Свіння – нячыстая жывёла ў Старажытным Егіпце, у культуры яўрэяў і арабаў. У навуцы трывала сцвердзілася думка, што гэта звязана са спякотай, паўднёвым кліматам, ва ўмовах якога цяжка захоўваць мяса (менавіта свініна не вяндліцца); праўда, у народаў Палінезіі і Новай Гвінеі, дзе клімат увогуле трапічны, свіння лічыцца свяшчэннай жывёлінай. Можна знайсці і іншае тлумачэнне негатыўнага стаўлення да жывёлы: свінні, вечна лежачы ці корпаючыся ў брудзе, распаўсюджвалі вірусы цяжкіх захворванняў, і мудрыя старажытнаегіпецкія жрацы заўважылі гэта здаўна. Яны вучылі народ з асцярогай ставіцца да жывёл, а еўрэі, што пакінулі Егіпет і перасяліліся ў Палесціну, захавалі асцярогу, якая з цягам часу стала рэлігійным дагматам не толькі іудаізму, але і ісламу.

Адмоўныя адносіны да свінні ўвогуле звязаны з рэлігійнымі ўяўленнямі яшчэ з глыбокай старажытнасці. Так, адзін з самых

вядомых этнолагаў свету Д.Д. Фрэзер (XIX–XX стст.) лічыў свінню першапачаткова свяшчэннай жывёлінай, на мяса якой было накладзена табу (забарона). Яго думка сцвердзілася ў навуцы. Вучоныя вырашылі, што ўяўленні пра “свяшчэннае” і “нячыстае” ў архаічным свеце не адрозніваліся. Палярызацыя паняццяў адбылася ўжо ў класавым грамадстве. Фрэзер піша, што страх перад свіннёй быў замешаны адначасова і на абагаўленні, пракланенні, і на глыбокай агідзе. З цягам часу адно з супярэчлівых пачуццяў перамагло [111, 444–445].

Міфалогія фінікійцаў і старажытных сірыйцаў таксама сведчыць пра яшчэ дваістае стаўленне да свінні (да дзіка). Згодна міфа, вяпрук сваімі ікаламі разарваў кару дрэва міры, з якога з’явіўся на свет маленькі бог **Адоніс**. Аднак паводле іншай версіі, якраз дзік, у якога ператварыўся бог **Марс**, забіў Адоніса – каханага магутнейшай багіні **Венеры**. Можна меркаваць, што першапачаткова і сам бог раслінасці Адоніс мог рабіцца свіннёю, потым, у час антычнасці, калі адбылася антрапамарфізацыя пантэона багоў, пра гэта забыліся, але нейкая сувязь Адоніса з вепруком засталася.

У антычнай Грэцыі свіней прыносілі ў ахвяру падчас самых важных для краіны і самых таямнічых Элеўсінскіх містэрый, прысвечаных багіні **Дэметры** і яе дачцэ **Персефоне**. Тут хаваецца глыбокі сэнс. Свіння з усіх свойскіх жывёл найбольш звязана з глебай, узаранай зямлёю, сваім лычом нават садзейнічае яе рыхленню, а значыць, ураджаю. Акрамя таго, нізкая пастава жывёлы, яе нібы прыцягненасць да зямлі, здольнасць шукаць падземныя грыбы ясна ўказваюць на сувязь з падзем’ем. Нагадаем, што Персефона – і царыца падзем’я, уладарка памерлых, і ў той жа час багіня веснавога абнаўлення прыроды. Маці Дэметра і дачка Персефона персаніфікуюць адзіны прыродны цыкл, жывёльным сімвалам якога была свіння. Яе сувязь з падзем’ем, якая мудрым грэкам здавалася абсалютна натуральнаю, пазней трансфармармавалася ў сувязь увогуле з інфернальным светам. Вось чаму ў Евангеллі распавядаецца пра бесаў, выгнаных Хрыстом з беснаватага чалавека і памешчаных менавіта ў статак свіней.

Пазнейшым паданнем можна лічыць і матыў ператварэння людзей у свіней за грахі. Ва Украіне шырока бытавала меркаванне, што Хрыстос ператвараў у свіней тых нетактоўных людзей, якія вышаралі выпрабоўваць сілу Яго як Бога. У вёсцы Церуха Гомельскага раёна да сёння жыве ўспамін пра вядзьмарку, якая ўмела пераўвасабляцца ў вялікую чорную свінню і ў такім выглядзе палохала і нават карала прадстаўнікоў новай бальшавісцкай улады.

Характэрна, што падчас фашысцкай акупацыі Гомельшчыны яе баяліся і немцы – прыносілі ёй падарункі, каб задобрыць. Пазней яна знікла невядома куды – ніхто не памятае яе смерці.

Так мы нарэшце наблізіліся да вераванняў і нашых продкаў. Яны жылі не ў ізаляваным свеце: як ні дзіўна, кантакты паміж плямёнамі былі нават больш актыўныя, чым паміж сучаснымі народамі. Вось чаму многае, што тычыцца іншых еўрапейскіх (і нават азіяцкіх) этнасаў, мае адносіны і да нашага, аднаго з самых старажытных сярод індаеўрапейцаў.

Але людзі ў Еўропе жылі задоўга да з'яўлення тут індаеўрапейцаў. Найбольш старажытныя малюнкі на Зямлі зафіксаваны ў Пірынеях – на тэрыторыі Іспаніі ды Францыі: іх узрост прыкладна 40 тысяч гадоў, увасабляюць яны выключна жывёл. Свіння (дзік) у гэтых палеалітычных помніках жывапісу не сустракаецца, тут распаўсюджана адлюстраванне зуброў, коней і аленяў – на той час, безумоўна, выключна дзікіх жывёл. Паўстае цікавае пытанне, якое, дарэчы, яшчэ не ставілася ў навуковай літаратуры: чаму сярод усіх жывёл, на якіх першабытны чалавек паляваў, няма дзіка? Ці не таму, што ўжо тады гэта была сакральная істота, якую не елі? Значыць, менавіта дзік быў татэмам-першапродкам плямёнаў Заходняй Еўропы, бо толькі значна пазней татэмную жывёлу пачалі ўжываць у якасці ежы, як бы раствараючы яе субстанцыю ў сваёй і гэтым падкрэсліваючы сувязь з ёю. Дух продка, паўтараем, прынімаў зааморфную форму.

Пацвярджэннем татэмістычнасці дзіка з даўніх часоў з'яўляецца яго ўшанаванне ў кельтаў – продкаў сучасных ірландцаў, шатландцаў, часткова германцаў, іспанцаў, французаў, палякаў і, як мяркуюць некаторыя беларускія даследчыкі, – і беларусаў. Вышэйшага ўзлёту культура кельтаў дасягнула ў эпоху Антычнасці – паралельна (але самастойна) з культурай грэкаў і рымлян. Дзік у кельтаў быў найлепшым аб'ектам палявання, а таксама ежай багоў і герояў. У Францыі знойдзены тры скульптуры дзікоў з бронзы, зробленых у І ст. н. э. Яны лічацца лепшым узорам гальскага анімалістычнага мастацтва ў вобласці скульптуры [91, 8].

У міфах большасці еўрапейскіх народаў дзік – сімвал ваеннай магутнасці і ўрадлівасці. У старажытным германскім эпасе маецца апісанне баявога знаку – галавы дзіка. І да сёння такія галовы – чучалы ўпрыгожваюць сцены ў пакоях сярэднявечных палацаў. У германцаў захавалася таксама і паданне пра паходжанне племені ад двух братоў, аднаго ў якіх называлі **Дзік**. У тэкстах старажытнай Хецкай дзяржавы (у II тыс. да н. э. на тэрыторыі сучаснай Турцыі)

дзік або свіння згадваецца як адна з “жывёлін бога”. Хеты, дарэчы, былі таксама індаеўрапейцамі.

У міфалогіі балтыйскіх славянаў агромністы дзік з белымі ікаламі паказваўся з мора кожны раз, калі ўзнікала нейкая пагроза для свяшчэннага горада Рэтра [5, I, 170]. У гэтым горадзе размяшчаўся вялікі храм аднаго з багоў Сварожычаў – **Агню**, і велізарны дзік ахоўваў яго.

У беларускай казцы пра свінку – залатую шчацінку (існуе чатыры варыянты гэтай казкі) герой здабывае чароўную істоту разам з дванаццаццю парасятамі. Можа быць, чароўная свінка – сімвал гадавога Сонца, а парасяты – дванаццаць месяцаў? У такім разе свіння тут мае, безумоўна, салярны-станоўчы сэнс, хоць у кельтаў дзік быў прысвечаны Поўні (Поўня звязвалася з падзем’ем) з-за сваіх ікалаў, якія па форме нагадвалі месяц. Але ў славянаў, у прыватнасці, у беларусаў у вераваннях панавала сонечная семантыка, бо беларусы – найбольш чыстыя арыйцы [103, 12], а ў арыйцаў пераважаў культ Сонца і Агню.

Усё ж у індаеўрапейскіх народаў Еўропы стаўленне да свінні дваістае: адчуваецца ўплыў хрысціянства, хоць захавалася і моцная язычніцкая аснова.

Ва ўсіх земляробчых народаў апошні сноп з каласоў жыта увасабляў бога **Вялеса** і адначасова духа поля, які садзейнічае ўраджаю і з’яўляецца сімвалам урадлівасці. Бог Вялес вядомы ўсім індаеўрапейцам і, магчыма, угора-фінам: нават правінцыя Уэльс у Брытаніі – напамін пра яго. Як дух поля ён ў розных народаў пасяляўся ў розныя істоты, часцей жывёл: сабак, ваўкоў, зайцоў, кароў, быкоў, коней, казлоў і – свіней. Эстонцы называюць апошні сноп **Аржаным вепруком**. У Германіі абавязкам чалавека, які апошнім закончыў умалот зерня, было несці чучала свінні.

Дух хлеба ў выглядзе свінні бачыўся і падчас севу. Так, у Латвіі ў XIX стагоддзі сейбіты вясною частаваліся на полі свінінай, частку якой (звычайна хвост) потым зарывалі ў зямлю, што садзейнічала яе ўрадлівасці. Такім чынам, адбываецца цікавая трансфармацыя: у час севу дух поля – дух урадлівасці – яшчэ бачыцца ў вобліку канкрэтнай жывёліны, у жніво яна ж – гэтая жывёліна – ужо ўвасабляе самога бога. Таксама разумелі свінню і на “шчадрэц” падчас Калядаў. Стравы са свініны, а часта непасрэдна галава свінні як галоўнае ўпрыгожанне стала, – безумоўна, сімвал уласна духа ўраджаю, а значыць, багацця.

Сучасным людзям бывае цяжка зразумець логіку, напрамак мыслення продкаў. Між тым, апірышчам іх разумовых пабудоў з’яўляўся універсальны прынцып *кола* (адсюль Каляды) – кола не

толькі гадавога цыклу, але і руху па крузе ўсіх стыхіяў і элементаў прыроды. Напрыклад, жыццёвая сіла памерлых, царом якіх быў **Вялес**, магла пераходзіць у жыта, тую ж свінню, а пасля трапляла ў жывых людзей. Такім чынам, жыццёвая субстанцыя Вялеса як персаніфікацыі ўсяго свету памерлых і кожнага канкрэтнага нябожчыка забяспечвала непарарыўны сельскагаспадарчы цыкл. А ён, у сваю чаргу, быў звязаны з цыклам, з кругам календарным. Таму і невыпадковыя асацыяцыі ў казках жывёл з нябеснымі свяцiламі.

Асабліва хацелася б падкрэсліць, што жыццёвую субстанцыю тут не варта разумець душою ў псіхалагічным сэнсе слова, яна не перадае пэўныя якасці чалавечай асобы. Гэта менавіта сіла жыцця, вечнага і непарарыўнага, – агульная і для раслін, і для жывёл, і для людзей, і для багоў.

Згаданая трансфармацыя, ланцужок пераўтварэнняў дапамагае зразумець яшчэ адну асаблівасць старыжытнага мыслення: бог **Вялес** у прынцыпе (як і кожны нябожчык) – прадстаўнік іншага свету, але яго інкарнацыі, у тым ліку жывёльныя, належылі адначасова і нашаму свету, і іншасвету. Расліна і жывёла злучалі іх, такія розныя, светы.

Вернемся да ежы, бо нездарма гавораць, што чалавек уласна ёсць тое, што ён спажывае ў ежу.

Рытуальны сэнс свініна набыла яшчэ ў глыбокай старажытнасці і распаўсюдзілася па ўсіх краінах Еўропы ажно да Партугаліі. На баляваннях феадалаў у эпоху Сярэднявечча падаваліся велізарныя смажаныя тушы дзікоў. Археолагі знаходзяць у кельцкіх паселішчах найбольш менавіта свіных костак. Не дзіва, што свініна з'яўляецца нацыянальнай ежай чэхаў, славакаў, аўстрыйцаў, германцаў, скандынаваў, балтаў, украінцаў і беларусаў. Украінцы і беларусы, на думку этнографаў, асабліва любяць сала. А вось для традыцыйнай культуры рускіх яно – ва ўсялякім разе, у XIX стагоддзі, калі рабіліся этнаграфічныя запісы, не характэрна. Гэта якраз сведчыць пра тое, што на тэрыторыі Расіі татэмных дзікоў і культу свінні не было [37, 140.]. Затое ў заходнееўрапейскіх народаў ён захаваўся. Магчыма, продкі кельтаў у Заходняй Еўропе якраз і прыручылі свінню, таму стаўленне да яе ў прынцыпе, асабліва ў скандынаваў, станоўчае, без процілеглых нюансаў, якія ўсё ж прысутнічаюць у славянаў: назваць чалавека "свіннёю" – лаянка. (Татэмамі ў славянаў былі іншыя істоты: зубр, лось, воўк, мядзведзь, бусел. Пагэтаму ў адносінах да свінні ўплыў хрысціянства ў нас быў мацнейшы). У Швецыі і Даніі на Новы год нават выпякаюць велізарны каравай з цеста ў выглядзе вепрука. Пякуць яго часта з

зерня апошняга снапа ўраджаю. Каравай стаіць на стале ўвесь час Калядаў. Частку яго захоўвалі да вясны, а тады прымешвалі да насення і давалі есці хатняй жывёле. Такім чынам, у еўрапейскіх народаў дух поля, дух ураджаю часта ўвасабляецца ў вобразе свінні як жывёлы, найбольш звязанай з зямлёю.

Сувязь раслін, жывёл і свету продкаў у абраднасці індаеўрапейцаў яшчэ раз ярка дэманструе непадзельнасць старажытнага мыслення, адзінства старадаўняга космасу, веліч сялянскай язычніцкай культуры.

Паэтызацыя святочнага стала з такой разнастайнасцю страў, якую ў наш час ужо цяжка і ўявіць, – адна з самых яскравых традыцый беларускай мастацкай літаратуры, бо, апяваючы мясную ежу, беларускія пісьменнікі славяць уласна жыццё, яго сілу, вялікія творчыя магчымасці прыроды, а таксама працу селяніна, красы і гонару, асновы нацыі. Беларускія пісьменнікі разумелі важнасць сялянскай культуры і ўмелі ўвасобіць нацыянальны космас у шмат якіх геніяльных радках. Напрыклад, у Якуба Коласа:

А на стале тым – рай дый годзе,
Што рэдка трапіцца ў народзе,
Ляжала шынка, як кадушка,
Румяна-белая пампушка,
Чырвона зверху, сакаўная,
Як бы агонь у ёй палае,
А ніз бялюткі, паркалёвы;
Кілбасы-скруткі, як падковы,
Між сцёган, сала і грудзінак
Красуе ўсмажаны падсвінак,
Чысцюткі, свежы і румяны,
Як бы паніч той падзіманы.

Такі стол – апафеоз сельскагаспадарчага года, песня, сімфонія сялянскай працы, сімвал багацця і шчасця – невыпадкова паэт тут ужывае слова “рай”. Безумоўна, гэта матэрыяльны рай, рай, звязаны з целам. Але ж чалавек – істота дваістая, цялесна-духоўная. Свіння як сімвал, як вобраз народнай культуры якраз і звязана з “ніжэйшай”, цялеснай прыродай чалавека.

Цікавым выяўленнем у творчасці дзеяння нацыянальных архетыпаў, вобразаў калектыўнага несвядомага з’яўляюцца выдатныя філасофскія апавяданні Барыса Сачанкі “Дзік-бадзяга” і Міхася Стральцова “Смаленне вепрука”.

Усе згаданыя творы сведчаць, што свіння ў культуры беларусаў – найбольш спрэчная свойская жывёліна. Стаўленне да яе вагаецца ў шырокіх межах.

У той жа час вучоныя лічаць свінню адным з самых разумных істот. Ва універсітэце штата Ілінойс ў ЗША даследчыкі навучылі свіней рэгуляваць тэмпературу ў свінарніку. Высветлілася, што яны добрыя навігатары. Свіння, якая аказваецца ў адкрытым моры, адчувае зямлю за дванаццаць кіламетраў, і гэтым карыстаюцца жыхары астравоў Акеаніі – бяруць свіней у далёкія падарожжы. Амерыканская свіння Прысціла выратавала дзесяцігадовага хлопчыка, які тануў. У чалавека са свінёй шмат агульнага – ныркі, печань, сэрца. Вось чаму ўвага да яе была заўсёды пільная, а вобраз яе шырока выкарыстоўваецца ў лексіцы, у сувенірах або як сімвал назапашвання багацця.

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

Літаратура:


1. Акимушкин И. Мир животных. – М., 1971.
2. Алмазов Б. Прощайте и здравствуйте, кони!.. – Л., 1978.
3. Арлоў У., Сагановіч Г. Дзесяць вякоў беларускай гісторыі. – Вільня, 1999.
4. Асов А. Мифы и легенды древних славян. – М., 1998.
5. Афанасьев А.Н. Поэтические воззрения славян на природу. В 3- тт. – М., 2002.
6. Бауэр В., Дюмоц Д., Головин С. Энциклопедия символов. – М., 1995.
7. Беларуская міфалогія. Энцыкл.слоўнік / С.Санько, Т.Валодзіна, У.Васілевіч і інш. – Мн., 2004.
8. Беларускія народныя казкі, - Мн., 1990.
9. Белицкий М. Забытый мир шумеров. – М., 1980.
10. Белов А.И. Антропологический детектив. – М., 2002.
11. Белякова Г.С. Славянская мифология. – М., 1995.
12. Бирлайн Д.Ф. Параллельная мифология. – М., 1997.
13. Богданович А. Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. – Гродна, 1895, Минск, 1995.
14. Бонгард-Левин Г.М. Древнеиндийская цивилизация. – М., 1980.
15. Братья Гримм. Полное собрание сказок. В 2-х тт. – М., 2003.
16. Бройтман С.Н. Историческая поэтика. – М., 2001.
17. Ветах В. Астрология и мифология. – Воронеж, 1994.
18. Волшебный жезл. Сказки народов Индонезии и Малайзии. – М., 1972.
19. Войцеховский А.И. Тайны Атлантиды. – М., 2000.
20. Генон Р. Символы священной науки. – М., 2002.
21. Геродот. История. В 9-ти кн. Кн.4. / Литературные памятники. – Л., 1972.
22. Гете И.В. Избранные произведения. В 2-х тт. Т.2. – М., 1985.
23. Глинка Г. Древняя религия славян // Кайсаров А.С., Глинка Г.А., Рыбаков Б.А. Мифы древних славян. Велесова книга. – Саратов, 1993.
24. Голан А. Миф и символ. – М., 1993.
25. Грейвс Р. Мифы Древней Греции. – М., 1992.
26. Гржимек Б., Гржимек М. Серенгети не должно умереть. Гржимек Б. Не щадя сил / Пер. с нем. / Авт. послесл. и коммент. А.Г.Банников. – М., 1986.

27. Грэймас А.Ю. Пра багоў і людзей. У пошуках этнічнай памяці / Пер. з літоўск. С.Шупы. – Мн., 2003.
28. Гудзь-Марков А.В. Пантеоны богов индоевропейцев и прапантеон. – М., 2001.
29. Гусева Н.Р. Многоликая Индия. – М., 1987.
30. Даниэль С.Б. Библейские сюжеты. – СПб., 1994.
31. Дмитриев Б. Соседи по планете. Домашние животные. – М., 1985.
32. Доманский Я.В. Скифы – кочевники, пастухи, воины // Курьер ЮНЕСКО. - № 1. – 1977.
33. Драгунов Г., Крашенинников В. Путешествие по Швейцарии. – М., 1987.
34. Жизнь животных. В 7 тт. – М., 1989.
35. Завадська В., Музиченко Я., Таланчук О., Шалак О. 100 найвідоміших образив украінскоі міфологіі. – Кіiў, 2002.
36. Зайкоўскі Э.М., Тычка Г.К. Старабеларуская кухня. – Мн., 2001.
37. Зеленин Д.К. Восточнославянская этнография. – М., 1991.
38. Земляробчы каляндар. – Мн., 1990.
39. Есенин С. Ключи Марии. // Есенин С. Собр.соч. в 6-ти тт. – Т.5. – М., 1979.
40. История религий. В 2-х тт. Т.1. – Спасо-Преображенский Валаамский монастырь, 1992.
41. Искусство Средних веков и Возрождения: Энциклопедия / Автор-составитель О.Б. Краснова. – М., 2001.
42. Искусство стран Востока / А.Н.Анисимов, Л.Н.Гумилев, А.Н.Желоховцев и др. – М., 1986.
43. Искусство Японии / Автор-составитель Н.А. Виноградова. – М., 1985.
44. Казкі беларускіх пісьменникаў. – Мн., 1999.
45. Калашников А. Атлас тайн и загадок. Кн.1. – М., 2000.
46. Календарные обычаи и обряды народов Восточной Азии. Новый год. – М., 1985.
47. Календарные обычаи и обряды народов Восточной Азии. Годовой цикл. – М., 1989.
48. Каниткар В.П., Оуэн К.У. Индуизм. – М., 1999.
49. Караткевіч У. Дзікае паляванне караля Стаха. Аповесць. Чорны замак Альшанскі. Раман. – Мн., 2000.
50. Кардини А. Происхождение рыцарства. – М., 1989.
51. Карпец В.А. Русь, которая правила міром, или Русь Мировеева. – М., 2005.

52. Кейпер Ф.Б.Я. Труды по ведийской мифологии. – М., 1986.
53. Керлот Х.Э. Словарь символов. – М., 1994.
54. Китай: Земля Небесного дракона / Под общ. ред. Э.Л. Шонесси. – М., 2002.
55. Китайские сказки. – М., 1991.
56. Козы и овцы: Разведение. Выращивание. Использование продукции: Справочное издание. – Ростов н/Д. – 2000.
57. Колас Якуб. Збор твораў у 14 тамах. Т.4. – Мн., 1972-1978.
58. Косарев А. Философия мифа. – М., 2000.
59. Коэльо П. Алхимик. – Киев, 2002.
60. Крапп Э. Астрономия. Легенды и предания. – М., 1999.
61. Кривченко В.И. Помпеи. Геркуланум. Стабии. – М., 1981.
62. Крук И.И. Восточнославянские сказки о животных. – Мн., 1989.
63. Купер Д. Энциклопедия символов. – М., 1994.
64. Кэ Юань. Мифы Древнего Китая. – М., 1987.
65. Лихачева В. Искусство Византии IV–XV веков. – Л., 1986.
66. Лозка А. Беларускі народны каляндар. – Мн., 1993.
67. Лозовская Е. Макс Планк, сплайсинг и футбол // Наука и жизнь. – № 10. – 2006. – С.2-14.
68. Луконин В.Г. Искусство Древнего Ирана. – М., 1977.
69. Маккуин Д.Г. Хетты и их современники в Малой Азии. – М., 1983.
70. Мамуна Н.В. Зодиак мистерий. – М., 1998.
71. Мифы народов мира. В 2-х тт. – Т.1. – М., 1980. Т.2. – М., 1982.
72. Мозолевский Б.Н. Стремление передать философскую картину мира // Курьер ЮНЕСКО. – № 1. – 1977.
73. Монте П. Искусство Рамсесов. – М., 1989.
74. Музей Метрополитен. Нью-Йорк. – М., 1983.
75. Народные русские сказки А.Н.Афанасьева. В 3-х тт. – М., 1984.
76. Насовіч І.І. Слоўнік беларускай мовы. – Мн., 1993.
77. Немировский А.И. Этруски. От мифа к истории. – М., 1983.
78. Ненадавец А.М. Святло таямнічага вогнішча. – Мн., 1993.
79. Овчинников В.В. Сакура и дуб: Впечатления и размышления о японцах и англичанах. – Мн., 1987.
80. О'Нейл Р. Люди и монстры. Необычные животные и необыкновенные люди. – Нижний Новгород, 1995.
81. Осокина Л. Биокосмонавты // Чудеса и приключения. – № 3. – 2003.
82. Панчатантра. – М., 1972.

83. Песков В. Радости на птичьих крыльях // Комсомольская правда – № 21. – 4.02.2000.
84. Погребенные царства Китая / Пер. с англ. А.Чекмарева, – М., 1998.
85. Польские народные сказки. – Л., 1980.
86. Пропп В.Я. Исторические корни волшебной сказки. – Л., 1986.
87. Прусс И.Е. Рафаэль. – М., 1983.
88. Птичка-пуночка. Чукотские и эскимосские народные сказки. – М., 1980.
89. Ренс М. Тесей. – М., 1991.
90. Речкин М.Н. Сибирь спасет человечество?! Том 1. Восхождение к истине. – М., 2005.
91. Росс Э. Кто же были кельты? // Курьер ЮНЕСКО. – № 1. – 1976.
92. Русский народ. Его обычаи, обряды, предания, суеверия и поэзия. – М., 1880, 1992.
93. Руставелі Ш. Візяць у тыгравай скуры. Пераклад на беларускую мову М.Хведаровіча, А.Звонака. – Мн., 1966.
94. Рыбаков Б.А. Язычество древних славян. – М., 1981.
95. Рыбаков Б.А. Язычество Древней Руси. – М., 1987.
96. Самозванцев А.В. Мифология Востока. – М., 2000.
97. Сандулов Ю. Дьявол. Исторический и культурный феномен. – СПб., 1997.
98. Семира и Ветах В. Астрология и мифология. – Воронеж, 1994.
99. Ситчин З. Лестница в Небеса. – М., 1998.
100. Славянские древности. Этнолингвистический словарь. В 5 тт. – М., 1995–2005.
101. Славянская мифология. Энциклопедический словарь. – М., 1995.
102. Соколова З.П. Животные в религиях. – СПб., 1998.
103. Суднік С. Падарожжа ў краіну арыяў // ЛіМ. – № 35-36, 2, 9 верасня 1994 г.
104. Сысоев В. Золотая Ригма. – М., 1983.
105. Так кто же нам родственник? // Чудеса и приключения. – № 12. – 2002.
106. Топоров В.Н. Боги // Славянские древности. Этнолингвистический словарь. В 5 тт. Т.1. – М., 1995.
107. Трассидер Д.Словарь символов. – М., 1999.
108. Тяжелов В.Н. Искусство средних веков в Западной и Центральной Европе. – М., 1981.

109. Успенский М.Г. Там, где нас нет. // Успенский М.Г. Приключения Жихаря: фантаст.романы. – М., 2003.
110. Фасмер М. Этимологический словарь русского языка.Т.2. – М., 1964–1970.
111. Фрезер Дж.Дж. Золотая ветвь. – М., 1981.
112. Чарадзейныя казкі. У 2-х ч. Ч.1. – Мн., 1973. Ч.II. – Мн., 1978.
113. Черных П.Я. Историка-этимологический словарь современного русского языка. В 2 тт. – М., 1999.
114. Царев И. Загадка Арзамасского монстра // Тайная власть. – № 7. – 1997. – С.4.
115. Цыркун К. Над нами – неба // Роднае слова. – № 9. – 2002.
116. Фицжеральд С.П. Китай. Краткая история культуры. – СПб., 1998.
117. Хмелева А.В. Родной дом. Культура резного украшения современного дома в Гомельской области. – Гомель, 1999.
118. Шалаби А. Весь Египет. – Флоренция, 1995.
119. Шамак А.А. Міфалогія Старажытнай Беларусі. – Мн., 2004.
120. Шамякіна С.В. Verbo tenus (у пpасторы слова): Філалагічныя эцюды. – Мн.: РІВШ БДУ, 2003.
121. Шапарова Н.С. Краткая энциклопедия славянской мифологии: около 1000 статей. – М., 2001.
122. Элиадэ М. Священное и мирское. – М., 1994.
123. Элиадэ М. Миф о воссоединении. // Элиадэ М. Азиатская алхимия. – М., 1998.
124. Энциклопедический словарь символов / Авт.-составитель Н.А.Истомина. – М., 2003.
125. Энциклопедия символизма: Живопись, графика и скульптура. Литература. Музыка / Кассу Ж., Брюнель П., Кладон Ф. и др. – М., 1998.
126. Энциклопедия суеверий / Сост. Э. Рэдфорд. – М., 2001.
127. Энцыклапедыя прыроды Беларусі. У 5 тт. Т.3. – Мн., 1984, т.4. – 1989.
128. Энцыклапедыя сельскага гаспадара. – Мн., 1989.

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

Навукова-папулярнае выданне

KAMUNIKAT.org